ЗЬМЕСТ

Стар

М. Багун. Рэволюцыі (*верш*) 5
С. Ліхадзіеўскі. Рокаты дальняй прыстані (*верш*) 9
Барыс Мікуліч. Прарыў (*апавяданьне*) 12
Ул. Хадыка. На варце пільнай і упартай 26
Е. Пфляўмбаўм. * * * (*верш*) 28
Т. Курбацкі. Часіны ўдарных будняў (*верш*) 31
Іл. Барашка. Новеля пра Сьцёпу 33
Арк. Куляшоў. Пагромы (*верш*) 38
Зьмітро Віталін. Пра сяброўства (*верш*) 42
Язэп Зазека. Бялюга (*апавяданьне*) 44
Юлі Таўбін. Таўрыда (*пачатак поэмы*) 50
Даўгапольскі. Начлег (*апавяданьне, пер. з яўр. мовы*) 54
Зьмітро Астапенка. Маё патэтычнае (*верш*) 62

Нарысы

Тарас Хадкевіч. Гэроі нашых дзён 67

Крытыка

Л. Бэндэ. Пра нядаўнае мінулае беларускае контрэволюцыі 73
С. Куніцкі. „Чужая зямля" 83
А. Кучар. Пра адну рэакцыйную аповесьць 96

Тэатр

Іл. Гурскі. Клясавая барацьба ў мастацтве (*аб беларускім тэатры*) 109

Бібліографія

Бар. Мікуліч. „А заўтра народ увесь паўстане" 116
Ул. Сядура. Пра „Вяршыні жаданьняў" Вал. Маракова 118
С. Куніцкі. В. Сташэўскі „Гаворыць Асінстан імя Сталіна" 122

Хроніка **124**

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

МАЛАДНЯК

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ І ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЧАСОПІСЬ—ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
ІЛ. БАРАШКІ, П. ГАЛАВАЧА, А. ЗВОНАКА, В. КАВАЛЯ, Я. ЛІМАНОЎСКАГА, А. МОРКАЎКІ, А. СЯНЬКЕВІЧА

ГОД ВЫДАНЬНЯ ДЗЕВЯТЫ

Библиотека ИИЗ. № 74 50

КНІЖКА ПЕРШАЯ

Центральный государственный архив литературы и искусства СССР Библиотека 1914-А

МЕНСК — БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА — 1931

Надрукавана ў друкарні
„ПАЛЕСДРУК“, Гомель.
Зак. № 433—4000 экз.
Галоўлітбел № 191.

Ураяк - пс 10 к
18р-80к

Міхась Багун

Рэволюцыі

Павеяла
смуродам
разрэзаных скул,
і я
думку праверыць
хачу—
на пульс
рэспублікі
кладу руку,
каб сэрца удары
чуць.
Пад пальцамі
мускул
дрыжыць струной,
напружаны,
як струна—
гэта мы
ў рэспубліцы
пайшлі вайной
на прарывы
у кожным
з нас.
І ўпартасьць
традыцый
ляціць на бок,
і кіпіць,
як зарыва,
бой
і адзіная думка:
пераможам,
або
мы нявартыя
быць сабой!

Калі сэрца
слабее
у грымотным гудзе,
калі вочы
гасіць
крыло воранава,—
пальцамі
глыбока
прарві грудзі
і там
знайдзі
чалавечка чорнага.
Чалавечак чорны
сонца
баіцца,
чалавечак чорны
сутуліць
плечы,
чалавечак чорны
— гэта той
гіцель,
што ловіць пятлёю
душу чалавечую.
Вазьмі яго
і зацісьні
ў пальцах,
зубамі
раструшчы
крык ягоны
і, калі чалавечак
мёртвым
паваліцца,
цьвёрда
труп
прыдушы нагою.
Бо калі рану
пакінуць
нялечанай
і ў шэлест
шэптаў
наставіць вушы—

чалавечак стане
чорнай
чалавечынай
і хваткаю
мёртвай
цябе задушыць.

Рэволюцыі славу
у песьні
выліць,
славу—
слова за словам—
гнаць:
калісь
рэволюцыю
мы зрабілі,
цяпер
рэволюцыя
робіць нас!
Прэч чалавечкаў!
Давай
людзей нам,
байцоў упартых
рашучай
квадры,
магутных,
вытрыманых
і надзейных:
— рабочыя кадры.
Мацнець пульсацыі
ў чаканьні
падзей
забароніць
сягоньня
хто?
І ў целе
рэспублікі
кроў гудзе,
як у целе
дынама
— ток.

Упартаю працай
мы раны
загоім,
вораг
даўно
сквіліць
пад нагою.
Здаровыя людзі!
Здаровыя дні!
Здароваю
песьняю
сэрца зьвініць!
Запалам
і радасьцю
сьвецяцца вочы:
я —
рэволюцыі
чорнарабочы!

Сьнежань, 1930 г. Менск.

64 р 25 р 60 к

С. Ліхадзіеўскі

Рокаты дальняй прыстані

I

У віхрамётнасьць завей
варту лінкор наш выставіў.
Рокатам дальняй прыстані
нашае сэрца жыве.

Рокатам звоняць у тон
гамы мажорна-блізкія.
Цераз імглу
і ліхую сутонь
вогнішчы зыркія бліскаюць.

Праз мітульгу начы
вабныя сьвецяць вырысы.
З хат няпрыкметных
на першы пачын
гмахі высокія выраслі.

Мускулы тысячных рук
сёньня—адзіным дойлідам!
А барацьба
і падножны хруст
сымболем лепшае долі нам!

Чуе істота мая:
каркаюць чорныя вораны.
Як і другія,
ня сьмею стаяць
і любавацца створаным.

У будаўнічых баёх
важкі, глыбокі зрух насьціг.
Сілу і сэрца
гартую сваё
працаю, ведамі, рупнасьцю.

Можа таму і ня дам
выкручаных

манэр вам.
Мой поэтычны
узорны майдан
поўняць сузвоны нэрваў.

Скажа худы малавер:
— Мала мастацтва чыстага!
Родзяць,
чаканяць,
натхняюць мой верш
рокаты
дальняй прыстані!

З поступу дзён барацьбы,
з нашай юнацкай шчырасьці,
моц маладая,
вырасьці,
сьцены прапон разьбі!

II

Віхрыся, творчы час!
Праходзь, мінай!
І прывітай
нас новымі гадамі!
Мае таварышы,
як многа ўспамінаць,
і колькі радасьці
пакінута ў аддалях!

Дзьве прыстані
гараць агнямі маякоў,
і хваль марскіх
чуцён разгульны рокат.
Адну прайшлі,
калі
маністамі лістоў
гарэза-восень
сыпала здалёку.

Заціх быў белы мур,
і калідор маўчаў...
І раптам хлынулі
напорыстай паводкай,
задорнасьцю хлапцоў,
вясёласьцю дзяўчат
шугаў адзін
магутна-стройны водклік.

Буяла моладасьць
пад пераліўны звон,
буяла моладасьць
у шумах аўдыторый.
Нас творчасьці чакаў
спрунжынены развой,
нас клікаў лес,
нас вабілі прасторы.

І нэрвы мы
наструньвалі свае...
О, колькі полымя
хаваюць годы тыя!
Кагорта нашая
вялікі гімн пяе
магутнасьці
і волі колектыву.

Прайшлі гады.
Агні на маякох
яшчэ ярчэй—
і вось другая прыстань...
Насеньне буйнае
зьбіраем у вякох
мы поўнай жменяю
з дасьціпна юным рымстам

Бяром,
узважваем,
абагаціцца чым...
А шырыня—
ня бачылі такой мы!
Краіна, слухай,
голас наш гучыць:
— Гатовы мы!
І твары ўсіх спакойны!

83р

Барыс Мікуліч

Прарыў

(*Апавяданьне*)

Ударнікам кардоннай ф-кі імя Сталіна прысьвячаю.

Тэлеграма прышла раньнем.

Уткес схапіў яе і пабег шукаць дырэктара. У суседнім пакоі яго ня было, толькі ляжаў на стале портфэль і дыміўся ў попельніцы не загашаны акурак. Гэта азначала, што Палякоў на фабрыцы.

Уткес прабег панадворкам, узьбіўся на кучу рызьзя, засопся і вылаяўся:

— Эх, які недагляд, які недагляд! Трэба будзе Палякову заўважыць. Кінуць акурак і...

Ён махнуў рукой, сутрымаў разважаньні, маляваўшыя ў выабражэньні жахлівыя і крыху неакрэсьленыя ўявы, голасна сказаў сам сабе:

— Эт, стары! Перцу на хвост! Да чаго дадумаўся толькі.

Палякоў ішоў насустрач размашыстай хадой, насьвістваў „Будзённага", усьміхаўся ўсімі ласкавымі зморшчынкамі шырокага свайго твару.

Добры дзень, Карл Дамянікавіч! Вы шукаеце мяне?

Той замахаў на яго рукамі.

— Вас, вас! Вось гляньце, тэлеграма гэрміновая. Прарыў. Няма сыравіны. Кастрычнік стаіць. Неабходна, пішуць, ужыць,—і ён ня скончыў, палез па кішэнях шукаць насоўкі.

Палякоў перачытваў тэлеграму. Яна была лёканічная, але за гэтай сьцісласьцю выразна чулася трывога, і чырвань падступіла да твару Палякова, зморшчынкі зьбегліся каля вачэй.

— Чччорт! Кастрычнік стаіць. Вы разумееце — стаіць Кастрычнік. 30 вагонаў у дзень паперы—і раптам фьюю!

Колькі часу яны стаялі пасярод двара, нярухомыя, адзін супроць другога.

Лязгацелі ваганеткі падачы. Зычнымі галасамі пераклікаліся ваганетчыкі.

— Саступі!

— Не замінай!

Няспынна пульсавалі гукі дынамо. Бухкалі катлы, дрыгатліва лапаталі дэфібрэры, і гэтае дрыгатаньне палоніла ўвесь корпус фабрыкі: вось так і здавалася дрыгаціць фабрычны корпус:

— Пойдам абмяркуем. Трэба нешта рабіць.

Яны пайшлі ў кантору. На ганку Палякова затрымаў рабочы. Ён кашлянуў і наважыўся быў нешта сказаць. Яго папярэдзіў Палякоў:

— Што, Максім, да мяне? Зойдам у кантору.

— Так, таварыш Палякоў, да вас. Вось наконт абутку. Разваль-ваюцца!

І ён разьвёў у зьдзіўленьні рукамі, нібы не разумеючы, з якой прычыны разваліліся боты.

— Палякоў зхмурнеў.

– Няма, браток, цяпер. Арцель абяцала гэтымі днямі выканаць наш заказ, трэба пачакаць крыху. Як будуць, дадзім.

— Тэ-тэ!.. Справа дрэнь, таварыш Палякоў. Хоць на работу не станавіся, цяжка бяз ботаў...

— Дзівак-чалавек! Дык табе-ж кажуць—няма. Палякоў свае ня здыме з ног,—умяшаўся ў гаворку Уткес.

Максім пайшоў з ганку, кульгаючы на правую нагу—пэўне застраміў дзе.

— Гатовы прагул,—каротка кінуў Палякоў і потым зьвярнуўся да Уткеса:—Трэба сёньня-ж паехаць у арцель. Душа з іх вон, а абутак павінен быць!

— Я абавязкова паеду, таварыш Палякоў. А цяпер мо' паклікаць Суража? Вырашыць-жа трэба.

— Ну, ну, жарце! Тэлеграма патрабуе неадкладных захадаў. А я пайду к сабе. Туды і прыходзьце.

І ўжо праз некалькі хвілін у абоймах цыгаркавага дыму ў габінэце Палякова абмяркоўвалі тэлеграму.

* * *

У часе прамовы Суража было ціха, толькі час-ад-часу беглі перашэпты, галовы нахіляліся адна да аднэй, гэта лётам рабіліся заўвагі аб словах сэкратара партколектыву

— Мы абавязкова павінны выканаць вытворчую праграму. Вы-ж добра разумееце, што астаноўка волата папяровай вытворчасьці, якім зьяўляецца Кастрычнік, агромністы прарыў. Гэты прарыў трэба ліквідаваць. Кастрычнік павінен атрымаць папяровую масу. Наша фабрыка абавязана перайсьці на выпрацоўку белай масы. Мы павялічым лічбы прамфінпляну, мы напружым усе сілы. Ведайце, таварышы, ударнікі павінны быць наперадзе ўдарнай працы фабрыкі. Мы абавязаны выканаць доўг перад усімі працоўнымі Саюзу, перад соцыялістычным будаўніцтвам. Гонар фабрыкі—гонар рабочых!

Ён скончыў. Хвілінай пенілася цішыня. Потым навала воплескаў з аграмадным імпэтам выйшла з берагоў, панеслася з руйнавальнай, няспыннай, шалёнай хуткасьцю...

— Дай слова!

Усе захвалявaліся. Загаманілі. Зарухаліся. Шчыльней абкружылі сцэну. Шарканьне ног і гамонка запанавалі ў пакоі. А гэты вэрхал пакрыўся прарэзьлівым звонам. І вэрхал сьціх. Толькі ракатаньне не ўхадзілася, і чулася яно праз увесь сход.

— Дзяркач мае слова.

Вось ён падышоў да стала, за якім сядзеў прэзыдыум сходу, згроб з галавы шапку і паклаў, не сьпяшаючыся, яе на стол. Чакаў, покуль сьцішацца. Гамонка пабархацела.

— Ну, яно ведама, хлопцы, у вір галавой ня нырнеш. Круці ня круці, а перайсьці на выпрацоўку гэтай самай масы трэба. Але вось ёсьць у мяне гваздочак маленечкі. Сураж потым хлопец ніштаваты, толькі гарачы крышку, не раўнуючы, як бычок малады...

Нехта зарагатаў. З дальняга кутку пачуліся падбадзёрваючыя словы. Зашыкалі, сьцішаючы бузацёраў.

Ня верна,—працягваў Дзяркач, марудна ніжучы слова за словам,—будзе, калі мы павялічым вытворчую програму. Мы, можна сказаць, на кардоне нарадзіліся, хрысьціліся на кардоне—рабіць кардон нам спадручней. Верна?

— Валі далей!

— Правільна, чаго пытаеш!

Дзяркач пераступіў з нагі на нагу.

— Дык вось я і кажу... Мы і так скокнем, мы і гэтак, а трыцаць пудоў кардону ня выпрацуеш лішніх. Верна ці не? Гэта таго самага кардону, які з маленства робім. А тутака нейкую масу, якую ніхто ў вочы ня бачыў, рабі! Яшчэ на дзьве тоны больш!..

І, паглядзеўшы на Суража, ён раптам скончыў візгляватым фальцэтам:

— Выкусі, харошы чалавек! А нячога ня зробіш... Усё!

Апошнія словы Дзеркача ўзьнялі гамонку. Адзін другога блытаючы, закрычалі некалькі чалавек адразу. Сураж тады ўзвысіўся над сталом простай і роўнай сваёй постацьцю, пастукаў алоўкам аб графін і крыкнуў:

— Досыць, хлопцы! Па чарзе кажы, калі што якое, а гармідарыць потым будзеш.

— Дай там сказаць!

— Чаму не даеш, замінаеш!

— Справу гаворым!

Палякоў камечыў згаслы акурак, запарошваючы попелам і табакай чырвоную сарвэтку. Сураж нахіліўся да яго і ціха сказаў:

— Бяры слова, іначай ня сьціхнуць.

Палякоў узьняўся. Рухам рукі патрабаваў цішыні. І замест звычайных слоў выказваньня, роўным голасам прачытаў з газэты:

— „Камунізм пачынаецца там, дзе зьяўляецца самаадданая, перамагаючая цяжкую працу турбота радавых рабочых аб павялічэньні продукцыйнасьці працы". Хто гэта сказаў, таварышы?

— Заля маўчала. І ў гэтай наступіўшай раптам цішыні нехта гукнуў.

— Ленін!

Гарачая стаяла цішыня. Яна гатова была кожнай хвілінай даць расьселіну, і тады панеслася-б няспынная навала ўздымных і бунтуючых, гарачых і хлёсткіх слоў, спрэчак, разважаньняў, пытаньняў, імкненьняў.

Русавы хлапец, карыстаючыся цішынёй, праціскаўся наперад да сцэны і папрасіў:

— Давай я скажу.

Сураж матануў галавой.

— Таварышы! Дзяркач нас на квінт хоча ўзяць, ня слухайце яго. Вы чулі словы нашага правадыра. А што мы робім? Мы працуем добра, старанна? Не! Той-жа Дзяркач спазьняецца на зьмену, манкіруе працай, не глядзіць машыны. Што ў нас мала рвачоў? Ёсьць, таварышы! Няма абутку, дык яны пушчаюць нямаведама якія весткі. Я ўчора чуў, як адзін казаў: „За гаспадаром лепш было. А цяпер што— ім мора па калена". І цяпер, калі перад нашай фабрыкай ставяць адказнае заданьне, калі Кастрычнік стаіць без папяровай масы, мы паслухаемся гэтых рвачоў і гультаёў? Ніколі!

— Верна!

— Ні-колі!

— Я прапаную, каб пусьціць фабрыку на тры зьмены. Рабочых з сушкі ўзяць. Масу-ж ня трэба сушыць?!

Дзяркач хаваўся за сьпінамі рабочых, кроплі поту выступілі на пачырванелым твары. Прыгінаючыся, каб не заўважылі яго, ён выйшаў на ганак. Там курыў чалавек. Ён яго не пазнаў і наважыўся быў прайсьці міма. Тады чалавек гукнуў яго.

— Мікіш, ты чаго ўцёк?

Гэта быў Максім.

— Эт, братка, галчат ня сунімеш. Пойдам да хаты...

* * *

Спачатку дзвынкнула цішыня. Потым над полем, якое парасло дробным жоўтым квецьцем, паплыў гуд. І пакуль даплыў гуд гудка да гораду, пагусьцеў ён, сьцішыўся адлегласьцю.

Ранак ішоў навыперадкі гуду. Трэснула эмаль неба, і пухкія аблокі распаўзьліся ў розныя бакі, а з сіняга калодзежу брызгануў струмень сонечных праменьняў, і—

загуло,
засваволіла,
запенілася

жоўтае квецьце, перапоўніла паветра пахам мядовым, і, здалося, жоўтазвонпай зрабілася далячынь.

Максім ідзе па дарозе, і яму прыемна адчуваць нагамі халаднаватую мяккасьць сьвежай зямлі. За плячо перакінута берасьцяная пляцёнка са снеданьнем. Шапка зьехала на вочы, і, мусіць, таму Максім не заўважае хараства ранішняга абуджэньня зямлі.

Максіма харапство ня тычыцца.

Ён ідзе паволі. Ёсьць у ягоным целе маленькія частачкі, якія яшчэ не пасьпелі канчаткова прачнуцца, якія ня зусім яшчэ адпачылі ад учорашняга вечара, якіх шмат у жыцьці Максіма, якія ўспамінаюцца з прыемным пазяханьнем, якія хочацца як найхутчэй паўтараць зноў.

Звоніць ранак.

...Вечар... Газоўка цурчыць... Знаёмыя дружацкія твары.. цені ад газоўкі...

— Яшчэ па чарцы!
— Каб поўна было...
— А як іначай, налівай!

...Разьбегліся кругі... Рукі намацалі плечы... Цёплыя... трапёткія... яны плывуць з рук... Плыве падлога... Рукі ловяць, лашчаць... Потым вуліца... водырная... Далёка недзе ліхтар.. Сьветлякі... паўзуць... паўзуць... нязьлічоным мноствам... Гарачыня перадаецца... сплятае...І зноў—сьветлякі, сьветлякі, сьветлякі...

— Аб чым, атаман, задумаўся?—Чуе раптам Максім кплівае запытаньне.

Насустрач сьмяшынкам—суворыя, на'т, злыя вочы. Паўла намагаецца сьцішыць крокі, трапіць у тахт Максімавай хады.

— Ідзем хутчэй, апозьнімся.

Максімава нага трапіла на войстры каменчык, разануў боль, а цела напоўнілася няпрыемнасьцю нейкаю.

— Дзе мне з табой угнацца! Няма чаго бегчы, другі гудзе.

Цяжка сутрымаць Паўлу спружыністы поступ свой. Міжволі ён апярэджвае Максіма і ўжо наперадзе яго кажа:

— Ну, цягніся сабе, старча-небарача! Глядзі—не апазьніся!

І ўжо замітусіўся пыл за Паўлам, а постаць зьнікла за збочаньнем дарогі.

— Цьфу! гучна плюнуў Максім.—Кепікі строіць, ударніцкая душа твая! гані, гані!

Ён ужо ня мог супакоіцца. Нібы й ня камень пад ногі трапіў, а нешта іншае—вайстрэйшае і большае войстра працяло цела, мозаг. Боль прайшоў, а няпрыемнасьць засталася.

І калі ён прыйшоў у контрольную будку, убачыў: толькі яго, Максімаў, нумар вісіць на дошцы.

Центральный архив литературы и ... Библиотека ... 1914-А

* * *

Са звонам з розных куткоў фабрыкі сышліся ў курылку.

Сонца расквечвала цэмантовую, падлогу, і яна была гарачай, а цыгаркавы дым заткаў паветра,—і здавалася, што дым гэты ад гарачай падлогі.

Хто разьмясьціўся на лаве, хто стаў ля сьценкі, хаваючыся ад гарачых сонечных праменьняў, што імклівілі няспыннай віраплыньню ў расчыненыя дзьверы.

— Потым ня цяжка рабіць гэтую самую масу,—заўважыў пажылы рабочы, прыкурваючы ў суседа.

— Ну, вядома. Адзін чорт—што кардон, што маса. Адно—гармідарылі залішне...

Праз курылку прайшоў Сураж. Выйшаў на сонца, выпрастаў у бакі рукі, адчуў саладкаватую млявасьць. На асмуглелым твары нарадзілася ўсьмешка. Хвіліну ён стаяў нярухомы. Потым адным махам сьцягнуў кашулю і бліснула цела масёнжам.

— З кім ты дужацца сабраўся?—жартаўліва гукнуў яму адзін з ваганетчыкаў, якія адпачывалі на бярвеньнях. Бярвеньні салодка пахлі смалой.

— З кім?—І вочы прыжмурыліся, і пругка калыхнуліся мускулы.—Хочаш, з табой возьмемся.

Гэты выклік пачулі ў курылцы і павысыпвалі з падбухторваючым рогатам, з падбухторваючым гоманам.

— Сып, Цярэш! Суражовы абцугі вышыбуць ахоту задзірацца!

Оё-ё-ё-ё-оо! Братцы, што я бачу? Цярэш біцца зьбіраецца. Фэршала, фэршала паклічце! Пульвізатар каб на выпадак быў...

— Ды каб бюлетэнь не забыў пад пахай...

— Эгэ-гэ-гэ! З комуністычнай партыяй бярэцца Цярэш!

Церах стаяў моўчкі, ашчэрваў вінавата неяк моцныя свае зубы і, здавалася, мераў вокам пругкую Суражову постаць. І тады, як зрабіў Сураж першы крок да Цераха, тады перад ім апынуўся Максім, шырокаплечы, камлюваты.

— Пачакай, таварыш сэкратар. Давай з табой памерымся. Наконт „ухвалілі-парашылі“ я ня скляпаю, а падужацца ахвотнік

74

І паволі пачаў здымаць браварку.

— Ну, давай! — крыху зьдзіўлены нечаканым разворам справы, прыняў Максімавы выклік Сураж.

Яны разышліся. Церах нейк асабліва весела і ўрачыста праклмандваў:

— Раз, два, тры! Сыходзьцеся...

Першым распачаў бароканьне Максім. Ён сьціснуў рукамі Суражову постаць неспадзеўкі, наважыўся прыняць яго да зямлі. Наважыўся і адчуў цьвёрдую цяжарынь Суражовага цела. А той вёртка падаўся ў бок. Кругым рухам разарваў ланцуг Максімавых рук, адбегся ад супраціўніка.

Навокал маўчалі.

Адным крокам апынуўся Сураж зноў ля Максіма, моцным націскам перагнуў ягонае цела назад і вось яны пакаціліся абодвы па траве.

— Ну, ну!

— Не падгадзь, Максім!

— Порткі трымай, бабы ідуць! выбухнула цішыня жартамі і сьмехам.

— Гляньце, браткі! Суражу канец надышоў! Ды ты гні яго, цісні.

— Аа-эх! Недацёпа!

І калі Максім ляжаў пабароканы, Церах нахіліўся над ім і кпліва заўважыў:

— Кругом шашнаццаць, грамадзянін!

Максім узьняўся, страсаючы з валасоў пыл. Яго абкружылі колцам, хлопалі па плячох, рагаталі, рабілі заўвагі. Як крыху прыціхлі, сказаў Сураж:

— А цяпер, таварышы, у сталоўку парушым. Сход важны меўся быць.

Усе накіраваліся за ім.

* * *

Пачуліся шпаркія крокі.

У пакой убёг чарнявы падлетак басанож, у запэцканай і мокрай кашулі.

— Вас, таварыш Палякоў, ваганетчыкі клікалі. Там здарылася нештачка...—і, выпаліўшы гэтыя словы засаб, ён нырнуў у дзьверы.

На хаду гасячы папяросу, пайшоў Палякоў да падачы размашыстай стрыманай хадой. Калі ён абагнуў корпус фабрыкі, што клінам падыходзіў да будынку канцэлярыі, убачыў каля перадачы купку людзей. А звыклае вуха ня ўчула прыглушанае скавытаньне ланцугоў: гэта прымусіла Палякова пасьпяшацца. Насустрач падбёг тэхкіраўнік Сташэня і, не чакаючы запытаньняў дырэктара, засьпяшаўся, праглынаючы словы:

— Няшчасьце! Гэтага даўно чакалі, я вам кажу даўно! Нельга, я вам кажу, нельга перагружаць перадачу. Я вам кажу..

І замоўк. Палякоў сам добра бачыў, у чым справа. Пляцформа перадачы (яе даўно трэба было рамантаваць, але гэта адкладалі на месяцы з большым лікам адпачынкаў) пад цяжарам выпадкова трапіўшых у адно некалькі ваганетак калыхнулася, а перагніўшае гадамі дрэва дало расьселіну, і пляцформа ледзь не абвалілася.

— Перагрузка, я вам кажу! Ударна працаваць добра на сьвежанькім! Тутака-ж вока патрэбна, я вам кажу,—бубнеў Сташэня.

— Ах!.. — ледзь ня вылаяўся Палякоў. — І трэба-ж было ў такі час!

Справа была відавочная: неабходна рамантаваць перадачу. Гэта можна зрабіць скора і спраўна: суткі напружанай працы, добрая брыгада.

— Кліч сюды спэцыялістых нашых. Няхай майструюць хутчэй. Прарыў не залатаем так скора.

Далі гудок. Устрывожаныя людзі зьбегліся да перадачы. Сураж узьлез на ваганетку. Натоўп сьціх.

— Кастрычнік стаіць. Наша фабрыка павінна даць масу. Напружым сілы і выканаем рамонт у дваццаць чатыры гадзіны. Старыя рабочыя, мы заклікаем вас дапамагчы ўдарнікам.

Голас выгукнуў:

— Майстры павінны стаць. Хто сякеру трымаць ня ўмее, ня зробіць.

— Правільна!—пачуліся ў адказ галасы з натоўпу.

І тады, расчышчаючы рукамі дарогу, падыйшоў да Палякова Максім.

— Мая брыгада згодна працаваць, калі нам дадуць тое, што мы захочам.

Натоўп скалынуўся.

— Якія вашы ўмовы?

Напружаней зрабілася цішыня. Максім усьміхнуўся таемна і хітра. Прыжмурыў вочы.

— Кожнаму па дзьве пары ботаў. Вось мой сказ.

Загаманілі, затурбаваліся, разьмятнуліся гульлівай паводкай галасы.

— Далоў яго!

— Рвацтвам займаецца!

— Шкурнік!

— А потым ён справу кажа, яму і карты ў рукі.

— Затой дух, драбната!

Гэтую цішыню сарваў энэргічным гэстам Сураж.

— Брыгада! Ваш дзесятнік рвач! Адпор яму!

Каля яго вырас Паўла. Расчырванелы, узбуджаны. Валасы лезьлі ў вочы, раскідаліся ветрам па твары.

— Ня трэба Максіма! Ударнікі самі возьмуцца. Хто на працу — да мяне.

І не пасьпеў Сураж што хаця сказаць, як ля Паўлы сабралася моладзь. Рашучым рыўком скінуў з сябе Палякоў традыцыйную сваю кожанку і зычна, на ўвесь голас крыкнуў:

— Гайда, хлопцы! Я пакажу, як рабіць.

Гудок гудзеў зьмену. На перадачы кіпела праца. Сур'ёзна, моўчкі выконвалі сваю справу ўдарнікі.

Максім пайшоў да ракі, распрануўся і кінуўся ў хвалі. Дрыготкая сьцюдзёнасьць ахапіла цела. Ён паплыў. Плыў доўга, змагаючыся з гонкай рачной плыньню. Несьвядома. Абы ня бачылі людзі. Зьсічыненў. Выбіўся на бераг і гэтак сядзеў голы, дрыжучы ўсім целам, аж пакуль не паказала на вечар. Тады ён адчуў голад, хутка апрануўся, наважыўся быў ісьці да хаты ды ўспамянуў, што там чакае яго жончын бацька, які прыехаў з вёскі. Апрыклелы. Таксама як і жонка.

Крута павярнуўся і пайшоў у другім напрамку.

* * *

Ён сядзіць на лаве, шырака паставіў ногі ў глыбокіх ботах, рукі зьвіслі паміж каленамі, рукі набраклі чырваньню. На гэтых руках—вялікіх, з кароткімі таўстымі пальцамі, праз чырвань выглядваюць буйныя жылы—сіняватыя, яны падобны на сетку галінак.

Ён кажа паволі, расьцягваючы словы, нібы прыслухоўваецца да ўласнае гаворкі, узважвае словы, і, узважыўшы, бачыць іх цаноўнасьць.

— Дачка потым мая ў выгодзе хадзіла, маё бацькава вока пільнавала яе. Што-ж ты, Максім, сабе думаеш? Я слова не павінен закінуць за дачку сваю родную, ці што? Ты пакінь сваё фанабэрства, яно верна—твая жонка, ты і гаспадар, але-ж бацькава сэрца шчыміць!..

Максім паклаў галаву на рукі і бязудзельна слухае разважаньні старога, толькі час-ад-часу востра рэжа боль ад усхліпваньняў жонкі, якая ляжыць ніцма на ложку, хаваючы свой твар у хустку.

— Дый што казаць, Максім! Калі што-якое, хай Стэфа зноў да мяне едзе, родную дачку заўсёды прыму... А здаваўся ты мне некалі здатным хлопцам, гаспадарскім чалавекам. Вось гэтак і думаў. Дачка з маладым мужам у горад хай едзе, няхай папрацуе муж там, а потым, потым—на гаспядарку... Я-ж старэю, сівею штогод.

І ўжо ня мог стрымацца Максім, ён крута матануў галавой, злокціў рукамі стол.

— Досыць, стары, сіратой прыкідацца! На гаспадарку я ніколі не пайду, і дачку тваю браў не для гэтага. Разумееш, не для гэтага!

Пайшоў вымяраць пакой блытанымі але моцнымі крокамі. Стэфа мацней заенчыла, а праз плач вырваліся словы, злыя і адчайныя разам з тым словы:

— Бадзяецца ён па піўнушках, прагульвае апошняе, татачка. А мяне тутака пакідае калупацца, ля печкі завінацца адну пакідае...— і потым села на ложку, зьвесіўшы на падлогу босыя ногі.—А я гэта сяджу, татачка, адна аднэй, ванцак ведае, што за дзень у галаве перабяру. Ноч прыдзе, зноў адна, чакаю, чакаю мужыка, а яго і няма. Ссохла, татачка, па жыцьці вясковым!.. Кляну сябе, матуляй-нябожчыцай—кляну за тую хвіліну, як яго да сябе падпусьціла. Ведала-б—за вярсту-б аббягала і рада.

Яна абхапіла рукамі калені і гэтак застыла, няпрыгожая і суровая ў сваім невялікім жаночым горы.

Максім супыніў крокі. Чырвань афарбавала скулы.

— Эх, ты, сука заезжая! а хто гэта з Петрыкам бадзяўся, як ня ты? Хто гэта хаваўся з ім па кустох, пытаюся? Кулаком пастукаў па сваёй грудзіне, і ад гэтага голас задрыжэў, нарадзіліся ў голасе праявы сардэчных надцінаў.—Праз цябе і піць стаў, жыцьцё нялюдзкае заліваць, праз цябе на фабрыцы ад мяне ўсе адступілі, як ад злодзея таго начнога! Гэта-ж толькі ўявіць трэба—праз боты, праз боты для твайго бацькі—сораму не пазбавіцца навек!—і ён схапіўся за галаву і ён зноў забегаў па пакоі.

Стэфа сядзела і глядзела ў цёмны покут, дзе вісеў стары запэцканы мухамі абраз сьвятога Юр'я. Глядзела, а Юр'я глядзеў на яе пустымі, мёртвымі сваімі вачыма, дракон гэтак і ляжаў пад капытамі ягонага каня, ляжаў дракон—рузна размаляваны фарбамі.

— Ва ўсіх, Максім, грахі ёсьць. А на гаспадарку ўзьбіцца табе патрэбна. Вось маё апошняе слова.

— Забірай сваю дачку, а ў вёску не паеду, шкурнікі!

Крыкнуў гэтак і сам схамянуўся гэтага слова—шкурнік!

— Ээх!—застагнаў ён, пабег у сенцы, а там прытуліўся да вушака, скрыгатаў ад бясьсільнай злосьці. І раптам, як праз сон учуў словы:

— Далоў яго!

— Рвацтвам займаецца!

— Шкурнік!

Ён замітусіўся на адным месцы, рваў рукамі валасы, было цяжка дыхаць, цесна было грудзям у картовай кашулі.

Максім выбег на двор.

Шэры дзень павольна канаў, накладаючы блёклыя адценьні на ўсё навакольнае. Толькі недзе далёка заходзіла сонца і ўскрай неба засьцілаўся цынамонавай посьцілкай.

За брамай ляжала пустэльная пясчаная вуліца, з маленькімі хацінкамі, што заўсёды стаяць так, заўсёды вартуюць цішыню гэтай вуліцы.

Ён мэханічна пакрочыў удоўж яе.

* * *

У фабкоме сядзелі людзі, дымілі цыгаркамі, голасна спрачаліся, абмяркоўвалі важныя пытаньні.

— Не, не! Я вельмі баюся, каб гэта не пагоршыла працы. Усё-ж брыгада Максіма ў цэлым не падтрымала яго, толькі старыя „спэцыялісты", як іх Палякоў кліча, не саступілі,—горача абараняў сваю пазыцыю старшыня фабкому.

Сураж не згаджаўся з ім.

— Такі момант нельга змазаць. Выпадак з Максімам дужа паказальны для таго, каб не разгарнуць навакол яго грамадзкай кампаніі. Ты-ж, Алёкса, павінен разумець, што гэта кампанія будзе мець аграмаднае выхаваўчае значэньне.

— Крый, чаго там! Сураж справу кажа. Трэба грамадзкі таварыскі суд наладзіць над Максімам—і ўсё тут!

Паўла працягнуў руку да конаўкі, наважыўся быў напіцца, але гэтак і застанавіўся з конаўкай у руках.

— Не забывай, хлопцы, таго, што вывучыць раней трэба справу. Карэньні знайсьці трэба, прычыну. У нас на фабрыцы ён ня мог зрабіцца рвачом, у нас жа ўсе, як у шкляным каптуры. Адкуль тутака ўплывам узяцца?

Палякоў падтрымаў яго:

— Правільна Паўла кажа, трэба ўважлівей падыйсьці да Максіма. Зьвера трэба адшукаць у ім, выдаліць гэтага зьвера. А ў аснове—ён наш хлопец.

Парашылі заняцца старанным вывучэньнем справы, вылучылі для гэтага некалькі чалавек.

— Потым, як зьбяром матар'ялы, суд усё-ж трэба арганізаваць.

— Ну, вядома, трэба!

На ганку разышліся ў розныя бакі. Паўла з Суражом накіраваліся на фабрыку. Іх абдаў знаёмы грукат фабрычнага корпусу. Як праходзілі каля папмашыны, адна з работніц усьміхнулася Паўлу ласкавай усьмешкай. Паўла неяк вінавата матануў галавой, павітаўся гэтак.

— Вось, Паўла, перабудуюць нашу фабрыку неўзабаве, што й не спазнаеш. Уяві сабе: усё мэханізавана будзе, усё будзе новае!

— Правільна кажаш, таварыш сэкратар, і будавалі некалі фабрыку, катухі дый толькі.

І момантам у іхных галовах паўсталі ўявы фабрыкі, перабудаванай, соцыялістычнай фабрыкі.

Цяпер:

Тупарылы балянс—поўмэтравыя чурбаны—павольна цягнецца на вагонетках перадачы ў вялізарныя ўмястоўныя катлы (гэтыя катлы старыя—навакол макрата заўсёды; пазіраюць рабочыя на стрэлку мономэтра—ваганьне яе з замiраючым сэрцам сочаць). Пачмурэўшыя

чурбаны прыгатаваліся сьмерць спаткаць: дэфібрэры перагрызуць, скрышаць іх у пясок, а адтуль паплывe гэтая маса перапранацца ў кардон у папкавыя машыны. А потым іх чакае сушка. Роўны глянцавіты кардон будзе адлюстроўваць у сабе сьвятло.

І вось будзе:

Па правадох пабяжыць электраэнэргія з раённай станцыі. Зьменіць аблічча фабрыкі.

Прысьпешыць тэмп. Вызваліць сотні, тысячы чалавечых рук. Гэтыя рукі скарыстаюць разумней, больш продукцыйней.

І вось будзе:

Савецкая ўлада плюс электрычнасьць—соцыялізм!

Першы перапыніў цішыню Паўла:

— Тады, як звыкнемся, сьмешна будзе ўспомніць пра такі вось выпадак, як Максімаў. Праўда?

— Ну, вядома!

* * *

Апошняя выпрацоўка кардону была ў сушцы. Ужо рабочых перавялі на трэцюю зьмену,—фабрыка дзейна змагалася за выкананьне вытворчай праграмы, складзенай паводле запатрабаваньняў волата папяровай вытворчасьці—„Кастрычніка".

Плылі ўжо вагоны цяжкай шэрай папяровай масы на бліжэйшую чыгуначную станцыю, а там сьпешна складаліся цягніковыя саставы—„Кастрычнік" атрымоўваў папяровую масу.

Фабрыка перажывала гарачыя дні. Варушылася рабочая сям'я. А высокі заеў суладнаму гімну працы надавалі ўдарныя брыгады.

Вагонетка—і ўдарнік!

Кацёл—і ўдарнік!

Дэфібрэр—і ўдарнік!

Папмашына—і ўдарнік!

Людзі і машыны—у няспыннай ўдарнай працы, бо:

На папяровым фронце прарыў!

Яшчэ не забыліся пра выпадак з Максімам. Наадварот, вылучаныя таварышы рыхтавалі матар'ял да грамадзкага суду, і яго—гэтага суда—з аграмаднай цікавасьцю чакалі ўсе рабочыя.

... Паквaля зьмяркалася. За палявой адлегласьцю гарэў горад безьліччу сьвятла. Неба пакрылася шэраватай лускай. Ледзь гаманілі рачныя хвалі. Паветра вільжэла.

Адышоў пякотны дзень. Зямля яшчэ гарэла дзённай гарачынёй. Паветра вільжэла, а зямля пульсавала салодкаю цяплынёю.

Быў ціхі ліпеньскі вечар.

Максім вышаў з сталоўкі. Там сабраліся людзі, стаяў гоман, было сьпякотна і тлумна. Ды здавалася Максіму, што староняцца

яго ўсе, што неяк пры гаворцы вочы хаваюць. Дужа баяўся Максім таго, каб не дазналіся таварышы з фабрыкі аб разрыве з жонкай — было нечага сорамна, было ніякавата.

Ён прайшоў да сушкі. Па ўсходцах узьняўся наверх, прыгінаючыся, каб не зачапіцца галавой аб кардон, які густым шэрагам замярэжыў памяшканьне, ён прабраўся ў дальні кут, абмацаў там лаву і расьцягнуўся на ёй.

Сьвятла ня было. Пэўне, дзяжурны рабочы пайшоў у сталоўку закурваць і пагасіў электрычнасьць Здалося Максіму, што паветра пахне гарэлым. Але спакойны рып вэнтылятара нарадзіў і спакойныя думкі.

„Пэўне, сёньня пары больш далі, каб кардон хутчэй высушыўся. Кардон мусіць і сьмярдзіць"...

Ён выпрастаўся на лаве і заснуў. Прачнуўся тады, як прышоў дзяжурны але той адпрасіўся пагуляць, і Максім зноў заснуў.

Беглі хвіліны.

Унізе охкалі машыны. Тупацелі людзі. Віўся гоман доўгай каруной. Гучней за ўсё чуліся галасы ваганетчыкаў.

Беглі хвіліны.

І раптам Максім усхапіўся. Нібы апантаны, падаўся наперад, але трапіў на кардон і паваліўся. Душыла грудзі. Нельга было дыхаць. Нылі вочы. Мурашкамі блукаў па целе жах.

Памяшканьне сушкі было напоўнена густым дымам.

Беглі хвіліны.

Максім ляжаў ніцам на падлозе. З шалёнай быстрынёй працаваў мозаг і татахкала сэрца.

Ён закрычаў ад бясьсільля, ад злосьці і болю. Цішыня была адказам. Ён папоўз удоўж сьцяны, падняўся на ногі, пачаў абмацваць рукой выключацель. І раптам шуганула полымя. Шуганула каля яго. На момант асьвяцілася сушка. Заняліся агнём пераплёты рам, парэнчы ўсходцаў.

Максім закружыў на адным месцы.

— Пажар!—Нялюдзкім голасам крыкнуў ён.

Пабег да ўсходцаў: сустрэла плойма агню і дыму.

Раптам разанула мозаг: можа прабрацца на пляцоўку. Ён, закрываючы рукамі твар, прабраўся да дзьвярэй, што выходзілі на пляцоўку—і сілы здрадзілі, упаў.

Беглі хвіліны.

Унізе мітусіўся натоўп. Вёдры плылі з рук у рукі. Прыстаўлялі драбіны.

— Даеш вады!

| Забірай, забірай вышэй!

А бацюхны! Фабрыку адратаваць каб.

Барвянцам бліскала ноч. Барвяныя адценьні ляжалі на людзкіх тварах.

— Братцы, Максім у сушцы! Я і запамятаваў!

Момант.

Гнецца драбіна пад пругкім целам Паўлы.

Вось ён дабраўся да пляцоўкі, якая вісіць над зямлёй (тут не калі стаяў матор вэнтылятара), вось ён моцным штуршком выламаў дзьверцы. Зьнік у іх. А праз некаторы час зьявіўся перад немым чаканьнем натоўпу з Максімавым нязграбным целам?

Дружна працавалі пажарнікі. Разгуляцца агню ня было як. Ён пачаў здаваць.

З апошнімі подыхамі агню—зьвярнулася да Максіма прытомнасьць.

— Як здарылася?

— Матор вэнтылятара заіскрыў. Ну а суш-жа!—растлумачыў хлопец.

— Мы думалі, што табе каюк! Паўла выратаваў...

Максім цяжка ўзьняўся з зямлі. Зрабіў некалькі крокаў да Паўлы, і—адвярнуўся ад яго, схаваў у руках твар.

— Што ты?

Паўла крануў за плячо.

— Ня судзіце, сам ведаю—злачынства зрабіў тады! Мне боты зусім непатрэбны былі... Гэта ўсё неяк сама-сабой атрымалася ..

— Аб чым казаць,—матануў рукой Сураж.—Добра, што зразумеў памылку.

Агонь канаў. А насустрэч яму там, далёка, пачынаўся новы пажар, магутнейшы і зырчэйшы, пачынаўся дзень.

Менск. 1930 г.

Уладзімер Хадыка

На варце пільнай і ўпартай

Калі гадзюка ў грудзі лезе,
Халодным джалам сэрца строміць,—
Жыццё муштрую я гарэзьней,
Шукаю ворага у доме.

Уроўнь з высокімі мурамі
Я мкну, абвесьнены, па бруку.
Находзяць згадкі, каб (часамі)
У зрок абурана пастукаць.

Настрой бруістых слоў наедзе —
Ў аздобе фарб, на цьвёрдай зычнай,
Каб на вытворчай быць бяседзе
Ударным нумарам музычным.

Увесь ўзнэрвованы да костак,
Я націскаю поўны клявіш...
І ноч, аблітая пакостам,
Крычыць, калі яе аблаеш.

Прыгладжаныя фарбай морды
Глядзяць, як лялькі з магазыну.
Таропкасьць гам кідаюць форды
І спэцыфічны пах бэнзыну.

Сьвідруе памяць дальні вобраз,
Сузмрок гурчыць забытым гімнам...
З гарою дум, з усьмешкай добрай,
Схіліўся горад тварам дымным.

Душу благое не ачэрніць!..
Цьвіце ўсход. Дужэе вецер.
Ля ўзьвей буйное ляжа зерне,
І ападзе ў міжзем'е сьмецьце.

Нікчэмных парасткаў атрускі
Сатлеюць ў скібах перагноем.
Ня здасьць зьнямогай дужы мускул,
І пульс няпэўным перабоем!

Ад зор да зор кіпіць работа,
Выходзіць сьвет з імглы збурэньняў.
І згубна мрэ, хто плача потай
Сьлязьмі забытых пакаленьняў.

Хто ўпоперак дарогі стане,
Брыдой ганебнай не скарыцца
Перад гэроікай змаганьня
І буйным ростам будаўніцтва.

Мяцежных бур ўзышла ўрачыстасьць,
Правы дыктуе чорнай сіле...
Сьмех злобны зжоўк асеньнім лістам.
Надзей павяла чорна быльле.

За ўзрыгамі ахвяр і жахаў
Глядзяцца (з далечы бяскрайнай)
Страі колён фабрычных гмахаў
І веліч грозная комбайнаў.

Шлях будучынь кладзецца цягам,
Абмыты потам кожны насып...
Нг здужыць збэшчаным бадзягам
Імклівы рух ўладарнай клясы!

Час дбае пільна і ўпарта.
З карэньнем вырве пырнік здрады...
І дзень і ноч трымаюць варту
Рэволюцыйныя брыгады.

І дзень і ноч жыцьцём напружным
Бурліць зямля ў адзіным русе.
Зарой цьвісьці—з іржы ланцужнай
Імкнуць згуртована і мужна
Шнуры Заходняй Беларусі.

Імкнуць краі паходным сьпевам
Дзікунства меж навекі зьнішчыць.
Згараць ў агні людзкога гневу
Музыкі воўчага ігрышча.

Пра іх шуршыць, зьвініць праклёнам
Дарожны жвір, крывёй прыбіты...
...Зьнікае змрок з крутых адхонаў,
Як цені здраднікаў вучоных,
Цівілізованых бандытаў.

Е. Пфляўмбаўм

Вартаўнічаму на мяжы Савецкага саюзу і мілітарыстскіх дзяржаў

* * *

Ільсьніцца
сонцам
бляск
ляза,
ты гнеўна коні
закілзаў,
стаіш пад стромаю
як грань,
і вочы зарывам
гараць!
У сьнежнай водцалі—
мяжа,
дзе чорным коньнікам—
кажан,
крумкач ўстрывожаных лясоў,
з рашучым голасам
у сойм!
Там змовай гідкаю
сусьвет
паставіў чорны свой
пікет,
і зоры плямамі
пайшлі
па акрываўленай
зямлі...
І зоры падаюць
штодня,
і ня спыніць...
і ня суняць...

Белай
пальчаткі
сыгнал

сёньня
рабочы
пазнаў,
Зноўку фашысці тэрор
брызгае
здрадай
затвор,
Польшча абрала ўрад,
сёньня прымае парад
сёньня яе габінэт
гойстрыць нанова штылет
Прагне
працоўнай
крыві
танкамі
скрышаны
жвір...
Сіл разьлюцелых хаўрус
'мкне на Савецкі саюз,
блізіцца бойні
пролёг
каля Румынскіх дарог.

Чуеш музыку
бур і габояў?
... Гэта варты
прымежнае зброя,
гэта коні баец закілзаў...
Ільсьніцца
сонцам
бляск
ляза!
... Там з гальлём
штось сэймуецца вецер
аб паўночным варожым сакрэце...
І вужакай
паўзе
цішыня...
і баец не ўтаймуе каня.
У трывозе старожкія трапы...
Вартаўнічы, варожасьць
абапал,

ты краіны спакой зьберажы
на засьнежанай
здрадай
мяжы!
... Гэта здрадная
зноў
цішыня.
Вартавы не ўтаймуе каня.

36 т-2
14 40

Т. Курбацкі

Часіны ўдарных будняў

Калі мяцежыць доля
Узьнясецца думак змах,
Гартуйце моц і волю—
Прайсьці славуты шлях.

Шліфуйце сэрцы гартам,
Паліце веры ўздым:
Прайсьці сталёвай вартай
Суровыя гады.

Таго, хто йдзе і блудзіць,
Сатрэ віхурны час,
Часіны ўдарных будняў
У паходы клічуць нас.

Сталецьцяў дым, нягоды
І дні глухой журбы
Паліць адважна,
Горда...
У горнах барацьбы.
Па ўсёй зямлі тырокай
На поле,
На станкі
Ідуць няспынным крокам
Ударнікаў палкі.

Да працы клічуць будні,
Заве цьвісьці вясна;
У раштаваньнях буйных
Мужае старана.

Ідзе... віхурыць доляй
Паўстаўшая зямля:
Гартуйма ж моц і волю—
Прайсьці вялікі шлях.

Часіны ўдарных годаў,
Завуць на шлях зары:

У бойках,
У паходах
Юнацтва раздарыць...

Бяз цяжкае трывогі
У сонечных шляхох
Нясьці цяжар эпохі
На маладых плячох.

Ня згасьне думак гордых
Віхорны наш уздым,
Мы аддадзім паходні
Адважным, маладым.
Па ўсёй зямлі шырокай
На поле,
На станкі
Ідуць няспынным крокам
Ударнікаў палкі.

1930 г. Колгас „Зьвязда", Кармянскі р-н.

Іл. Барашка

Новэля пра Сьцёпу

I.

Шырокая, прасторная вуліца з дзеравянымі тратуарамі, з каштанавымі прысадамі, з невялічкімі домікамі. З аднаго боку расьцягнуўся тэлефонны дрот на высокіх пачарнелых слупох, а з другога новая электрычная праводка, узьнятая над вуліцай ужо за апошнія гады Зімнімі, халоднымі вечарамі ўздоўж вуліцы гараць электрычныя ліхтарыкі, сваім тусклым сьвятлом асьвятляючы ваколіцу вялікага гораду. На вуліцы ўдзень даволі вялікае ажыўленьне — сьпяшаюцца рабочыя, служачыя, праяжджаюць падводы і аўтомобілі, развозячы продукты і тавары ў коопэрацыйныя крамы, што зьмянілі сабою дробны гандаль у бакалейных крамах і латкох сальнікаў, папяросьнікаў. Увечары і асабліва ўначы вуліца замірае, рух сьціхае з надыходам поцемкаў. Толькі, калі дзьме вецер, гудзе тэлефонны дрот, гудуць слупы.

На гэтай шырокай, прасторнай вуліцы жыве былы комісар грамадзянскай вайны Платон Гладкі. Домік комісара нічым не вызначаецца ад суседніх домікаў--у ім тры акны выходзяць на вуліцу і два—у невялічкі дворык з адгароджаным палісаднікам. На віскох Платона Гладкага серабрыцца сяды волас, ня гледзячы на яго малады гады. У Платона Гладкага ёсьць жонка і двое курчавых дзяцей. Уладзіку—дзесяць, а Ганцы--тры гады. Жонка ў Платона — другая А была ў Платона і першая жонка, жонка—таварыш, жонка — баец. Часта Платон успамінае сваю першую жонку. Сядзе, пачне думаць, успамінаць перажытае—тады бывай усё... Ён ня чуе ні плачу Ганкі, ні слоў сваёй другой жонкі. Толькі, калі тая пачне ўпрошваць яго—пазбудзься, перастань думаць, супакойся,—тады Платон скалане галавою, расчыніць шырэй вочы, уздыхне і, махнуўшы рукою, пачынае гутарку. Першыя гады другая жонка Платона не магла зьмірыцца з Платонам. Калі ён успамінаў пра слаўную Сьцёпу, яна злавалася і ўпікала Платона ў тым, што ён ня шчыры да яе, што яму ня трэба было ёй сьвету завязваць і яна-б выйшла замуж за другога, які-б больш паважаў яе і кахаў.

Але гады бяруць сваё. Сем пражытых год прызвычаілі яе да такіх адменнасьцяй Платона, да таго-ж ён іх ад другой жонкі не хаваў.

— Ды ты памяркуй сама,— гаварыў ёй часта Платон, — я быў малады чырвоны баец. Сьцёпа была маё першае каханьне, Сьцёпу я напаткаў у тыя галодныя, халодныя часы, калі сьмерць капала магілы маім найблізшым таварышом. Сьцёпа пайшла за мною. Яна ня раз ратавала мяне ад вернай сьмерці. Яна сваімі ласкамі лячыла мае ўзбуджаныя кулямі, гарматамі, калючым дротам, дрэннымі настроямі чырвонаармейцаў і атакамі ворага нэрвы... Я не магу пазбыцца яе. Да яе ў мяне каханьне сваясаблівае, адменнае і непахіснае...

І тады жонка змаўкала. Яна сваімі гутаркамі, ласкамі і адносінамі да Платона старалася замяніць яму яго першую, неадменную, сваясаблівую Сьцёпу.

— Ну і што-ж.. Кахаў Платон Сьцёпу... Сьцёпы цяпер няма, і я люблю Платона...

Але ў ласках другой жонкі многага не хапала для Платона. Яму ўсё-ж такі здавалася, што каб была тут Сьцёпа, ласкі былі-б куды больш палкія, гутаркі куды больш цікавыя і зразумелыя... Ну хоць бы ўзяць іхнія ўспаміны з мінулых дзён... Колькі-б яскравых, сакавітых, непаўторных момантаў маглі-б яны ўспомніць цяпер, калі гук грамадзянскай вайны адплыў у далячынь часу, і толькі памятныя эпізоды зьвяртаюць назад былыя часы...

Хто-ж такая Сьцёпа, першая жонка комісара Платона?..

II.

У прыфрантовай паласе, у адным з рабочых пасёлкаў напаткаў Платон Сьцёпу. Сьцёпа з малых год працавала на фабрыцы, сьпярша падручнай, а пасьля і кваліфікаванай работніцай. Спатканьне было нязвычайнае. Платон пакватэраваў у Сьцёпіных бацькоў — хатка іхняя знаходзілася на самай ваколіцы гораду і была штабам N-га палку. Сьцёпы ў хаце ня было. Бацькі скардзіліся маладому комісару Платону на тое, што ў іх была адна адзіная дачурка, дый тая пашла з дому. Паказваючы фотографіі Сьцёпы, старыя плакалі. А Платон чалавек такі, што любіў цікавіцца ўсім, што ёсьць на сьвеце. Служба комісарская навучыла яго гэтаму. У кожнай усьмешцы, у кожнай сьлязінцы можна распазнаць нутро людзей, якія абкружаюць цябе,— часта гаварыў сам сабе малады комісар, а адсюль і сумыя ўважлівыя, самыя зоркія адносіны да акаляючага.

Аднойчы Платон, у вольны ад работы час, спытаў бацьку Сьцёпы.

— А ўсё-ткі скажыце, дзе ваша Сьцёпа?

Стары бацька, машыніст фабрыкі, які адчуваў да Платона нейкую прывязнасьць за час яго прабываньня ў яго кватэры, шапнуў на вуха:

— Мобілізавана Сьцёпа фабрычнай ячэйкай. Ужо з месяц, як пакінула хату і няма яе...

І праз вечары тры, позьняй ноччу, у штаб N-га палку патруль даставіў перабежчыка, прамокшую да ніткі дзяўчыну. Быў абуджаны Платон. Даносы, выведкі аб перагрупоўцы сіл белых прымушалі ў той-жа час у тэрміновым парадку правесьці допыт перабежчыка.

Перад Платонам вырасла тады статная, прыгожая Сьцёпа. Яна расказала яму, што яна дачка машыніста Пархімовіча, гаспадара гэтай хаты, што яна на працягу месяца па заданьню павятовай партыйнай організацыі праводзіла падпольную работу па організацыі партызанскага руху ў окупаваных прымежных павегах, і што цяпер, выкрытая, высачаная шпікамі, ледзь-ледзь уцякла ад польскай заставы, пераплыўшы шырокую, спакойную серабрыста-люстраную рэчку.

У Платона гарэлі вочы моладасьцю. Абмокшая сукенка абліпала стан Сьцёпы, і па ёй выразна выплывалі скрытыя сукенкай рысы жаночага цела.

Колькі радасьці, колькі ўцехі, колькі плачу і сьлёз было выліта старэнькай Сьцёпавай матуляй, калі яна назаўтра прыгарнула да сябе сваю дачку:

— А мая-ж ты, дачурка, а мая-ж ты, галубка...

Бацька аднёсься да звароту Сьцёпы больш стрымана, ведаючы, на што п. сылаў ён разам са сваймі таварышамі з павяткому Сьцёпу...

І малады комісар Платон пакахаў Сьцёпу. Сьцёпа пакахала Платона неспадзявана. Праз некаторы час полк быў перакінуты на другі фронт, і Сьцёпа пакінула бацькоў. Яна апранула на сябе кожанку, павязала на руку павязку чырвонага крыжу — загадам, згодна асабістай заяве,—была залічана сястрой. Паплылі новыя дні, новыя фронты, новыя пакуты і ўцехі з слаўным мужам, статным комісарам Платонам.

На паўночным фронце, калі Платону было даручана прапаўзьці з батальёнам чырвонаармейцаў у тыл юдэніцкага войска, праз непраходнае балота Сьцёпа ішла побач...

Калі прыходзілася есьці па далёкіх мурманскіх палянах падсмажаную на вогнішчы каніну, Сьцёпа ела яе разам з Платонам, разам з байцамі...

Калі прыходзілася пасьля бою разам з санітарамі рабіць перавязкі параненым байцом, Сьцёпа, не палохаючыся варожай кулі, ішла з сваёй кашулкай і бінтавала ўзарваныя кулямі раны чырвонаармейцам...

Калі пасьля бою, ідучы ў рэзэрву, чырвонаармейцы пачыналі песьню, Сьцёпа запявала баявую чырвонаармейскую.

Калі Платон, змучаны, знэрваваны, ў бясьсільлі валіўся з ног, зьяўлялася Сьцёпа, і яе ласкі ачунялі маладога комісара...

Такою была Сьцёпа.

III.

На белапольскім фронце Сьпёпа трапіла ў палон. Партыйны білет, знойдзены ў Сьцёпы, быў лепшым довадам віны Сьцёпінай. Пасьля катаваньняў, пасьля збойства, яна была перавезена ў глухую катаржную турму.

Палон разлучыў з Платонам. Доўгімі здаваліся дні, шэраньню і вільгацьцю давілі Сьцёпу турэмныя сьцены.

У турме Сьцёпа была не адна. Разам з ёю у камэры жылі такія-ж энэргічныя, такія-ж бязутрымныя Сьцёпы.

Турэмны рэжым, разлука з Платонам уплывалі на Сьцёпу. З цьвітучай, з энэргічнай жанчыны выцьвітаў румянец, жаўцеў твар, і сохлі рукі. Але затое ўзнімаўся дух, зьбіралася крыніца энэргіі, праясьняўся розум.

Па вечарох ў турме праводзіліся сходы. На сходах выносіліся пэтыцыі, патрабаваньні і прапановы. У адказ на зьмяншэньне турэмнага пайку Сьцёпіна камэра першай абвясьціла галадоўку. Шэсьць дзён працягвалася галадоўка. На трэці дзень галадоўка была падтрымана ўсёй турмой, і ў выніку страчаныя правы былі зьвернуты.

У турме загаварылі пра замірэньне. Усе зьняволеныя жылі аднэй думкай—хутчэй вырвацца з ланцугоў, разам з замірэньнем павінен адбыцца абмен палонных...

Спахмурнеў за тыя шэсьць месяцаў разлукі і Платон. Асунуўся. Сваё асабістае „я“ ён ніяк ня мог расплавіць у агульным струмені людзкой сілы. Замірэньне з белай Польшчай нэрвавала яго, але ў той-жа час выплывала надзея зноў сустрэцца з Сьцёпай...

У турэмнай больніцы Сьцёпа нарадзіла сына. Уся камэра давала сыну Сьцёпы імя. Сыну далі імя Уладзік. Старая комуністка-немка настойвала на сваім. Яна хацела Сьцёпінаму сыну даць імя Карла Лібкнэхта...

Пад вартай праз усю Польшчу праяжджалі цягнікі з палоннымі. У аднэй з цяплушак ехала да Платона Сьцёпа з маленькім Уладзікам. На мяжы праводзіўся абмен палонных. І тут зьдзекі. Колькі едкіх, паскудных слоў пачула Сьцёпа па свайму адрасу з боку польскіх жаўнераў... Але гэта яе ня трывожыла.

— Я еду ў краінаў Саветаў з сынам комісара,—з пагардай гаварыла Сьцёпа,—я прывязу Платону сябе і сына. А ўсё-ткі хвалявалася. Быць можа ён і забыўся пра Сьцёпу...

Трэба было багата гэройства і мужнасьці, каб у людзкім моры адшукаць Платона. І Сьцёпа яго знайшла. Полк стаяў у вялікім горадзе. Сустрэча была непаўтарымай. Пры сустрэчы мо‘ ўпяршыню за ўвесь час грамадзянскай вайны заплакаў Платон, з радасьці прытуляючы да сябе свайго сына і Сьцёпу.

Па прыезьдзе да Платона Сьцепа зьлягла ў пасьцель. Здавалася, цяпер бы толькі і жыць... Балела горла, балелі грудзі. Сьцёпа прастудзілася. Тры месяцы Сьцёпа праляжала ў ложку.

Раньняй вясною, калі лушчыліся на каштанох вялікія, на арэхі падобныя, смаляністыя почкі, Сьцёпа памерла. N-кі полк хаваў свайго байца. Над сьвежай могілкай у гонар Сьцёпы тройчы прагучэў залп. Плылі ў неабсяжны прастор акорды жалобнай музыкі.

Платон застаўся з маленькім Уладзікам. Былі такія моманты, калі ў Платона зусім зьнікала сіла, воля, энэргія... Праз гады два пасьля сьмерці Сьцёпы Платон ажаніўся ў другі раз.

А праз год пасьля Сьцёпінай сьмерці да Платона дайшоў пажоўклы ліст з выцьвілымі радкамі літар. На конвэрце стаяла пячатка польскай вайсковай цэнзуры. У лісьце з турмы Сьцёпа пісала:

— Дарагі Платон! Праз некалькі дзён я буду маткай твайго дзіцяці Жыву ў катаржных умовах. Але гэта мяне не палохае. О, не, ніколі. Я знаю, што прыдзе час, калі мы зноў спаткаемся і будзем разам. Дзіця тваё, і я аддам усе свае сілы, каб выгадаваць яго для нашай Савецкай краіны. Ты не падумай, што я адна. Тут у турме разам са мною багата таварышоў. Яны мяне падтрымліваюць. Толькі ня ведаю, калі я вырвуся адсюль. Але ў тое, што вырвуся, веру. А можа ты пра мяне ўжо забыўся? Можа наша ранейшае жыцьцё было вынікам твае слабасьці? Тады ты мне прабач. Я спаткала цябе неспадзявана, наша сустрэча, нашы першыя прызнаньні стаяць у мяне ў вушшу. Праз турэмныя сьценкі я чую твой голас і бачу твой любы твар. А можа ўжо і цябе няма на сьвеце, можа ты загінуў, і мой ліст да цябе ня дойдзе? Але я выкарыстоўваю мажлівасьць—нам дазволілі напісаць па аднаму лісту—і першую вестку пра сябе пасылаю табе, мой слаўны, дарагі Платон. Цалую. Калі табе ня цяжка, паведамі аб маім лёсе маім старэнькім бацьком. Яны, відаць, лічаць мяне за пакойніцу. Да сустрэчы.

Твая Сьцёпа.

Шырокая прасторная вуліца з каштанавымі прысадамі. На гэтай шырокай, прасторнай вуліцы жыве былы комісар грамадзянскай вайны Платон Гладкі. Часта ўспамінае Платон сваю першую жонку Сьцёпу:

— Сьцёпа, Сьцёпа. Савецкай краіне патрэбны такія жанчыны, як ты...

Аркадзь Куляшоў

Пагромы

1

Гаварыла часта маці мне
Пра гады, залітыя крывёю,
Што прамчалі ў маладым паўсьне
Над маёй дзіцячай галавою.

З тых гадоў запомніў я крыху
Хіба толькі сум таемных песень,—
За вакном далёка на шляху
Неба сіняе і жоўты месяц.

* * *

Кожны дзень прыходзіла да нас
Маладая нашая суседка.
Гаварыла:
„У палёх вясна"...
І звычайна марыла пра лета...

А бацьком казала—
Буду я
Рэволюцыі малодшым сынам,
Будзе доля сьветлая мая
У гарматных бойках за краіну.

...Але
Я ня йшоў праз гром гадоў
З пераможным сонцам рэволюцый,
Кулямёт мой на тугу вякоў
Не страчыў сьмяртэльных рэзолюцый...

...З рэзолюцыяй не жартаваць,
Пішацца яна рукою сталых—
І прыходзілася мне трываць
І сачыць, як маладосьць ўзрастала...

2

Ёй было са мною весялей,
Хоць і шкоды я рабіў ня мала—
Міскі біў звычайна на стале,
А яна мяне абараняла.

І часамі песьні пела мне,
Калі ціха надыходзіў вечар,
Аб вялікай вольнай старане
І пакутнай долі чалавечай...

„Дзесьці, дзесьці далёка
Наша доля зарыта,
Мы яе не пабачым,
Мы яе ня ўгледзім...

Бродзіць вецер, лайдача,
І пяе як шарманка,
І дрыжыць яго цела
І калоцяцца зубы.

Для нас пішуць законы
І цары, і баяры.
І па гэтых законах
Нас вядуць да магілы.

Дзе-ж набрацца нам сілы,
Дзе-ж набрацца нам гарту,
Каб прышла перамога,
Каб прышла наша доля...

...Але доля прыходзе,
Сьвеціць зоркай чырвонай
За сівым перагонам
У крывавым змаганьні...“

Я ня ведаў песьні гэтай сэнс.
А ўсяго лічыў яе таемнай,
Пакараўся казачнай красе,
І імкнуўся не заснуць дарэмна...

У палі імчаў за далягляд
Гром званоў таемны вечаровы...
...Над шырокім горадам лягла
Зноў туга нацягнутых вяровак.

3

Цёмная вуліца... Ноч...
І пажомы...
...Горад стары
Выглядае, як корч.
Сёньня агні
Не запаляць у доме,
Сёньня такая
Трывожная ноч.

Чорнай вужакаю
Поўзалі чуткі—
Прыдуць і горад
Затопяць ў крыві...
Закамянелі
Пад месікам суткі,
Цемраю сполах
Гадзіны спавіў...

І...
Пачалося..
Далёкія шумы
Ломяцца ў дзьверы
Кварталаў і сьцен...

Ноч на вароты,
На дахі, на шулы,
На камяніцы
Савою расьце.

Крыкі і енкі
За нашай сьцяною...
Ў коміне круціцца
Вецер ліхі...

...Ў горадзе сёньня
Паўночнай парою
Ў людзкай крыві
Адпалаюць шляхі...
. . . . . .

А калі раньне
Нясьмела,
Пужліва
Кошкай падкралася
Ў вуліцы шум,

Мёртвыя вочы
Глядзелі тужліва
Ў сіні прастор,
Дзе пустэча і сум...

Сінія вочы
Ў трывозе раскрыты
І як заўсёды,
Здаецца, яны
Марылі горка
Аб долі забытай,
Прагна глядзелі
На сонца вясны...

4

І за жоўтай брамаю вакна,
Дзе шугае вецер няпрыветна,
Наўсягды пакрыўджана яна—
Маладая нашая суседка.

У таёмных сховінах грудзей
Гэта крыўда моўчкі затаёна.
На жыццё,
На долю,
На людзей,
Што прышлі з нажамі патаёмна.

Што прышлі і ворага рукою,
У крывавым гульбішчы сьмяртэльным,
Падарылі пры сустрэчы з ёй
Ў сэрца нож, гарачы і пякельны.

І яе—сьвятлейшае імя,
І яе душэўныя трывогі
Ўзносіць песьня добрая мая
На свае лірычныя парогі!

Сакавік, 1930 г.
г. Мсьціслаў

Зр4 чок
12 8ь

Пра сяброўства

Таварыш, дай руку, сяброўства маё
Магутнаю сілай крынічыць...
Я знаю—зьмяняе аблічча жыцьцё,
І людзі зьмяняюць абліччы.

Мы ж будзем, таварыш, такімі, як ёсьць,
Мы простымі й шчырымі будзем,
Як песьня мая і твая прыгожасьць,
Як гэтыя бурныя будні!..

Дай руку-ж, таварыш, хутчэй працягні,
Я сьцісну яе да болю.
Аднэй немагчыма ў нашыя дні
Гарэць, працаваць і сваволіць.

Сяброўства, таварыш, надзейны шлях;
Ён ясны, як сонца, і просты...
І ты ўзьнімаеш руку, нібы сьцяг,
І мне падаеш—на сяброўства.

* * *

Калі-ж запалаюць другія агні,
Калі загрукоча вайна,
Мая дарагая, мяне не малі,
Я сяду байцом на каня!

І віхрам памчуся ў бойку і дым
Краіну будоў бараніць;
І будзе адвага, і будзе ўздым,
І вочы—ня вочы—агні!..

Калі-ж я загіну ў бойцы ліхой,
Аддаўшы ўсё барацьбе,

Мая дарагая,

сьпеў

мой

Напамяць схавай сабе.

Успомніўшы часам, прашу—ня сумуй,
Ня трэба, нашто сумаваць?
Як зараз—зьвіні, як зараз—красуй,
Як зараз—сваволь і сьпявай!

Менск, 30 г.

Язэп Зазека

Бялюга

(*Апавяданьне*)

Сядзіць дзядуля Васіль на струхлелым альховым пні, пазірае старэнькімі, мутнымі вачамі на балота.

Думкі доўгімі істужкамі плывуць у яго галаве. Не пасьпее дзядуля адну разгадаць, як мільгатою ў тумане выплывае новая, незразумелая.

— Чаго, дзядуля, так задумаўся?—калупаючы сьпічаком лазовы лапаць, заўважыў малады хлапец Сымон.

— Ад самага ранку, як толькі выгналі каровы, ўсё думаю.

— Аб чым дзядуля?

— Аб трактары, наконт якога сёньня ўвечары будзе гаварыць Мікола. І чаго гэты дзяцюк толькі ня выдумае, малатарню прывёз, якая малоціць і арфуе, а зараз хоча прывесьці трактар, які будзе араць Бялюгу.

— Няма нічога дзіўнага, што малатарня малоціць і арфуе, ёсьць машына комбайн, якая жне, малоціць і арфуе і ў нас хутка яна працаваць будзе,—казаў Сымон.

— А што-ж мы тады рабіць будзем, калі пойдуць на наськім полі такія машыны?

— Менш працаваць будзем. Паглядзіш, дзядуля, як заўтра рваць куп'е будзе трактар.

— Які гэта трахтар, раскажы дзеткі, і колькі патрэбна коняй, каб пацягнуць яго па балоце?

Сымон кінуў заборсаваць лапаць, сьмяяўся, хітра прышчурыўшы вочы.

— Ды гэтакая машына, якая сама поўзае на жалезных лапах і цягне тры плугі.

— Тры плугі,—зьдзіўлена паўтараў дзядуля, потым змоўк, спусьціў у зямлю мутныя, старыя вочы, сінія патрэсканыя ад асеньняга ветру і старасьці яго вусны нярухома застылі. Подыхі ветру паслужліва паласкалі валасы, што ручайкай рассыпаліся на жоўтым васковым яго твары.

— Утопіцца, як калісьці Хвёдараў конь,—прагаварыў нібы сам сабе дзядуля.

— Ну і сьвет настаў, хітрыя людзі. Здаецца, нядаўна тут,—паказваючы на сталёвую бліскучую істужку новай канавы,—хлапчукі зьбіралі яйкі журавоў, качак, а ў хмызьняку на ўзгорку панічы лося забілі,—апавядаў роўна, ціха дзядуля.—А зараз думаюць пусьціць машыну.

На поўдні глянула берагам стомленае сонца. Цягнулася доўгімі белымі ніткамі павуціньне. Чаплялася рыштаваньнем на кустох і на сьмяглай траве.

Нябачная сіла кратала жоўтае лісьце, якое шастала ў пераплеценай ветрам траве.

— Го! го! го!.. выганяй, Сымон, кароў з балота, пагонім на жытнішча,—зашпіляючы зробленыя з бярозавых дубцоў гузікі, хрыпла праказаў дзядуля.

Павароткі, малады, поўны жыцьця і рухавасьці Сымон, заткнуўшы за пояс сьпіцы, спрытна скачучы з купіны на купіну выганяў кароў.

— Вось ліханька, маюць знароўку наводныя каровы, у балота чортам не загоніш. Але прыдзецца прывыкнуць да травы і наськага сена,—да кароў гаварыў дзядуля.

Падыхаў вільгацьцю захад, шумела асака, дрыжэў спалохана алешнік, нябачная сіла ахапкамі гарнула жоўтае лісьце, якое чаплялася сухімі вусікамі, крактала: ках... ках... ках...

* * *

Вечар...

На зямлю шчыльна прылягла, прытулілася цемень.

Хмары карункамі зьвязалі, скруцілі неба.

Абрыўкамі даносіўся лёскат калёс, на якіх звозілі з поля грэчку.

У хаце Міколы на сход сабраліся колгасьнікі.

— Ты куды, Ігнась?—затрымаў у варотах Гудовіч.

— На сход. Ці табе невядома, што Бялюгу заўтра сушыць пойдзем?—ня спыняючыся, адказаў Ігнась.

— Нават не хачу слухаць. Я-б табе разам з Міколам горла перагрыз,—сьціснуўшы сківіцы, паціраючы рукі, ядавіта прашаптаў усьлед Гудовіч.

— Вядома, калі-б узараць Бялюгу, ды засеяць цімафееўкай, тады-б на нашую жывёлу корму хапіла,—размаўлялі паміж сабою колгасьнікі.

— Мужчынкі, куды вы?

— Як куды, на сход.

— Адносна балота?

— Але, вечарам усім загадваў Мікола,—спыніўшыся, адказаў Міхневіч.

— Ня слухайце, мужчынкі, што вам гэты хлюст нагаворыць, дурань ён. Ці па нашым балоце пойдзе трактар? Ён-жа ўгразьне, потым век ня выплацім. Колгас Калініна ў зубы нам не паглядзіць. Што яму. Ён голы быў, як бізун, пасьвіў кароў, адносіў на заводы бутэлькі, ён туды і пойдзе, а у нас конікі, кароўкі забяруць.

— На чорта нам гэтае балота. Няма сенакосу, хай райвыканком дасьць. Ня дасьць,—мы разойдземся працаваць на свае гаспадаркі, лепшы толк будзе, запэўняў Гудовіч.

— Я даўно думаў, што калі-б была-б у нас сенажаць, дык напрымалі-б усякага зброду, а то адказ кароткі—няма куды прымаць,— хітра сьмяяўся Туміловіч.

— Напэўна сабраліся. Перакідваючыся жартлівым вясёлым сьмехам, ішлі на сход хлапцы, дзяўчаты.

— Пойдзем, суседзе, так і скажам.

— Так і скажам,—адказаў Гудовіч.

У хаце каля стала натоўпам сабраліся хлапцы і дзяўчаты, гулялі ў шашкі.

— Маладзец, Каця! Вось ты яго пасадзіла, ня выбрацца яму адтуль, паглядваючы з-за плячэй, сьмяяліся, пільна сочачы за ходам шашак, таварышы.

— Біта, твой ход,—заўважвалі ігракі.

— Добры вечар, суседзе,—адчыніўшы дзьверы з парогу праказаў дзядуля Васіль, сеў на зэдлік, дастаў з-за пазухі з доўгім крывым цыбуком люльку, натаптаў самасаду, прыпаліўшы на комінку шчэпку закурыў. Горкі дым распоўзься па хаце, прыліп да столі.

— Вось дзядуля таксама скажа, што трактар па нашым балоце ня пойдзе,—вядучы гутарку з колгасьнікамі сказаў Гудовіч.

— Не, я раней думаў, але кажуць людзі разумныя, што пойдзе і на наськім балоце. Сенажаць тут можна зрабіць добрую, добрую...

— Таварышы, колгасьнікі,—паглядзеўшы, што сабраліся ўсе, адчыніў сход старшыня колгасу. Усім вядома, што ў нас кепская справа з сенажацямі. Гэтыя 13 гэктараў прымушаюць нас прымаць абмежаваную колькасьць жывёлы, вызваліць-жа з гэтага становішча можа нас балота, узараўшы якое, на вясну можна пасеяць каля 13 гэктараў цімафееўкі, што забясьпечыць нашу жывёлу кормам.

Упэўненыя словы маладога з раскудлычанымі, пацёртымі пад шапкай валасамі, хлопца распаўзьліся ў горкім дыме, стукалі цяжка ў вушох Гудовіча.

— Ворыва нам нічога каштаваць ня будзе за выключэньнем рабочай сілы. Ёсьць наконт гэтага поўная дамоўленасьць з загадчыкам зямельнага аддзелу, што ён прысылае заўтра гідротэхніка, а таксама з колгасам Калініна, які на тры дні дае трактар і трактарыста. Па нашым балоце трактар пойдзе, яго аглядалі спрактыкаваныя людзі.

— Угразьне!—са злосьцю перабіў Туміловіч. З нас Калініна шкуру зьдзярэ. Век не адкупішся. Сьмяюцца з нас разумныя людзі, што на балоце будзе расьці цімафееўка.

— Таварышы колгасьнікі,—пачаў комсамолец Ігнась. Думка Міколы, гэта думка комсамольскай ячэйкі. Раней гэтае пытаньне разглядаў комсамольскі сход. Сход ухваліў ідэю Міколы. Бялюгу ўзараць трэба, інакш мы будзем мець цяжкасьці з кормам. Баяцца, што ўгразьне трактар, ня прыходзіцца, агроном агледзеў яго, яно прыгодна для распрацоўкі. Кулаком гэта не пажадана, яны імкнуцца, каб стварыць цяжкасьці ў колгасе, а потым пайсьці з яго і працаваць на сваёй гаспадарцы.

— Трэба асушыць балота, а то купленыя каровы травы наськай не ядуць,—нясьмела сказаў дзядуля Васіль, сьціснуўшы моцна кастлявым пальцамі люльку, паглядзеў на Гудовіча і сеў.

— Таварышы, браткі, ці вам надаела жыць, ці-ж вам хочацца жывым лезьці ў пятлю, браць трактар, які як факт угразьне ў нашым балоце, Калініна век па судох нас і нашых дзяцей цягаць будзе. Узяць машыну на нашае балота рызыкоўна. Гэта зрабіць можа толькі той, хто прышоў у колгас бяз нічога.

— Дазвольце мне,—з натоўпу вышла сярэдніх гадоў кабета Насьця.—Камінскаму, Гудовічу і іншым кулаком ня люба, калі мы пашыраем сваю плошчу, будуем сваю соцыялістычную гаспадарку, Гудовіч ён усякімі довадамі імкнецца перашкодзіць нам, ён супроць прыёму ў колгас беднякоў і сераднякоў, ня трэба нам падкулачнікаў, ня хочуць ісьці працаваць на балота, абойдземся бяз іх, Бялюгу ўзаром, усе сілы аддамо, але пераможам.

— Узараць, узараць Бялюгу. Калі трактар загразьне, мы яго на плячох вынесем!—пачуўся гоман, спрэчкі, дзелавітая размова колгасьнікаў.

* * *

Раніца...

Ад вечнага сну закалыханая крыкам журавоў і качак і шэптам асакі прабудзілася ад гулу трактара, ад гоману людзей Бялюга.

З правага боку балота, шырокімі грудзямі разьбіваў трактар густыя, нібы вата, зблудзіўшыя начныя туманы.

Пад цяжкімі шырокімі гусеніцамі дрыжала, калацілася дрыгкая глеба.

З клінаватымі нарогамі плугі рэзалі, высьцілалі чорнымі істужкамі скібы.

Вось рухава находзіць трактар на стрыжнявы, з сіняй абалонай хваёвы пень, уперад чым падхапіць яго нарогамі, трактар наступіў на яго, затаптаў гусеніцамі, а потым дружна падхапілі нарогі, кракнуў, усмоктаны гадамі пень, чапляючыся сваімі махрамі за зямлю, выляцеў уверх пераплеценымі лапамі.

— Глянь, суседзе,—стукнуўшы па плячу, сьмяяўся, паказваючы Міткевічу дзед Васіль.—Дзесяць коняй ня вырвалі-б яго. Усьлед за плугамі ішлі чарадою дзеці, паджылыя мужчыны, кабеты, бралі ў пальцы зямлю, пераціралі яе, глядзелі.

— Чаму тут не парасьці цімафееўцы,—казалі адны.

Аднаасобнік Рыгор адрэзаў дубец, зьмераў упоперак і ў глыбіню баразду, потым зьдзіўлена паказаў:

— Ён бо за два мае плугі бярэ.

Вось падышоўшы да натоўпу, які сачыў за кожным яго рухам, лязгаючы гусеніцамі, спыніўся трактар. Ігнась хутка напаіў яго „вадою", трактарыст націснуў на пэдалі, зарухаліся гусеніцы, яшчэ мацней загуло балота, белымі кавалкамі падала клочча дыму.

Усход іскрыўся блакітам, жменямі насыпаліся праменьні сонца' ад распранутых суччаў алешніку кратамі паўзьлі худыя цені. Трактар, адмерваючы квадратам плошчу, трапіў на гразкую ўздухліну.

— Угразьне!—стукнуўшы па плячу Туміловіча, здаволена крыкнуў, аглянуўшыся навакол Гудовіч.

— Угразьне,—спрытна адчыніўшы партабак, закурыў папяросу Туміловіч.

— Угразьне, капут, ня вылезьці,—сьмяяўся Гудовіч. Узышоўшы на гразь, закруціўся на адным месцы гусенічны ланцуг.

— Мікола, бягом! Дапаможам,—перапалохаўся дзядуля Васіль.

— Угразьне!—выліўшы ваду з вядра, пусьціўся, што мага Ігнась.

Трактарысты падняў плугі, націснуў пэдалі, трывожным, просячым гулам загудзеў матор. Задні ланцуг асядаў усё ніжэй і ніжэй.

— Угразьне, капут, хай ведаюць,—закурыўшы, задаволена ішоў Туміловіч.

Але трактар сабраў сілы, хапіў на ўсе цягліцы, выскачыў з уздыхавіны на сухое месца.

— Вось маладзец!— пачуліся здаволеныя, са сьмехам, галасы колгасьнікаў.

— Гэта ня Хвёдараў конь,—сьмяяўся дзед.

* * *

Назаўтра рана, спаткаўшы Міколу, Гудовіч дастаў з жоўтага партманэту перакладзеную ў некалькі разоў паперку, сунуў яму ў рукі. Вялізнымі літарамі на ёй напісана было:

З А Я В А

Прашу ня лічыць нас сябрамі колгасу „Нараджаньне“ і вярнуць нам жывёлу і маёмасьць.

— Праўленьне разгледзіць,—палажыўшы ў кішэню, адказаў Мікола.

Балота гуло, як учора; дзед сядзеў на альховым пні каля балота, у вачох мільгацела, мятусілася машына, якая жне, малоціць і арфуе.

— Курлы, курлы, кр-лы,—зьверху даносіліся доўгія перабойныя галасы журавоў, якія, нібы вёсламі, разгортвалі клінаватымі крыльлямі шэрую вадзяністую муць, спускаліся ўсё ніжэй і ніжэй.

— А-га!.. Успомніў важак, як калісьці адпачываў гасьцём у нас, але зараз ты ня госьць, учора прышоў новы госьць, які зьнішчыў пні, гразь,—размаўляў з журавамі дзед задраўшы ўгору рэдкую сівую бараду.

К вечару правы бераг Бялюгі стаў чорным.

25 кастрычніка 1930 г.

Юлі Таўбін

Таўрыда[1])

(пачатак поэмы)

Заіру Азгуру

„Старый дож плывет в гондоле с догарессой молодой".
А. Пушкин.

I.

У Вэнэцыі месяц-дзюк
Над сям'ёю палацо і хатак...
Романтычным пачуцьцям люк
Адчыняе такі пачатак.

Пачынаецца—
звон мандол,
Лепет лютняў і гоман мэсы...
Пачынаецца—
плёск гондол
З лёгкім подыхам догарэсы.

І ў паветра пяшчот устаў
І пад небам вечнага лета
Дымам дыхае даўні квартал
Романтычна-бруднага „getto".

...Заглушае зьвярыны рык
Клявэсыйнае кволае скерцо,—
Гэта просіць Шэйлок стары
За дачку—хрысьціянскага сэрца.

...Над фронтонамі пыхкіх віл,
Над тэрцынамі Дантаў узьнёслых
Вее жахам жывых магіл,
Дзікі плач Урыэля Акосты.

...Лютняў лепет... гітары звон...
...Догарэсы ў клясычных позах...
...Пасылае небу праклён
Зжабрачэлы Борух Сьпіноза...

[1]) Таўрыда—старагрэцкая назва Крыму. Поэма апісвае перасяленьне яўрэяў на зямлю ў Крым.

Да маркізы на мэнуэт
Пасьпяшае прыдворны поэт.
У царыцы грацый і муз
пагасілі агні да пары...
Асьвятляюць шляхотны саюз
Інквізыцый сьвятых кастры.

Каляровыя цені ляглі
На вузорны кітайскі кілім...
Дэклямуе прыдворны поэт
Паважанай маркізе сонэт...

...А крывавых кастроў сьвятло
Прабіваецца цераз шкло...

* * *

У царыцы грацый і муз
Апусьцее потым палацо...
Адвядуць можа месца яму
У гісторычных вучоных працах...

Потым „Блерыо“ першы ўзьляціць,
Потым радыё
гукі зловіць...
І пракрэсьліць
каналаў
ціш
Дасканалы
моторны
човен.

Але доўгіх стагодзьдзяў лёс—
Ён надоўга адзнакай лёг.

Будзе ў Пушкіна каля дзьвярэй
Доўга стукаць „презренный еврей“,

Яшчэ будзе зноў і зноў
Захліпацца ў крыві Кішанёў,

Яшчэ будзе на сто гадоў
Адчувацца ўшыркі і ўздоўж—
„Бі жыдоў! Бі паганых жыдоў!
Бі жыдоў“!..

* * *

Вось ён, вось ён—стары ліхвяр,
Што трыкутнікам—барада.
Што ў маршчынах рухавы твар
І запушчаны лапсардак...

Шмат з тых дзён праплыло вады.
Ён зьмяніўся цяпер куды!..

Аблягае прыгожы фрак
Непарушна ягоны стан...
Ён ня золатам будзе граць,
Будзе акцыі ён лістаць.

У яго—і тэатр, і бар,
І падлізьнікаў чарада.
Гэта той-жа стары ліхвяр,
Што трыкутнікам—барада.

Гэта—сьвету старога вар,
Гэта дзікіх стагодзьдзяў дар,
О, агідны стары ліхвяр,
Што трыкутнікам—барада!

Прамысловец, ранцье, банкір!..
Вы трымаеце ў лапах сьвет.
Вам поэты плятуць вянкі,
Захліпнуўшыся ў харастве.

Залівайце свой жах віном
І спраўляйце апошні фэст—
Пагражае вайне вайной
„Kommunistischer Manifest".

Сьцеражыся, стары банкір!..
...І насустрач варожым сілам
Выступае Лекерт Гірш
Разам з Ботвінам Самуілам.

* * *

Хай ня ўстануць яны з пяску—
Чуеш шолах сьмерці ляза?..
Што-ж палохае вас бяз куль
Пролетарскі маяк—Масква?

Што-ж ты, гожы мой, залаты,
Ад якіх пасівеў нягод?
Свае важкія малаты
Падымае твой-жа завод...

Дык хутчэй-жа канчай свой баль,
Баль стагодзьдзяў і скок вякоў...
Зачыняй на замок свой банк,
Зачыняй на замок яго.

Адсьвяткуй свой апошні фэст—
Па інакшаму вее вэст—

У апошні жыцьцёвы кон
Ён прыносіць табе твой скон
І шапоча пракляты вэст:
„Kommunistischer Manifest"...
„Kommunistisch-scher
Ma-ni-fest"...

16-18/VIII-30 г.
Ворша

II.

Восень...
Сталі рабіны ў нязьменны дазор...
Беларуская восень стаіць за дзьвярыма,
Нехта доўга і пільна, да ранічных зор,
Будзе пальцам вадзіць перад картаю Крыма.

І, аблашчанай сьвежым прыбоем марскім
І таемнаю дзеўчынай—дальняй і блізкай,
разгартаецца севам шырокім прад ім
гонар Генуі, скарбы Эляды—паўвыспа.

Адчыняецца скалаў суровы абрыс,
б'юць Азоўскія хвалі аб сінія зоры,
налятае на бераг абрывісты брыз—
гэта хмурыцца цёплае Чорнае мора.

Вось вароты у Крым—тут сінее Сіваш,
Жылка чорная значыць дарогу Салгіра...
Ці ня тут генуэзцы вайстрылі палаш,
ці ня тут заціхала атэнская ліра.

Там адрыты з стагодзьдзяў стары Хэрсонэс,
там руіны фортэцый стаяць над скалою,
а затым туманам узьнімаецца лес
над царыцаю Крыма—ўсяўладнай Яйлою.

Чатырдаг—адзінока маўклівы заўжды.
Для Ай-Пэтры—турысты ўлюбёная ноша.
І вядуць гураганы размову тады
над закінутым кратэрам на Роман-Кошы.

Восень...
Варта рабін аздабляе паркан...
Беларуская восень з сваім краявідам...
Нехта думае доўга пра зюйд гураган
і пра новую славу пшанічнай Таўрыды.

Увагі. Салгір—рака ў Крыме. Яйла—горны ланцуг. Чатырдаг, Ай-Пэтры, Роман-Кош—найбольшыя горы гэтага ланцугу.

19/VIII-30 г.
Ворша

Даўгапольскі

Начлег

Прадстаўнік земаддзелу таварыш Гнесін зморана перагортваў таўшчэзную кнігу, больш падобную на старажытны фоліянт, чым на дзеньнік колгасу, і паціху вымаўляў прозьвішча за прозьвішчам. Калі ён амаль шэптам, нібы са спачуваньнем, вымавіў прозьвішча Рахінзона, увесь сход, здавалася, уздрыгануў. Застылі твары ва ўсіх, дзесяткі вачэй канфузліва хаваліся, не знаходзячы месца, на чым бы спыніцца. Вядома, усім хацелася ўпіцца поглядам у твар Рахінзона, але людзі паварочвалі галовы ў бок адчыненых, зацягнутых вячэрнім змрокам вакон, сачылі за кружэньнем матылькоў вакол лямпы, спрабавалі гуляць з дзецьмі старшыні, якіх чацьвёра пралезла ў натоўп дзядзькоў і цётак. Але нават гэтыя чатыры свавольнікі змоўклі, нібы разам са ўсімі чакалі адказу Рахінзона.

— Чаму-ж ня прыяжджае ваша жонка?—спытаў Гнесін.

— Я яе чакаю з дня на дзень. Па-першае, яна перанесла жаночую хваробу... хе-хе-хе... а ў колектыве няма доктара. Па-другое, ёй трэба ліквідаваць сякія-такія справы. Па-трэцяе, я вось чакаю яе. Яна прыедзе, можаце быць спакойны.

Тлумачэньне, якое расьцягнулася ад „па-першае“ да „па-трэцяе“ нікога не здаволіла і менш за ўсё спадабалася Гнесіну. Рахінзон зразумеў, што яму будуць задаваць пытаньні, і, чакаючы іх, ён паважна выцягнуў з кішэні бляшаную з-пад цукеркаў скрыначку з махоркаю, павольна скруціў цыгарку, абтрос яе, двойчы пасьлюніў — але пытаньняў ніхто не задаваў. Гнесін уткнуўся ў фоліянт і, нечага шукаючы там, знакам прыцягнуў увагу старшыні колгасу да кнігі. Старшыня шырока раскрыў свае вавёрчыныя вочы і пашаптаўся з Гнесіным на вуха. Пасьля ён пераглянўўся з усімі сябрамі праўленьня, жадаючы гэтым давесьці, што ня мае намеру ўтаіць ад іх што-небудзь. Яны толькі павінны зразумець, што другога спосабу адказаць прыежджаму партыйцу тут на сходзе—няма.

Праўленцы ўпарта маўчалі. Гнесін дастаў папяросу, пакарпаўся ў кішэнях, але запалкі не знаходзіў. Тады Рахінзон запаліў сваю запалку, паднёс агонь Гнесіну, сам прыкурыў і спакойна сеў на месца.

— Дык вы кажаце, што сёньня—заўтра прыедзе ваша жонка?—перапытаў Гнесін.—А што, калі яна ня прыедзе?

— Ну ведаеце, можа, памылюся адным днём, але прыехаць то яна прыедзе,—адказаў з месца Рахінзон.

Сход ўсё маўчаў. На задніх лаўках слаўся прыглушаны шэпт Толькі Юдэс, шырокая, поўнагрудая жанчына, якая стаяла каля стала з дзіцьцём на руках, нібы мармынула сама сабе:

— Заўтра раніцай—добрая раніца. Добрая раніца—добры дзень.

— Вы, таварыш, таксама сумняваецеся, ці прыедзе яго жонка? паспрабаваў Гнесін справакаваць жанчыну.

— Мы ўсе сумняваемся,—адказала яна.

— Мяне трохі зьдзіўляе адна рэч, — загаварыў вельмі сур'ёзна Гнесін.—Вы, відавочна, лічыце мяне чужым. А маё жаданьне, каб вы выказаліся адчынена, па-таварыску, аб усім набалелым. Толькі дзеля гэтага я і прыехаў да вас.

Некалькі галасоў, перабіваючы адзін аднаго закрычалі:

— Сапраўды трэба пагаварыць.

— Кожны хоча, каб другі выступіў.

— Маўчанка нічога нам ня дасьць.

Колгасьнікі, асабліва жанчыны, паступова рабіліся жвавейшымі.

— Таварышы,—пачала адна, заткнуўшы рот дзіцяці, - Няхай хаця прыедзе яна на бульбу... Дай божа, каб яна прыехала хаця з першапуткай [1]). Будзьце ўпэўнены, мы яе ўбачым у будучым годзе на дачы з гамаком.

— А калі вы тут, Юдэс, знаходзіцеся—якую карысьць атрымліваеад вас колектыў?—узьняўся з месца Рахінзон.

— Я выхоўваю для колектыва работніка, а ты?

— А я працую і кармлю гэтага самага твайго хлапчука.

— Ты корміш маё дзіцё?—ляснула сябе Юдэс па магутных грудзёх. А можа я тваю мадам выкарміла.

— Ты маю жонку?

— Была я служкаю ў твайго цесьця ці ня была?

— А калі і была?

Дык цяпер неяк няма тваей жонкі, каб жыць у адным колектыве з ранейшаю служанкаю. Яна чакае таго часу, калі мы разбагацеем, ці калі яна зусім зробіцца беднаю... Ой, ня скора, мілы мой, збудзецца гэта. Мы яшчэ вельмі далёка ад багацьця, а да таго, покуль жонка абсмокча да канца тлустыя костачкі твайго цесьця, таксама пройдзе не адно лета... Ты лепш скажы партыйнаму таварышу, чаму ня едзе сюды твая Сара Ісаакаўна.

Рахінзон глыбока зацягнуўся дымам, зрабіў некалькі крокаў да печы і, абсьліняўшы недакурак, кінуў яго ў печ, а пасьля жаласьлівым тонам загаварыў:

---

[1]) Першая санная дарога.

— Увесь колектыў бачыць, як я працую. Праз некалькі дзён колектыў зможа пераканацца ў тым, што жана мая таксама ўмее працаваць. А над Сарай Ісаакаўнай няма чаго сьмяяцца. Маю жонку называюць Сара, а бацьку яе—Іцхок.

— Мы гэта вельмі добра ведаем. Местачковыя шаўцы могуць што-колечы расказаць пра гэтага ўласьніка скуранага заводу, які драў скуру з жывога і з няжывога.

Сход загаманіў. Праўда Рахінзон меў тут сваіх прыхільнікаў, але і ім ня верылася, каб Сара Ісаакаўна прыехала ў колектыў.

Аднекуль з цемені пачуўся жаночы голас.

— Гэта матылёк з магнэсам. Хутчэй яна выцягне мужа ў горад, а ня ён яе ў колектыў.

— Раз так,—заявіў Гнесін,—Рахінзону ўсё адно давядзецца ў горад паехаць. Або ён там зусім астанецца, або вернецца ўжо з сям'ёю.

Сход колгасьнікаў зацягнуўся. У старшынёвым пакоі стаяла духата і дым. Дзеці, якія раней з цікавасьцю глядзелі на Гнесіна і па-свойму рэагавалі на кожнае выступленьне, цяпер моцна спалі, цесна прытуліўшыся адзін да аднаго. Разам з дзецьмі прыкарнуў у кутку старык-колгасьнік, адзеты з прычыны прыезду гарадзкога госьця ў чорны суконны сурдут.

А лямпа чадзіла, павольна шумела жаночая частка сходу, і Гнесін раптам успамянуў, што час канчаць. Іначай ён спозьніцца да цягніка, які адыходзіць уранку. Аднак колгасьнікі ніяк не адпускалі Гнесіна, яны знаходзілі ўсё новыя і важныя пытаньні, разблытвалі іх павольна і ўдумліва.

Пасьля сходу працавала камісія. У адносінах да Рахінзона вынесьлі такую пастанову:

„Ня супярэчачы супроць самога Рахінзона, які падпарадкуецца ўсім рашэньням колектыву, не лянуецца ісьці на работу разам са ўсімі, камісія, аднак, лічыць немагчымым пакінуць Рахінзона ў колектыве, бо ён цалкам знаходзіцца пад уплывам свае жонкі, якая прыяжджае ў колгас як госьця, трымае сябе папанску, што ня можа не раздражаць жанчын колгасу".

Гэтую формулёўку, прапанаваную Гнесіным, камісія прыняла цалкам. Правільна. Яны, члены камісіі, таксама такой думкі. Няхай ужо зусім ня прыяжджае жонка Рахінзона—тым лепш.

Толькі апоўдні падалі Гнесіну брычку. У парадку сядзеў Рахінзон, і гэта Гнесіну не спадабалася. Але старшыня колгасу ўладаў добрым чуцьцём.

— Пастойце, сказаў ён наўмысьля моцна,—мне, аднак, у малочнае таварыства трэба зьезьдзіць. Давайце заадно адвязу вас. Добра, таварыш Гнесін?

Брычка пачала падскакваць па бярвеньнях, што тырчэлі з ледзь асушанага балота. Гнесін успамянуў, што вось ужо трэція суткі не

адпачывае яго зморанае цела. Два вечары цягнуўся сход колгасьнікаў, удзень яго вадзілі па полі, паказвалі кожны шматочак засеянай зямлі. Ён прылёг быў на гадзіну ў старшынёвым пакоі на шырокай старамоднай канапе, але мухі ня далі заснуць. А на сене спаць ён асьцерагаецца з таго часу, як пасьля аднаго пахучага начлегу правакавенчыўся з вухам некалькі дзён. Нейкая казяўка вельмі над ім пажартавала.

У мястэчка Гнесін прыехаў зусім разьбітым. Ён вырашыў зайсьці на хвіліну ў райком, каб не затрымліваючыся там, выехаць вячэрным цягніком. Дома яго чакала чыстая пасьцеля, электрычнае сьвятло, адчыненае вакно, якое глядзіць на горад з другога паверху. Сапраўды добра ўлетку нават у горадзе.

Вось гэтак раздумваючы, Гнесін падняў галаву і ўбачыў недалёка ад сябе на плоце афішу... „Адбудзецца агульны сход членаў Азэту. Дакладчык тав. Гнесін".

„Сход членаў Азэту з дакладам таварыша Гнесіна" скончыўся позна ўночы. Гнесін пацягнуўся ў адзіны ў мястэчку заезны дом. Але там не знайшлося месца.

— Мы можам вам паслаць на сене,—ласкава прапанавала гаспадыня.

— М-м, на сене?—ужо хацеў быў згадзіцца Гнесін.

Але ў гэтую хвіліну даволі мэлёдычны голас прамовіў за яго сьпіною:

— Магу прапанаваць госьцю начлег.

Гнесін павярнуў галаву і ўбачыў тую самую стрыжаную блёндынку, якая на сходзе сядзела на першай лаўцы і вельмі ахвотна перадавала ў прэзыдыум чужыя запіскі. Ён яе пазнаў па круглых поўных руках, па дзявоцкай сьветлавалосай галаве, якую яна цяпер так сама, як на сходзе, з манерам адкінула назад.

— Вы, здаецца, былі на сходзе?—больш упэўнена, чым пытаючы, сказаў Гнесін.

— Так, была... Хадзем, хадзем. Як відаць, вам вельмі спаць хочацца.

— А куды вы мяне паведзяце?

— Хадзем. Як бачыце, я вас не баюся, дык і вы мяне не палохайцеся.

Гнесін адчуў прыемную дрыготу.

— А як ваша прозьвішча, можна даведацца?

— Рахінзон.

Гнесін спыніўся, ня ведаючы што рабіць. Што-б там ні здарылася, але да нэпманскае дачкі на начлег ён ня пойдзе. Гэта пытаньне такту. Як партыец, ён не павінен гэтага рабіць.

— А вы ня жонка Рахінзона, які ў колектыве?—спытаў ён на ўсякі выпадак.

— Калі-б я была жонкай Рахінзона,—адказала дзяўчына,—вы былі-б пазбаўлены начлегу. Жонкі Рахінзона няма ў мястэчку... Чаго-ж вы стаіце? У нас начаваў не адзін адказны работнік. У мяне ў самой дваюрадны брат партыйны, у Маскве працуе.

— А ў якой вы сувязі з Рахінзонам, што ў колектыве.

Дзяўчына засьмяялася.

— Што ў колектыве?.. У нас палова мястэчка Рахінзонаў. Па прозьвішчу соцыяльнага становішча тут не ўстановіце. Наогул, ня хочаце? Спакойнае ночы!

Гнесін адчуў, што гутарка з дзяўчынаю трохі расьсеяла яго змору. Ён цяпер ішоў побач з ёю на гору, не сьпяшаючы, усё больш супакойваючыся. Над мястэчкам плыў туман ды сьвежасьць. Калі-б дзяўчына не зьяўлялася атожылкам Рахінзонаў, магчыма, Гнесін абняў бы дзяўчыну, прытуліў бы да сябе. Ён быў упэўнены, што яна ня будзе супраціўляцца. Але гэта жахлівае прозьвішча...

Вось так з ушчэмленым сумленьнем ішоў Гнесін за дзяўчынаю. Пахла агародамі, гноем, выпэцканымі ў гразі сьвіньнямі. Было вельмі цёмна, і Гнесіну здавалася, што вось-вось ён наляціць на бервяно ці на камень, або трапіць у якую-небудзь яму. Ён маўчаў. Рахінзон карабаціла яго маўчаньне. Нельга-ж сапраўды быць грубіянам і маўчаць будучы адзін-на-адзін з жанчынаю, якая прапаноўвае табе пасьцелю, бязумоўна чыстую.

— Як працуе ў колектыве Рахінзон? Бадай ні к чорту яго работа? Асьцярожна, тут канава. Яшчэ пасьля давядзецца вас абмываць. Дайце вашу руку. Вось так.

Гнесін адчуў у сваёй кастлявай руцэ чужую, цёплую, жаночую руку. Ён усё маўчаў, хаця разумеў, што гэта нядобра.

Спыніліся ля высокага ганку. Дзяўчына пакінула Гнесіна на вуліцы, а сама пабегла ў двор, каб з сярэдзіны адчыніць госьцю парадны ход.

— А можа зьнікнуць і паблукаць да раніцы па мястэчку,— кальнула думка Гнесіна.—Ці можа на вогзале пасядзець да адпраўкі цягніка? Вельмі ўжо падазроны дом—высокі з шырокімі вокнамі. Мусіць кулацкая аселасьць.

Адчыніліся дзьверы, і Гнесін апынуўся ў прыгожа мэбляваным пакоі. Каля сьцен стаялі ложак, дыван, трумо. Гнесін убачыў сябе і дзяўчыну ў мутным трумо—яна ўвашла з кучаю сьвежае бялізны.

— Дзе вам паслаць—на дыване ці на ложку?

— Мне ўсёроўна,—адказаў Гнесін і запаліў запалку, на хвіліну асьвятліўшы цёмны пакой.

— У вас ёсьць запалкі,—распараджалася дзяўчына,—запалеце лямпу і наогул рабеце, што хочаце.

Гнесін лёг на ложак, з асалодаю пацягнуўся. Укруціўся ў зялёнага колеру плюшавую коўдру, узяў з начнога століка кніжку і пачаў чытаць.

— Чорт з імі,—канчаткова супакоіўся ён.—Усё-ж такі мясцовыя таварышы вялікія сьвіньні. Не адзін з іх не прапанаваў яму начлегу. Пасплю—і марш на вогзал.

Ён адчыніў фортачку, цяплей укруціўся ў коўдру. Мусіць яна адна на ўсю кватэру... Ня чуваць жывога чалавека... Ах, дурань ты, Гнесін.

— Можна да вас?—спытала за дзьвярмі Рахінзон.

— Можна,—адказаў Гнесін, адчуваючы, як яго пачынае трасьці.

— Вы ўжо сьпіце? Прабачайце. Памыцца зможаце вось тут. У мядніцы сьвежая вада. Сьпіце—вас разбудзіць рамізьнік, пастукае ў акно пугаўём. Ён ня спозьніцца. Вы ня супярэчыце супроць таго, што наняла рамізьніка?

На гэты раз Гнесін шчыра падзякаваў дзяўчыне. Галоўнае, ад яго адляцеў сон. Рахінзон стаяла ў дзьвярах з распушчанымі валасамі, вельмі лёгка, па-летняму адзетая, нібы была яна не дзяўчынаю, якая павінна сароміцца, а што-колечы спазнаўшай замужняй жанчынай.

— Вось прыеду ў горад і абавязкова ажанюся,—засьмяяўся ў думках Гнесін.

Прачнуўся Гнесін не ад удару пугаўём у вакно і не ад пальцаў Рахінзон у дзьверы, а ад дотыку нейкай халоднай мяккай рукі. Ён адчыніў вочы і ўбачыў. У першую хвіліну Гнесін ніяк ня мог успамянуць, дзе ён. Густыя паземныя прамені сонца залілі пакой, зрабіўшы яго малінавым, а каля яго, жмурачыся ад гэтага нязвычайнага сьвятла, стаяла Рахінзон, апранутая ў дарогу.

— Пасьпяшыце, а то яшчэ спозьнімся да цягніка,—сказала яна і вышла.

Наскора памыўшыся і адзеўшыся, Гнесін пакінуў спальню. У вялікім пакоі на стале яго чакала сьнеданьне—кава і сьвежыя здобныя булачкі.

— Можа прапанаваць грошы?,—падумаў ён, але не адважыўся зрабіць гэта.

Сеў за стол і ўзяўся ўплятаць сытнае, гарачае сьнеданьне. Трэба сказаць, згаладаваў такі Гнесін.

— А Рахінзона вы сапраўды выключаеце з колектыву?—зусім не дарэчы спытала дзяўчына.

— Хто вас пасьпеў так рана паінформаваць?—нездаволена буркнуў Гнесін.

— Старшыня колектыву.

— А гэта вас вельмі хвалюе?

— Пэўна, што хвалюе.

— Пры чым уласна вы тут?

— А пры тым, што Рахінзон мой муж.

— Чаму ж учора вы гэта захоўвалі ад мяне?

— Мне так хацелася.

— Хай так, але чаму вы ня хочаце працаваць у колектыве разам з мужам?

— Вы зробіце вялікае зло, калі выключыце Рахінзона з колектыву—выкручвалася жанчына.—Я з ім усёроўна разьвядуся. Нашто мне быць зьвязанаю з чалавекам, якога нават з арцелі выганяюць, які пазбаўлен выбарчых правоў?

— А я ня веру, каб вы разьвяліся з вашым мужам. Між іншым Юдэс служыла ў вашага бацькі?

— Служыла.

— Дык калі паедзеце да мужа?—пераскакваў з пытаньня на пытаньне Гнесін.

— А права голасу дасьце яму?

— Не.

— А я думаю, што дасьце.. Разам з вамі адпраўлюся ў горад і я. На адным рамізьніку паедзем, ці-ж ня праўда... У тумане нас ніхто не заўважыць.

Рамізьнік насьмешліва прывітаўся з партыйным таварышом, вельмі выразна цмокнуў на каня. Ранішняе паветра было напоена багатаю расою. Гнесін адчуваў сябе стрыножаным. З аднаго боку, яго калола сырая прахлада раніцы, з другога яго хвалявала цяпло ад прытуленага жаночага цела. Вочы сьляпіла вялізарнае рыжае сонца.

Рахінзон не пераставала лапатаць. Паказала Гнесіну завод, як, некалі належаў яе бацьку—хмуры будынак, што чарнеў у воддалі зьвярнула яго ўвагу на дзядзькаў млын, на крамы, якія калісьці былі ўласнасьцю бязьлікіх родзічаў мужа.

— Дык чаго-ж вы едзеце ў горад?—спытаў Гнесін, усё больш паддаючыся нейкай дзіўнай расслабленасьці.

— Ваша пастанова няправільная—вось чаго. Ведаю, ведаю пастанова гэта ў вас у портфэлі.

Нібы для забавы ўзяла ў Гнесіна з рук портфэль. „Толькі патрымаць крыху“..

Недалёка ад вогзалу яны абмінулі сэкратара райкому. Гнесін з штучнаю вольнасьцю азірнуўся. Сэкратар ня то жартам, ня то ўсур'ёз пагразіў яму пальцам. Гэты гест абразіў Гнесіна.

— Я вазьму вам білет,—заявіла Рахінзон і свавольна саскочыла з воза.

...Разам з Гнесіным і Рахінзон у вагон увайшло чалавек пяць з мясцовага актыву. Яны за панібрата, як з добразнаёмым і сваім чалавекам, прывіталіся з Рахінзон. Адзін жартам спытаўся, калі яна нарэшце паедзе да свайго мужа і возьме ў рукі серп.

Такое панібрацтва раздражніла Гнесіна. Калі-б не начлег у доме Рахінзон, дык ён-бы ўцёр морды мясцоваму актыву... І сапраўды, у момант абвостранай клясавай барацьбы... Але тут ён сам павінен прымаць удзел у лёгкім флірце і адказваць на танныя жартачкі местачкоўцаў.

Рахінзон дастала слоік з провізіяй. Актыў вельмі актыўна наляцеў на слоік, і ён хутка апусьцеў. Рахінзон асабіста паднесла Гнесіну рогалік, і гэты яе гэст быў чамусьці прыемны яму.

— А, таварыш Гнесін,—не ўціхамірваліся актывістыя. Чужую жонку крадзеце. Глядзеце, пападзе вам.

Гнесін маўчаў. Ён глядзеў на палі, якія беглі паўз цягнік, і стараўся вытлумачыць сабе, чаму-ж партыйцы, адказныя работнікі так схіляюць галаву, увіваючыся вакол кулацкае дачкі.

— Ну, а я?—тут-жа ўзьнікла прыкрае пытаньне,—я таксама пасьлізнуўся.

Цягнік набіраў хуткасьць, імчаўся ўсё наперад, грымелі па рэйках калёсы і нязычліва ўтуравалі думкам Гнесіна.

— Па-сьліз-знуўся! па-сьлі-знуўся! па-сьлізнуўся!

(*Перакл. з яўр. мовы*).

Зьмітрок Астапенка

Маё патэтычнае

1

Як сьцяг
Узьнімаю тваё імя,
У сэрца сваё кладу...
Праз шумныя вёсны
Ты йдзеш сама
Ў скляпеньні пахмурых душ.

У дні й гадзіны
Суровых дзей
Гляджу я на воблік твой.
І сэрца ня сэрца,
а жмут агней,
Што паляць усё сабой.

З табою, як лёзунгам,
Моцны я
І здолен ісьці ізноў...
Мацней сьціскае рука мая
Аловак, молат, старно.

І працай поўны,
І слоў жывых,
І часу мне не стае.
Заданьнямі год суровых тваіх.
Адзначу я дні свае.

На нівах тваіх—
Мой паходны стан.
Рука—на тваім старне.
А розум—
Дні ўкладае ў плян
Напружаных тваіх падзей.

Твой—
Песень маіх незгасальны касьцёр!
Я—твой непадзельна сам.
Ты скажаш,—

Аддай мне сягоньня жыцьцё,—
І я без ваганьня
Аддам.

Хай дні заціскаюць
Суровей, мацней,
Хай людзі ў працы гараць...
Блішчаць шляхаводнаю зоркаю
Мне
Твае агнязарныя—
— Пяць.

2

Напружаны, ўзрушаны
Кожны мускул,
Салютуе думка адна адной.
Па карце
Рэспублікі Беларускай
Праходзіць вясна за вясной.

Над пушчамі
І балатамі сівымі,
Дзе аіраў звон і цень,
Яны праплывалі
З агнямі і дымам,
Каб потым цьвісьці залацей.

Той час адгрымеў
Навальніцай нябёснай
У крывавай хадзе гадоў...
...Праходзяць над намі
Працоўныя вёсны,
З суровасьцю думак
І слоў.

Ідуць
Ня з музыкамі й песьняй вясельнай,
А з словамі—
— Праца...
— Плян

Над топкім балотам,
Сыпучай пустэльняй
Становяць свой буйны стан.

Зрабіўся іх дзень
Нявыбачна кароткім.
Іх рытмы—
Каманда,

—„Плі“...
Іх клікаць
Картамі пяцігодкі
З 28-га пачалі.

Напружаны, ўзрушаны
Кожны мускул.
Салютуе думка адна адной.
Па карце
Рэспублікі Беларускай
Праходзіць вясна за вясной.

3

Ўстаюць гарады,
Ўстаюць гарады
Праз дым і агні вечароў.
Над краем ад комінаў
Цягнецца дым
І зарыва льлецца, як кроў.

З усходу на захад
Бягуць цягнікі;
Спакою ім ноччу няма.
Вядуць пераклічу над краем гудкі,
Ўзрываюць халодны туман.

Там сплаўлены людзі
Адзінствам падзей.
Іх позіркі гостры, як нож.
Над імі ударны ўзнімаецца дзень,
Зьмяняючы ўдарную ноч.

Над імі халодныя зоры гараць,
Ўядаецца ночная золь...
Ім можа прыносіць імглістая рань
Сумненьні й хвілінны боль.

Але перад тварам шырокіх падзей
Узнімаюцца, рушаць ізноў...
І зноўку ударны ўзнімаецца дзень,
Зьмяняючы ўдарную ноч.

Ўстаюць гарады,
Ўстаюць гарады
Праз муць і агні вечароў.
Над краем ад комінаў
Цягнецца дым
І зарыва льлецца, як кроў.

4

Ўсю ноч ля вакзалу стаяў эшалён
Пляцформаў, таварных вагонаў.
А пятай у раніцу зрушыўся ён
Удалеч на ціхія гоні.

Пад сонцам ліпнёвым вясёлай зары
Цягнік паімчаўся ўдалечынь.
На шэрых пляцформах яго трактары
Узьнялі жалезныя плечы.

Ім выпаў з заводу ня блізкі шлях
Па жоўтай жытнёвай краіне.
Іх чорная недзе чакае зямля
З галоднай тугой па машыне.

Дзе шумны чарнобыль на межы пралёг,
Дзе вецер хістаецца, дрэмле,—
Сустрэнуць іх недзе ў бяскрайных палёх
Колгасаў шырокія землі.

Застылі у марах нямых трактары,
Узьнялі жалезныя плечы...
І з грукатам, гулам, пад бляскі зары,
Цягнік парываўся ў далечынь.

5

Як полымем буйным зоймецца рань,
Зьмяніўшы ночы спакой,
Я бачу свой вольны шырокі край
На тысячы вёрст вакол.

На тысячы вёрст неўгамоннай зямлі
Праз хмар дымавых рады,
Ўстаюць прада мною лагчыны, палі
І ўздыбленыя гарады.

'Шчэ (недзе далёка) цярусіцца змрок,
А тут, пад мільёны агней,
Ўзьмятаецца ўвысь гаманлівы гудок
І кліча мацней і мацней.

І з гэтым гудком машынны нястрым
Пачаў свой дзень перамог,
І недзе далёка пайшлі трактары
Араць у вясковых палёх.

Дзе гэтых палёў бяскрайны разгон,
Дзе гоман і рух вятроў,

Я чую гарачкавы пульс агонь
І вёсак, і гарадоў.

Такім шырокім вось—
З краю ў край,
На тысячы вёрст вакол—
Я бачу свой творчы вялікі край,
Свой край гарадоў і сёл.

Наперадзе—
Сонцаў гарыць мільён.
З дарогі—
Ні крок назад...
Далёка ад плыньні звычайных слоў
Да ўзнесеных энтузыяд.

Ў краіне,
Дзе крочыць на штурмы сталь,
Пад шолахі ніў і хвой,
Выпроствае песьня свой буйны стан
І поруч стаіць са мной.

Яна са мною заўжды...
Яна
З другімі—на штурмы,
Ў бой..
Расьце вялікіх гадоў сьцяна,
Я—толькі муляр на ёй.

Стаю вось... Крочу праз сьветлы май,
Праз восень і ветраў золь...
І сльлецца ў песьні шырокі край,
Край гарадоў і сёл.

І ў гэтай песьні, што б'е сама
З душы і з пахрумых дум—
— Як сьцяг
Узьнімаю тваё імя
І ў сэрца сваё кладу.

Лістапад 1930 г. Менск.

НАРЫСЫ

Тарас Хадкевіч

Гэроі нашых дзён

Над колгасам імя Сталіна нячутна, паціху апускаецца полаг вячэрняга змроку. Прыземістыя хаціны, ахутаныя сьнегавымі дыванамі, здаюцца яшчэ больш маляўнічымі, яшчэ больш чароўнымі, чым пры асьвятленьні строгага студзеньскага дня. Крывая вузкая вуліца раптоўна робіць завярот і таксама раптоўна скручваецца, заканчваецца, нібы ўдарыўшыся аб новыя сьцены дому праўленьня колгасу.

— Ну вось і канец нашаму вандраваньню,—цьвёрдым, упэўненым тонам заяўляе мне хурман, заварочваючы каня да стайні.—Заходзь адразу-ж на кватэру таварыша Антонава, сэкратара партыйнай ячэйкі, там знойдзеш сабе прытулак...

Вобмацкам адшукаўшы клямку, адчыняю першыя папаўшыя пад руку дзьверы. Яшчэ на парозе прыемна абвейвае хатняя цяплынь, асабліва прыемная пасьля пяцігадзіннага прабываньня на дваццаціградусным марозе. Прыгажэйшым і больш жаданым становіцца подых прытульнасьці сялянскай хаты.

Мяне сустракае высокі мужчына з хударлявым тварам і шэрымі ўпартымі вачыма. З яго плячэй зьвісае накінутая насьпех абветраная скураная куртка. Паношаная кепі ссоўваецца на патыліцу, і з-пад яе вырываюцца пасмы зблытаных цёмна-русых валасоў. Я называю сваё прозьвішча і кажу, чаго прыехаў у колгас імя Сталіна.

— Так. Вельмі добра... Антонаў. Дваццаціпяцітысячнік з Сормаўскага заводу,—паціскаючы маю руку, адказвае мне новы знаёмы.—Заходзь далей ды прысядзь, пакуль я ўзьніму перад жонкай пытаньне адносна малака ці гарбаты...

Застаўшыся адзін, аглядваю абстаноўку. Невялічкі пакой, сьцены якога абклеены газэтнай паперай, падобны хутчэй на канцэлярыю, чым на звычайную кватэру. Шырокі стол закіданы газэтамі, блянкамі, ведамасьцямі. Па сьценах, побач з портрэтамі правадыроў рэволюцыі, расклеены антырэлігійныя лёзунгі, плякат пра скарыстаньне торпу на ўгнаеньне, каляндар колгасных сходаў і занятка ў розных гурткоў. І неяк проста ня к месцу каля сталу прытуліліся пузатая канапа і крэсла, абітае зялёным аксамітам.

Ня гледзячы на прастату ўбраньня, пакойчык дыша прытульнасьцю і блізкасьцю. Адчуваецца адразу, што тут займаюцца свае людзі, жывуць такімі-ж, як і ты імкненьнямі і думкамі...

— Зараз вось і гарбата будзе,— перабівае мае назіраньні таварыш Антонаў і папраўляе блакітны абажур на лямпе, напэўна прывезенай яшчэ ім з заводу.—Значыцца, гаворыш, прыехаў пазнаёміцца з нашым жыцьцём. Вельмі добра. І табе карысна і нам дапаможаш чым-колечы. Ды і падзівіцца тут ёсьць на што. Колгас вялікі, на паўтары тысячы гэктараў.

Маёмасьць даволі багатая. Два трактары маем, а гэта мала дзе зной-дзеш па другіх колгасах. І работа, не хвалячыся скажу, проста аж пеніцца. Пазаўчора вось здалі астатнія апрацаваныя лішкі ільно-валакна. Расквіталіся можна, сказаць, са ўсім і бярэмся за падрыхтоўку веснавой сяўбы...

Словы таварыша Антонава гучаць шчырасьцю і любоўю да іхняга зьместу. Пры гаворцы лёгка ўзварушваецца чарнявая шчаціна вусоў, і зірк іскрыцца ледзь прыкметнай мяккай ухмылкай. Нешта таварыскае, што прыцягвае да сябе, захоўвае гэты чалавек, які прыехаў па загаду бальшавіцкай партыі з заводу ад станка ў вёску на работу.

І. Ад варожасьці да ганаровай граматы

Да позьняе ночы за шклянкамі астыўшае ўжо гарбаты ідзе нашая гутарка. За сьценамі хаты, як рэха адзіночных стрэлаў, чуецца назойлівы марозны трэск, і ад гэтага яшчэ больш прытульнай і ветлівай здаецца кватэра сэкратара колгаснай партыйнай ячэйкі. З-пад блакітнага абажура ласкава разьліваецца па пакоі сьвятло, а таварыш Антонаў, абмаляваўшы становішча і пэрспэктывы колгасу, апавядае пра сябе, стараючыся як мага скараціцца і пазбавіцца ад выпукленьня сваіх чыста асабістых рысак.

— Прыехаў, разумееш ты, увясну я сюды. Глуш такая, далячынь ад чыгункі. Пасьля прывычнага шумлівага жыцьця заводу сумнавата стала. Шчыра кажучы, няпрывычным, чужым здалося ўсё наўкола. Толькі рашыў гэта я не паддавацца палахлівасьці і паніцы, а пільна ўзяцца за работу. Бо падумай сам, што сказала-б бюро завадзкога партколектыву, калі-б даведалася, што я ня выканаў ускладзеных на мяне абавязкаў...

Колгас мізэрны: 9 гаспадарак было ўсяго. Навокал кулаччо зьвіло сабе савінае гняздо і арудуе, настройваючы на свой лад сераднякоў, хоць ты гвалт крычы. Кулацкія агенты нават мой прыезд скарысталі для сваіх інтарэсаў і шалёнай агітацыі. Па ваколіцах чуткі розныя пусьцілі:

„Гарадзкі комуніст прыехаў. Сьцеражэцеся. Сілай колгасы будзе арганізоўваць. Міліцыю на дапамогу пазаве. Адбяруць усё, абагуляць да апошняй кашулі на целе".

І спачатку ўдалося ім узьняць сярод сялян варожасьць да мяне. Бывала зайду да якога серадняка купіць масла для сям'і. Не дае, хоць ты яму трайную цэну вызначай. У час правадзімых сялянскіх сходаў, калі я загавару, маўчаць усе і як загнаныя ваўкі азіраюцца па бакох. Дайшло да таго, што мне пагражаючыя пісулькі пачалі падкідваць: „укатывайся, моў, пакуль цэлы, а то мы за сябе ня ручаемся"... Ніякавата, праўда, крыху было, ня то боязна, ня то крыўдна. Але што-ж паробіш. Партыя загадала, і пытаньне вычарпана...

Здружыўся я тады з дэмабілізаваным чырвонаармейцам Міколай Рындзюком і цяперашнім старшынёй колгасу Карчэнкай. Бачу: братва энэргічная, для супольнай работы якраз гадзяцца. Сумесна рашылі дзейнічаць. У дзень першай баразны мобілізавалі свае сілы. Мужчын малавата, прышлося браць на ворыва дзяўчат і ўсіх, хто хоць крыху трымаў ручкі плуга па-чалавечаму. Нашто ўжо я профан па гэтай справе, а і то выехаў на поле разам з другімі. Якраз была нядзеля. Сабралося каля гасьцінцу, дзе мы аралі, народу з усяе вёскі падзівіцца на колектыўную работу. Моладзь, настроеная кулакамі, жартуе, сьмяецца:

— Гы-гы-гы!.. Га-га-га!.. Глядзіце, вунь гарадзкі комуніст зямлю пераварачваць выехаў!..

— Гэй ты, комуніст, ня так плуг трымаеш!..

І пад градам такога роду кепікаў мы працавалі цэлы дзень. Працавалі, можно сказаць, па ўдарнаму, што называецца. Узьнялі даволі вялікі

кавалак зямлі, гэтым самым узьняўшы сваю бадзёрасьць і выставіўшы кулацкім агентам грандыёзную фігу. З першага-ж дню ўбачылі сяляне, што жыць колгас будзе і жыць дружна, колектыўна. Аж дзіву мы даліся, калі на другі дзень прыносіць маламоцны серадняк Марцін Кручка заяву ад пяці гаспадарак: „Хочам з вамі сумесна працаваць. Прыміце да свайго хаўрусу. Заўтра згодны выехаць на ворыва"... Прынялі. Сьледам за імі пасыпалася яшчэ больш заяў. Гэты момант мы і скарысталі. У суседніх вёсках пачалі праводзіць сялянскія сходы. Я павёў з сялянамі асабістыя гутаркі адносна колектывізацыі. Вынікі, брат, атрымаліся на вялікі палец. Расьлі нашыя колгасныя шэрагі ўсёроўна, як грыбы пасьля дажджу.

Ну а далей сам разумееш, пачалася самая гарачая колгасная работа, правядзеньне ўсялякіх такіх мерапрыемстваў. Скончылі веснавую сяўбу, узяліся за будаўніцтва, адбудавалі гэты самы будынак, дзе зьмясьцілі шэсьць сем'яў. Тым часам падасьпела ўборка, асеньняя пасеўная кампанія. Словам, работы хапала па самае горла. І тым часам я урываў час і на культурна-масавае выхаваньне колгасьнікаў. Арганізавалі з чатырох членаў і пяці кандыдатаў партыйную ячэйку, узварушылі комсамольцаў, абсталявалі хату-чытальню. Я сам праводзіў чытку газэт, гутаркі на політычныя тэмы, скарыстоўваючы кожную хвіліну на гэтае.

І вышла ведаеш так, што на вечары, прысьвечаным дню ўраджаю і колектывізацыі, калі прэм'явалі лепшых ударнікаў колгасу, той самы былы серадняк Рузкевіч, які калісьці не хацеў прадаць мне масла, унёс прапанову вынесьці мне ў якасьці прэміі ганаровую грамату ад колгасьнікаў. І вынесьлі, ды яшчэ з якім форсам, з якімі воплескамі. Адносна воплескаў дык напэўна пастараўся Мікола Рындзюк, які ўсюды пасьпявае са сваімі штукамі. Такі ўжо ад прыроды...

...Антонаў змоўк. Скруціў тоўстую махорачную цыгарку, зацягнуўся дымам, яшчэ раз паправіў абажур на лямпе і з ухмылкай ізноў зьвярнуўся да мяне:

— Хіба-ж раскажаш усё! Давай на сёньня скончым ды адпачнем, а заўтра сам агледзіш тое, што мы нажылі сваім колектывам...

2. Спадчына чырвонай коньніцы

Пра кавалкі жыцьцёвай гісторыі Міколы Рындзюка, дэмобілізаванага чырвонаармейца, расказваў мне сэкратар колгаснай комсамольскай ячэйкі, шырокаплечы прыземісты хлопец, празваны чамусьці Пяньком.

У чытальні пасьля паседжаньня комсамольскага бюро панавала сьпёртае паветра, дым ад дзесяткаў выкураных цыгарак плаваў цэлымі воблакамі пад стольлю. Комсамольцы разыходзіліся з такім-жа шумам, як і прыходзілі сюды на паседжаньне. З вуліцы даносіўся бесьперапынны малады сьмех, гутаркі, жарты. Я-ж і Пянёк, яшчэ больш папаўняючы чытальню клубкамі махорачнага дыму, гутарылі пра комсамольскую работу сярод колгаснай моладзі. Пянёк успамінаў гісторыю комсамольскай ячэйкі, нацягнута моршчыў лоб, з цяжкасьцю падбіраў патрэбныя словы...

— Значыцца, завялася такая буза? Запілі хлопцы?—дапамагаў я Пяньку.

— Але. Хадзілі на вечарынкі, верхаводзілі там, як хацелі, выпіўшы добра. Нават такі выпадак быў, што член бюро Янук Рыгораў набіў хлопца за дзяўчыну, павыбіваў вокны п'яны, разагнаў вечарынку. Узгрэлі мы яго, але хіба гэтым пытаньне вычэрпвалася? Карацей гаворачы, работа нашай ячэйкі, якая была раней лепшай па ўсяму раёну, заняпадала, выходзіла з гэраічных традыцый. Вёў я барацьбу з гэтымі ганебнымі хібамі, ды нешта ня выходзіла як сьлед: малады яшчэ быў і як комсамолец і наогул.

І як на маё шчасьце прыяжджае гэта з арміі Мікола Рындзюк. У шынэлі

з сінімі нашыўкамі, шлем на галаве гэткім фасонам трымаецца. Зусім не такі Мікола, якім мы яго праводзілі два гады таму назад у армію. Вырас, пасталеў, папрыгажэў.—„Кавалерысты я,—кажа,—будзённавец, гэта вам ня хунт ізюму". Прагаварылі мы з ім цэлы вечар, ён мне расказаў пра Чырвоную армію, а я яму пра становішча комсамольскай ячэйкі. Паслухаў ён мяне ды як раззлуецца: „Ну і прахвост-жа ты, Мацей, да чаго дапусціў ячэйку. Другія комсамольцы колгасы організоўваюць, гэта значыць ажыццяўляюць генэральную лінію партыі, а вы п'янкай займаецеся, самі разлагаецеся і моладзь разлагаеце. Нікуды не гадзіцца такая справа"...

„Гаворыш-то ты, Мікола, добра,—думаю гэта я,—а вось паспрабуй, наладзь работу, тады я тваім словам паверу". І сапраўды ўзяўся Мікола, ды так узяўся, што аж я зьдзівіўся. Склікаем сход комсамольскай ячэйкі. Мікола трымае прамову. Навучыўся гаварыць ліха яго матары так цікава, так жыва, што нават любы гарадзкі агітатар ня лепш за яго скажа. Як задаў ён нашым хлопцам, як задаў: „Вы,—кажа,—сваімі паводзінамі толькі ганьбіце комсамол, падрываеце яго аўторытэт. Даўно ад вас, хлопцы, час было адабраць комсамольскія білеты, бо вы страцілі ранейшую энэргію на танцулькі, на гарэлку, на бойкі. Я стаўлю пытаньне рашуча: альбо давайце па-бальшавіцку весьці працу, альбо выключым палову ячэйкі з комсамолу. Нам б ляст не патрэбен"...

Адразу пацішэлі хлопцы. Пачалі праводзіць рэгулярна комсамольскія сходы, пачалі зьбірацца да Міколы. Доўгімі зімовымі вечарамі супольна абгаварвалі мы плян організацыі колгасу. Заняліся падрыхтоўкай. І больш усяго бегаў і клапаціўся Мікола. І выходзіла ўся ягоная работа сапраўды па-кавалерыйску, з націскам, разумееш, з хуткасьцю, з упартасьцю. Ня гледзячы на ўсялякія такія перашкоды з боку кулацкай гідры, справа з колгасам выйграла. Гісторыю організацыі колгасу ты напэўна ўжо ведаеш, так што ня цікава паўтарацца яшчэ раз.

У колгасе таксама некалі было драмаць. Ад нас, комсамольцаў, патрабавалася асаблівая энэргія. І організатарам гэтай маладой энэргіі зьяўляўся Мікола. Прыкладам, раней з нас ніхто ня чуў пра нейкія там ударныя брыгады, пра соцыялістычнае спаборніцтва. Мікола-ж сумеў гэтыя мэтады прымяніць сярод колгаснікаў. Спачатку організавалі дзьве комсамольскія ўдарныя брыгады, заключылі паміж імі дагавор на спаборніцтва, завялі спэцыяльную дошку, на якой адзначалі лепшых па рабоце і хужэйшых комсамольцаў. Потым прыцягнулі да гэтай справы ўсіх колгасьнікаў. Атрымалася так, што на сёньняшні дзень увесь наш колгас складаецца з ударных рабочых брыгад па розных галінах. У насьценгазэце і на дошцы спаборніцтва ты ўбачыш конкрэтныя вынікі такога разьмеркаваньня.

Фактычна ўсім гэтым кіраваў і кіруе Мікола. У яго заўсёды справа ідзе па-кавалерыйску. Там, напрыклад, дзе па пляну работа разьлічваецца на тыдзень, Мікола звычайна організоўвае і заканчвае яе за чатыры дні. Такіх прыкладаў колькі хочаш, і мы, комсамольцы-колгасьнікі, можам ганарыцца імі.

Шкада вось толькі, што зараз няма Міколы. Ты сам пагаварыў-бы з ім. Цікавы такі і спрытны хлапчына, краса і гонар нашай партыйна-комсамольскай організацыі. Ён паехаў на курсы трактарыстаў. „Люблю—кажа—трактарызацыю, ліха ведае як люблю. Здаецца, няма на сьвеце лепшых адчуваньняў, калі едзеш на трактары і лемяхамі глыбока ўзорваеш межы, зьнішчаючы іх назаўсёды". Цераз пару тыдняў напэўна павінен ён зьвярнуцца з гораду...

...Сэкратар комсамольскай ячэйкі сам захапіўся сваім апавяданьнем і, скончыўшы пра дэмобілізаванага чырвонаармейца Міколу Рындзюка, яшчэ доўга, доўга расказваў мне асобныя эпізоды з колгаснага жыцьця,

асобныя эпізоды клясавай барацьбы на вёсцы, асабліва падкрэсьліваючы ролю комсамольскай арганізацыі пры разгортваньні колгаснага будаўніцтва. І калі прасьпявалі другія пеўні, выходзячы са мной з чытальні, Пянёк яшчэ раз зазначыў:

— Дык ты абавязкова пазнаёмся з Рындзюком. Во дзе прыклад сапраўднага комсамольца, хоць цяпер ён ужо і член партыі...

3. Выхад знойдзены, і перамога наша

— Ну і прыстаў-жа ты да мяне, па праўдзе кажучы, як банны ліст да мяккага месца,—скрозь рыжаватыя вусы ўхмыляўся старшыня колгасу імя Сталіна тав. Карчэнка.—Які табе інтарэс да таго, як я жыў раней?..

Карчэнка, толькі што аддаўшы гаспадарчыя загады рахункаводу, сядзеў за невялічкім, нічым не пакрытым столікам пад надпісам на сьцяне: „старшыня праўленьня“ і пранізваў мяне наскрозь шэрымі хітраватымі вачыма. Ад моцна складзенай постаці гэтага чалавека павявала ўрадлівай зямлёй і бязьмежжам палявых абшараў. Карчэнка нават з надворнага боку выглядаў тыпічным хлебаробам з крывёй і мазалямі селяніна, продкі якога і ён сам спрадвеку варочалі сахой глебу, цярпліва пераносячы цяжкасьці і змагаючыся за сваё існаваньне.

— Ды не, дзядзька Карчэнка,— апраўдваўся я,—раскажы хоць пару якіх кавалкаў са свайго жыцьця. Для мяне, напрыклад, гэта вельмі цікава...

— Ну ладна, ліха з табой, такім цябе ўжо маці нарадзіла неадвязным,—усё хочаш ведаць. Раскажу табе тры выпадкі, якія, па-мойму, перавярнулі ўсё маё мужыцкае нутро дагары нагамі.

Першы выпадак здарыўся, калі мне было дванаццаць гадоў. Мой бацька з гэтай-жа самай вёскі меў 5 дзесяцін зямлі на восем едакоў, і з горам папалам перабіваўся вадой і хлебам ад ураджаю да ўраджаю. У 1906 годзе, дачуўшыся аб рэволюцыі, нашыя сяльчане першай справай паехалі сеч панскі лес. Першыя два самавольныя выезды прайшлі больш-менш удала. На трэці-ж раз нечакана з мястэчка прывалілі стражнікі пад кіраўніцтвам уладара гэтага лесу самога пана Катлера. Сяльчане не жадалі слухацца стражнікаў. Асабліва мой бацька пачаў спрачацца. Грубай мужыцкай мовай загаварыў ён пра зямлю, пра волю, пра панскія зьдзекі, у павятовым горадзе напэўна наслухаўшыся пра ўсё гэтае. І вось за гэтыя словы бацьку пан Катлер застрэліў тут-жа на месцы.

Тады я ўжо сваёй дзіцячай натурай зразумеў, што сьвет пабудаваны ненармальна, што паміж багатымі і беднымі вялікая прорва і што з гэткім жыцьцём нельга ніяк мірыцца.

Другое ліха мяне спаткала, калі падышла грамадзянская вайна. Белапольскія лігіянэры захапілі гэтую самую вёску, дзе я жыў, маючы сваю хатку, каня, дзьве каровы і 5 душ сям'і. Загадзя з другімі аднавяскоўцамі, захапіўшы каня, кароў і абразанку на ўсякі выпадак, выехаў я з вёскі ня столькі для супраціўленьня белапалякам, колькі для захаваньня сваей найдаражэйшай маёмасьці сярод лесу. Цераз тыдзень, калі адыйшлі белапалякі, зьвярнуўшыся з лесу, замест сваёй вёскі я ўбачыў папялішча. Усё было зьнішчана, нават ад сям'і засталася толькі адна пяцігадовая дачка.

Прышлося брацца за пачатак новага жыцьця, ня маючы, як кажуць, ні кала, ні двара. Некалькі гадоў хадзіў я па вёсках парабкам, зарабляў грошы, пераносячы кулацкі націск на сваім жа карку і потым ужо, дзякуючы савецкай уладзе, займеў кавалак зямлі, пабудаваў уласную хаціну. Захацелася зрабіцца нарэшце самастойным гаспадаром, каб не залежаць ні ад каго і не падпарадкоўвацца нікому. Але-ж хіба жаданьне заўсёды ажыцьцяўляецца на справе. Тая ж самая бядняцкая доля хадзіла за мною сьледам. Хлеба не хапала, сілы не

хапала, зямля ня ўгнойвалася і ўсё больш і больш пуставала. Бязвыходнае становішча...

І тады падвярнуўся трэці выпадак, толькі зусім ужо інакшы. Аднойчы пазнаёміўся я на местачковым кірмашы з старшынёй адзінага ў нашым раёне колгасу імя Кастрычніка. Запрасіў ён мяне да сябе, пазнаёміў з жыццём колгасьнікаў, расказаў пра колектывізацыю, і тады п оста-ткі па інакшаму адчыніліся мае вочы. „Во дзе, — падумаў я — знойдзеш сабе ты, Хвядос, выхад. Во дзе чалавек ведае, чаго дабіваецца...

З таго часу якраз і нарадзілася думка аб організацыі колгасу з сяльчан маёй вёскі. І організавалі, як бачыш, інакш ня быў-бы я членам партыі Здаволены цяпер я: выхад знойдзены, і нашая перамога забясьпечана. Мне ўжо каля 40 гадоў. Шмат нягод і бяды перанёс я. Але тут, працуючы супольна, ад уваю зусім, здаецца, маладую сілу і моц. Ведаю добра. чаго дабіваемся і чаго можна дабіцца...

..Карчэнка раптам спыніўся, задумёна нахмурыўся і потым раптоўна схамянуўся:

— Ах ты чорт тра ка не забыў. Скажы, Лявон, — зьвярнуўся ён да ра хункавода, — старэйшаму брыгадзіру каб той заўтра ж накіраваў ільнапрацоўчую машыну жырдзінскім сялянам. Прасілі яны...

Я глядзеў і дзівіўся з Карчэнкі: ці-ж ня гэта сапраўдны тып колгасьніка, адданага цалкам сваёй ідэі і сваёй гэраічнай справе.

* * *

Выяжджаў я з колгасу імя Сталіна цераз чатыры дні, здаволены наведваньнем і апавіты бадзёрым настроем. Рыпелі палазы санак на марознай прыбітай дарозе, колгасны гняды конь весела і жвава ўзмахваў галавой, а я раздумваў над цікавай стрэчай з трыма людзьмі, гэтымі гэроямі нашых дзён.

Сапраўды ідэальнае супадзеньне, якое сустракаецца па многіх колгасах.. Рабочы, чырвонаармеец, селянін... Людзі, прасякнутыя аднымі мэтамі, аднымі імкненьнямі, жадаючыя зрабіць з краіны дзівосны колгас, называемы соцыялізмам.

Так. Гэта гэроі, гэроі, на якіх трымаецца моц соцыялістычнае краіны.

КРЫТЫКА

Л. Бэндэ

Пра нядаўняе мінулае Беларускай контррэволюцыі

Каб зразумець сучасную контррэволюцыйную чыннасьць Лёсікаў, Цьвікевічаў, Некрашэвічаў, Ластоўскіх, трэба зьвярнуцца да іх нядаўняга мінулага, паглядзець на пачатак „міністэрскіх кар'ер". Кастрычнікавая рэволюцыя, як рэволюцыя пролетарская, соцыялістычная ў сваім пераможным руху зьнішчала адну эксплёататарскую клясу за другою, заклала падмурак для зьнішчэньня кляс наогул.

А гэта азначала, што соцыялістычная рэволюцыя вызваліла працоўныя масы ад усіх форм клясавага ўціску, у тым ліку і ад нацыянальнага.

Ва ўмовах Беларусі гэта конкрэтна азначае вызваленьне працоўных мас ад эксплёатацыі памешчыкаў, капіталістаў, кулакоў усіх нацый, вызваленьне ад векавога нацыянальнага прыгнечаньня.

Мэты і задачы пролетарскай рэволюцыі ажыцьцяўляюцца ня толькі праз зьнішчэньне клясы эксплёататараў былой пануючай расійскай нацыі, але пролетарская рэволюцыя адначасова зьнішчае і беларускую эксплёататарскую (як і інш.) клясу, клясу, якая ва ўмовах царызму, ва ўмовах нацыянальнага прыгнёчаньня часамі выстаўляла свае нацыянальныя патрабаваньні, гаварыла пра „нацыянальнае вызваленьне".

Праўда, беларуская буржуазія, выстаўляючы свае нацыянальныя патрабаваньні, патрабуючы нацыянальнага „вызваленьня", разумела гэтае нацыянальнае вызваленьне „крыху" інакш, чымся гэта разумелі рабочыя і сялянe Беларусі. Для рабочых і працоўных сялян Беларусі вызваленьне з-пад эксплёатацыі капіталістаў, кулакоў і памешчыкаў без разбору нацый, азначала дначасова вызваленьне і ад нацыянальнага прыгнечаньня.

За вызваленьне ад сваіх эксплёататараў, да якой-бы яны нацыі ні належалі, і вядуць барацьбу рабочыя Беларусі, а разам з рабочымі, пад іх кіраўніцтвам, і бядней шае сялянства. А гэтая іх барацьба, ёсьць адначасова і барацьба за нацыянальнае вызваленьне.

Канчатковай мэтаю барацьбы рабочае клясы зьяўляецца канчатковае зьнішчэньне кляс, пабудова комуністычнага грамадзтва.

Нацыянальнае вызваленьне для беларускай буржуазіі, для беларускага абшарніка, што ператвараўся ў капіталіста, азначала стварэньне такіх палітычных і экономічных умоў, пры якіх-бы вынікі эксплёатацыі працоўных мас Беларусі цалкам і непадзельна даставаліся ў карысьць беларускіх эксплёататараў.

Ідэолёгі беларускіх капіталістаў і кулакоў, іх адданыя прыслугачы, беларускія нацыянал-дэмократы „адраджэнцы", затушоўвалі нацыянальным сьцягам сапраўдную клясавую сутнасьць мэтаімкненьняў эксплёатата-

раў, прагнулі падпарадкаваць буржуазным мэтам сапраўды рэволюцыйны, нацыянальна-вызваленчы рух рабочых і сялян Беларусі.

Аднак, ня гледзячы на тое, што беларуская буржуазія ня была дзяржаўна пануючай клясай, ня гледзячы на тое, што расійская і польская буржуазія, расійскія і польскія памешчыкі ня горш за беларускіх капіталістаў і памешчыкаў рабавалі працоўныя масы,—ня гледзячы на гэта беларуская буржуазія і яе ідэолёгі—Лёсікі, Ластоўскія, Некрашевічы—ня здольны былі паклікаць працоўныя масы на барацьбу за самастойную беларускую дзяржаўнасьць, а тым больш павесьці гэтыя масы на барацьбу.

Прычынай гэтаму зьяўляецца тая ступень разьвіцьця пролетарскага руху, самавызначэньне пролетарыяту як клясы са сваімі ярка акрэсьленымі мэтамі, са сваімі мэтодамі барацьбы, якія ўпяршыню былі выпрабаваны ў рэволюцыі 1905 г.

Пролетарскі рух якой-небудзь краіны накіроўваецца ня толькі супроць эксплёататараў іншанацыянальных, а ён накіроўваецца супроць эксплёататарскіх кляс, да якой-бы яны нацыі ні належалі, супроць клясавага прыгнечаньня ва ўсіх яго формах, г. зн. і супроць нацыянальнага прыгнечаньня.

Беларуская буржуазія, якая асабліва інтэнсыўна ўзрастала пасьля рэволюцыі 1905 г., побач з інтэнсыўнымі процэсамі клясавай дыфэрэнцыяцыі беларускай нацыі, побач з нарастаючым рэволюцыйным рухам рабочае клясы і сялянства, не магла ставіць стаўку на рэволюцыйныя мэтоды барацьбы супроць самаўладзтва, бо яна (буржуазія) баялася рабочае клясы больш, чым самаўладзтва. Уся барацьба беларускай буржуазіі супроць самаўладзтва абмяжоўвалася „імкненьнямі" ды „патрабаваньнямі".

Як сама беларуская буржуазія, так і яе ідэолёгі не маглі ставіць стаўку на шырокія рэволюцыйныя працоўныя масы Беларусіі яшчэ і таму, што гэтыя працоўныя масы, пад кіраўніцтвам пролетарыяту, самастойна змагаліся за свае клясавыя інтэрэсы ў першую чаргу супроць „сваёй" буржуазіі.

Лютаўская рэволюцыя, у выніку якой было зьнішчана самаўладзтва, здавалася-б, давала шырокую магчымасьць для беларускай буржуазіі і яе ідэолёгаў разгарнуць барацьбу за незалежную беларускую дзяржаўнасьць. Аднак клясавыя інтэрэсы беларускай буржуазіі, боязкасьць пролетарыяту і працоўных мас вызначылі другую позыцыю беларускай буржуазіі. Яна не дамагалася незалежнасьці, самастойнасьці, а прасіла ў часовага буржуазнага ўраду толькі аўтономіі. І гэта зусім натуральна. Беларуская буржуазія бачыла ў асобе расійскай буржуазіі і яе ўраду не свайго клясавага ворага, а мацнейшага саюзьніка, на якога можна абаперціся, вядучы барацьбу супроць рабочае клясы.

Шго гэта так,—сам Цьвікевіч пацьвярждае ў сваім выступленьні на зьезьдзе беларускіх партый і арганізацый (8—10 ліпеня) у 1917 годзе.

„Беларускай Рады быць ня можа,—кажа Цьвікевіч,—бо мы занадта бедны сіламі. З Украінай нас раўняць нельга... нельга захоплівать законадаўчыя функцыі". Таму „сэпаратызму ў беларусаў няма, мы хочам толькі дапамагчы Расіі... Каб Расія была моцнаю", што тычыцца Беларусі, дык ёй „патрэбна толькі тэрыторыяльная гаспадарчая аўтономія" („Вольная Беларусь", № 10, 1917 г.).

Праўда, контррэволюцыйны капіталістычна-памешчыцкі часовы расійскі ўрад ня даў Беларусі нават і такой „тэрыторыяльна-гаспадарчай аўтономіі". Мацнейшыя браты беларускай буржуазіі і памешчыкаў расійскія капіталісты і памешчыкі ня лічыліся асабліва з „патрэбамі" сваіх слабейшых братоў. Расійскія капіталісты і памешчыкі лічыліся толькі з сілай, яны лічылі правамоцнымі толькі тыя патрабваньні, якія падмацоўваліся рэальнай узброенай сілай.

Але-ж беларуская буржуазія і яе апосталы, нацыянал-дэмократы, такой сілы ня мелі, уся сіла іх складалася з іх саміх плюс чыста нацыяналістычная

інтэлігенцыя, плюс кулацтва ды крамнікі, а дзьве апошнія катэгорыі ня менш сымпатызавалі „моцнаму" часоваму ўраду, чым Цьвікевічы, Лёсікі ды іншыя „апосталы". Што-ж тычыцца сапраўды рэальнай сілы,—беларускіх рабочых і сялян, дык яны разам з рабочымі і сялянамі Расіі і Украіны пад бальшавіцкімі лёзунгамі змагаліся за свае клясавыя інтэрэсы, са зброяй у руках, як супроць расійскіх капіталістаў і памешчыкаў, так і супроць беларускіх іх братоў.

З гэтай прычыны беларуская буржуазія і яе ідэолёгі маглі абапірацца толькі на „вялікую моральную сілу", якая дыктавала ім патрэбу згінаць свае эластычныя сьпіны перад мацнейшымі братамі, расійскімі капіталістамі і памешчыкамі.

Непазбаўлены цікавасьці такі гістарычны факт, які кідае досыць яркі прамень сьвятла на твар беларускіх нацыяналістых.

Беларускія нацыяналісты ў 1917 г. паслалі сваю дэлегацыю ў часовы расійскі капіталістычна-памешчыцкі ўрад прасіць, каб часовы ўрад даў для Беларусі аўтономію.

Дэлегацыя бадзялася значны час, абхадзіла амаль усіх міністраў часовага ўраду, упрашвала, каб яе прынялі і выслухалі. Нарэшце, дэлегацыя „мела гонар" быць прынятай таварышам міністра ўнутраных спраў Леонавым.

Вось што расказвае прыехаўшы з Петраграду член гэтай дэлегацыі Аляксюк: „Былі ў тав. міністра ўнутраных спраў Леонава. Той адразу запытаўся, якая рэальная сіла стаіць за дэлегацыяй? Дэлегацыя пачала гаварыць, што за ёю стаіць вялікае моральная сіла, але гэта, як відаць было, уражаньня на яго не зрабіла ніякага".

Зьяўляючыся клясавым ворагам для „рэальнай сілы" рабочых і сялян Беларусі, беларускія нацыянал-дэмократы бездапаможны былі дасягнуць нават аўтономіі. Але-ж згінаючы свае прывыклыя сьпіны перад міністрамі часовага ўраду, беларуская буржуазія праз сваіх ідэолёгаў Лёсікаў ды К-о атручвала нацыяналістычнай атрутай клясавую сьвядомасьць рабочых і сялян Беларусі, прагнула разьбіць адзіны рэволюцыйны фронт працоўных мас Беларусі і Расіі, якія змагаліся пад бальшавіцкімі сьцягамі.

Ідэолёгі беларускай буржуазіі даводзілі працоўным масам Беларусі „што народ мы асобны, не падобны ні да расійцаў, ні да палякаў, а значыцца, і патрэбы ў нас асобныя, свае, беларускія, адметныя і нават нязгодныя з патрэбамі расійцаў або палякаў, ці якога іншага народу" (Лёсік).

Аднак не зважаючы на гэтыя даводы ідэолёгаў беларускай буржуазіі, працоўныя масы Беларусі са зброяй у руках давялі адваротнае, іменна: адзінства інтэрэсаў і патрэб працоўных: і беларусаў, і расійцаў, і палякаў. Незважаючы на контррэволюцыйную нацыяналістычную агітацыю, якую праводзілі беларускія нацыяналісты па гарадох і вёсках Беларусі, працоўныя масы Беларусі, пад кіраўніцтвам пролетарыяту, разам, у саюзе з працоўнымі масамі расійскай, польскай, украінскай ды інш. нацый, пераможна ішлі да Кастрычніка.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі рабочая кляса, пры дапамозе бядней-шага сялянства, зрабіла рэволюцыю, павыганяла капіталістых, памешчыкаў, разьбіла ланцугі нацыянальнага ўціску, стварыла ўмовы для сапраўднага самастойнага палітычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва раней прыгнечаных народаў.

Але-ж соцыялістычная рэволюцыя азначала экспропрыяцыю і беларускай буржуазіі, кулацтва і абшарнікаў.

Рэволюцыя паказала працоўным масам Беларусі, што інтэрэсы беларускай буржуазіі, адзіныя з інтэрэсамі буржуазіі іншых нацый, калі справа ідзе аб уласнасьці, аб панаваньні і прывілеях. І не давялося доўга чакаць пацьверджаньня гэтага палажэньня з боку беларускай буржуазіі.

На другі-ж дзень пасьля захопу рабочымі, пры дапамозе сялянства, улады, беларуская буржуазія, разам са сваімі ідэолёгамі і дробна-буржу-

азнымі падпяваламі тыпу Бядулі, Купалы ды інш., распачала актыўную вайну супроць рабочых і сялян, аб'ядналася разам з буржуазіяй, манархічна-чорнасоценным элемэнтам усіх нацый.

Контррэволюцыйная чыннасьць беларускай буржуазіі і нацыянал-дэмократаў напярэдадні Кастрычніка концэнтравалася, галоўным чынам, у так званай „Вышэйшай" ці „Вялікай беларускай радзе" і ў так званай „Вайсковай беларускай радзе". Пасьля пераходу ўлады ў рукі рабочае клясы беларуская контррэволюцыя не абмяжоўваецца ўжо толькі контррэволюцыйнай агітацыяй, яна спрабуе арганізавацца для ўзброенае барацьбы супроць пролетарскай дыктатуры. У сьнежні месяцы 1917 г. склікаецца беларускі контррэволюцыйны конгрэс, які быў разагнаны савецкаю ўладаю.

Гэты разагнаны контррэволюцыйны конгрэс вылучыў з сябе „Беларускую раду", якая потым абвясьціла Беларусь „Незалежнай народнай рэспублікай". Навокал гэтай рады пасьля і концэнтравалася контррэволюцыйная чыннасьць беларускай контррэволюцыі.

Перш чым разглядаць дзейнасьць беларускай контррэволюцыі пасьля Кастрычніка, мы зьвернем увагу чытача на той факт, што лёзунг „незалежнасьць Беларусі" беларуская буржуазія разам са сваімі ідэолёгамі выкінула ўжо пасьля Кастрычніка, як лёзунг які аб'яднаў увесь контррэволюцыйны элемэнт на Беларусі. Калі ўлада ў Расіі знаходзілася ў руках часовага контррэволюцыйнага ўраду, беларуская буржуазія і яе ідэолёгі нацыянал-дэмократы прасілі аўтономію і абяцалі „рабіць усё магчымае, каб Расія была моцнаю", а калі ўлада ў Расіі і на Беларусі перайшла ў рукі рабочае клясы і бяднейшага сялянства, дык беларуская контррэволюцыйная „дэмократыя", у ногу з сваімі колегамі, украінскай, расійскай ды інш. контррэволюцыяй, пачалі змагацца за „незалежнасьць Беларусі", разумеючы незалежнасьць ад рэволюцыйнай Расіі, ад рабочых і сялян.

Гэты момант лішні раз паказвае сапраўды контррэволюцыйны твар беларускага нацыянал-дэмократызму.

Весьці самастойную барацьбу супроць рабочых і сялян, супроць савецкай улады беларуская контррэволюцыя не магла, таму што яна ня мела для гэтага сілы. Рабочыя і бядняцка-серадняцкае сялянства Беларусі не магло падтрымліваць і не падтрымлівала буржуазна-нацыяналістычныя імкненьні, а рабочыя і сялянства самі змагаліся, як гаварылася ўжо вышэй, супроць буржуазіі, супроць памешчыкаў і кулакоў пад сьцягамі бальшавіцкай партыі.

Тая-ж кучка контррэволюцыйных элемэнтаў буржуазіі і нацыянал-дэмократаў, частка нацыяналістычнай інтэлігенцыі ды кулацкі элемэнт не зьяўлялася такой сілай каб супроць паставіцца рабочым і бяднейшаму сялянству Расіі і Беларусі.

Адкуль-жа ўзяць сілу беларуская контррэволюцыя? Яна перш за ўсё праз сваю раду ды іншыя свае арганізацыі аб'яднала ў адно контррэволюцыйнае цэлае ўвесь контррэволюцыйны элемэнт на Беларусі. Навакол рады, навакол лёзунгу „незалежная Беларусь" аб'ядналіся рознанацыянальныя, з рознай політычнай орыентацыяй контррэволюцыйныя элемэнты. У шэрагах „незалежнікаў" можна было сустрэць, побач са „шчырымі беларусамі", ярка акрэсьленыя вялікарасійскія монархічныя элемэнты, полёнафільскія, папоўскія, клерыкальныя, яўрэйскія буржуазныя і дробнабуржуазныя элемэнты, і розных авантурыстых, прахадзімцаў і іншых „чорных лыцараў".

Але-ж гэтай „гвардыі", якая сабрана пад „штандар бел-чырвона-белы" было недастаткова, каб спыніць пераможны рух пролетарскай рэволюцыі. Беларуская буржуазія, праз сваіх ідэолёгаў Лёсікаў і К-о заснаваўшы „БНР", застаўшыся без народу, пазбаўленая ўсякай падтрымкі з боку рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас, каб абараняць сваю ўласнасьць, свае прывілеі, свае правы на эксплёатацыю рабочых

сялян, кідалася ў ногі чужаземнай буржуазіі, окупантам, упрашвала, каб яны выратавалі іх ад „бальшавіцкіх забаваньняў".

Апрануўшы на фракі і сурдуты беларускую сярмягу, пачапіўшы гальштук на вышываную кашулю, г. зн. апрануўшыся ў вопратку „прадстаўнікоў беларускага народу" бэнээраўцы незалежнікі ў імя „незалежнасьці", ішлі насустрэч нямецкім окупантам, віталі прыход нямецкага войска, якое

„збавіць ужо нас
ад ліхіх ворагаў—
бальшавікоў".

Рада афіцыйна зварочвалася тэлеграмай да крывавага кайзэра, імпэратара Нямеччыны Вільгельма II, якою „дэмократы" запэўнівалі монарха ў адданасьці сваёй і бачылі культурны і гаспадарчы росквіт Беларусі толькі пад протэкторатам буржуазнай Нямеччыны.

Калі-ж зьявілася окупацыйнае нямецкае войска на чале з камандуючым генэралам Фальхангэймам, дык міністры „народнай рэспублікі" Лёсікі, Варонкі, Зайцы, Аляксюкі ды іншыя „лыцары беларускага народу" абівалі парогі генэральскай рэзыдэнцыі, прыносілі падзякі „ад імя беларускага народу", ад імя таго народу, які крывёю быў заліты, таго народу, які нямецкімі окупантамі абіраўся да нітачкі.

Дапамагаючы як мага окупантам забаваць беларускія багацьці, а за гэта атрымліваючы грошы ад сваіх гаспадароў, нацыянал-дэмократы працягвалі праз свой друк, праз вусную агітацыю пускаць нацыяналістычную атруту ў народныя гушчы. Але яшчэ раз пераканаўшыся ў „надзвычайным посьпеху", пераканаўшыся, што рабочыя і сяляне іх не падтрымліваюць, „Рада БНР", побач з адданай службай нямецкім окупантам, замацоўвала і пашырала свае сувязі з рознага роду контррэволюцыйнымі бандамі на Украіне, заігрывала са скарападчынай, атрымлівала і адтуль грошы для сваёй контррэволюцыйнай дзейнасьці.

Разам з гэтым радаўцы ўмацоўвалі свае сувязі з літоўскай контррэволюцыйнай Тарыбай, якая таксама направа і налева гандлявала працоўнымі Літвы; пасылалі прывітаньні „часоваму ўраду паўднёва-усходняга саюзу", Дзянікіну ды іншым яго колегам на поўдні і прасілі адтуль дапамогу для барацьбы супроць бальшавізму.

Але-ж нашыя „дэмократы" з „БНР" не абмяжоўваюцца гэтым. Яны зварочваюцца да „яго апостальскай вялікасьці" монарха Аўстрыі, просячы ў яго прызнаньня і дапамогі. У сваёй „увярыцельнай грамаце" А. Цьвікевіч піша: „Беларускі ўрад і народ можа знайсьці ў Аўстрыі свайго натуральнага саюзьніка і апякуна ў тую трудную мінуту, якую перажывае наша краіна..." А крыху раней у тэй-жа „грамаце" сказана: „Беларусь заўсёды глядзела і глядзіць на Аўстрыю, як на Вялікую Славянскую Монархію, у якой жыцьцё славян выяўляецца ў найбольш падыходзячай форме і знаходзіць нацыянальнае прызнаньне".

У гэтай контррэволюцыйнай справе дзейнічалі не адна толькі беларуская буржуазія і памешчыкі, разам з буржуазіяй і памешчыкамі ня менш актыўна дзейнічалі і беларускія грамадаўцы і эсэры, якія сваю контррэволюцыйную дзейнасьць прыкрывалі „соцыялістычнай" вопраткай.

І гэта не выпадкова. Грамадаўцы, як і эсэры, зьяўляюцца ідэолёгамі, прадстаўнікамі дробнай буржуазіі, кулацтва і крамніка. Дробна-буржуазным партыям, ідэолёгам дробнай буржуазіі, неўласьціва рэальная самастойнасьць у барацьбе кляс, ня гледзячы на тое, што яны выабражаюць сябе ўзьнесенымі вышэй усякіх клясавых супярэчнасьцяй.

Яны ў моц сваёй дробна-буржуазнай прыроды няўхільна хістаюцца паміж дыктатурай буржуазіі і дыктатурай пролетарыяту.

„Мелкая буржуазия,—кажа Ленін,—неминуемо, неизбежно колебалась между диктатурой буржуазии... и диктатурой пролетариата, ибо ни на что самостоятельное мелкая буржуазия неспособна по коренным свойствам ее экономического положения".

А эканомічнае становішча дробнай буржуазіі такое, што, як кажа Ленін, яна „в жизни зависит от буржуазии, живя сама похозяйски, а не попролетарски (в смысле места в общественном производстве), и в образе мыслей она идет за буржуазией".

Праўда, калі пролетарыят сваёй героічнай барацьбой супроць буржуазіі разгарачыў глебу пад нагамі дробнай буржуазіі дык частка яе хіснулася ў бок пролетарыяту, а з гэтай прычыны частка ідэолёгаў дробнай буржуазіі грамадаўцаў пайшла за пролетарыятам у яго барацьбе супроць капіталістаў і памешчыкаў, і надалей праяўляючы сваю дробнабуржуазную няўстойлівасьць і бесхарактарнасьць. А гэтая няўстойлівасьць, бесхарактарнасьць, хісткасьць дробна-буржуазных элемэнтаў ва ўмовах вострай барацьбы пролетарыяту з буржуазіяй, заўсёды, насупрэч часамі сьвядомасьці носьбітаў гэтай дробна-буржуазнай няўстойлівасьці,— льле ваду на кола млыну буржуазіі.

Выкінутыя ў канцы 1918 г. пераможным рухам рэволюцыі з Менску, радаўцы працягвалі сваю контррэволюцыйную дзейнасьць далей. Пацярпеўшы паражэньне ў сваёй галоўнай стаўцы на нямецкі імпэрыялізм, нацыянал-дэмократы інтэнсыўна шукалі сабе новых гаспадароў, новых саюзьнікаў у ангельскіх ды французскіх інтэрвентах у польскіх панох, у царскіх генэралах.

Нацыянал - дэмократы заключалі згоды з саюзьніцкімі інтэрвэнцкімі войскамі, з дзянікінцамі, організоўвалі новы паход на гэты раз сусьветнага імпэрыялізму на Савецкую Беларусь і іншыя савецкія рэспублікі.

Беларуская буржуазія і яе ідэолёгі рады былі любому царскаму генэралу, любому чорнасоценцу, абы толькі ён прышоў і зьнішчыў Савецкую ўладу. Яны „былі-б рады, каб хоць і нэгры прышлі іх ратаваць," як зусім адкрыта і зусім правільна ў той час выказаў жаданьні беларускай контррэволюцыі адзін з ідэолёгаў контррэволюцыйнага гандляра З. Бядуля.

Нядоўга прышлося беларускім нацыянал - дэмократам чакаць прыходу новага выратавацеля, новага свайго гаспадара.

На Савецкую Беларусь ішла белапольская навала, якая накроўвалася і забясьпечвалася з Парыжу ды Лёндану. На чале новых окупантаў ішоў „зямляк" і кампаньён беларускіх нацыянал-дэмократаў Пілсудзкі. Беларуская контр-рэволюцыя, дапамагаючы перамогам белапольскіх окупантаў, усьцілала „макавымі кветкамі" ды „васількамі" крывавы шлях Пілсудзкага. Беларуская буржуазія, памешчыкі, кулакі і іх адданыя прыслугачы нацыянал-дэмократы у „лыцары з захаду" Пілсудзкім убачылі сапраўднага свайго кампаньёна, які выратоўвае іх ад рабочых і сялян.

Прамоўцы гаварылі адданыя і шчырыя прамовы, поэты пісалі гімны, композытары перакладалі іх на музыку, а нацыянал - дэмократычныя хормэйстры ўшаноўвалі прыход на Беларусь ката рабочых і сялян Пілсудзкага. Нават такі поэтычны „гені", як Яээп Лёсік, захапіўшыся радасьцю з прычыны адыходу Чырвонай арміі, вызвоньваў у контррэволюцыйны „звон":

„Мой ты краю, родны, мілы,
Прывітаньне табе шлю.
Звонам чыстым, з усёй сілы,
Вестку добрую званю:
Бальшавіцка счэзла мара
Ужо далёка недзе там...
Залатая долі чара
Усьміхнецца мо' і нам".

А калі пан Пілсудзкі „ушанаваў" Менск—і сам, асабіста зьявіўся сюды, дык уся нацыянал-дэмократычная капэля навыперадкі бегла лізнуць яму боты, цалаваць полы ў пана, выказаць сваю адданасьць яму.

Нават такі карыфэй, як Янка Купала, і той ня ўнік спакусы. У дзень прыезду Пілсудзкага ў Менск Купала надрукаваў у „Звоне" оду „Паўстань", у якой заклікаў Пілсудзкага да ўладарства.

„Паўстань, з народу нашага ўладар,
Адбудаваць свой збураны пасад,
Бо твой народ забыў, хто гаспадар
І хто яго абдзёр з каронных шат

На ўладара жджэ Беларусь даўно,
І жджэ цябе ўладарства божы дар,—
Вялікае, магутнае яно...
Пад Беларускі сьцяг прыдзі, уладар".

Пра Гаруна і гаварыць няма чаго. Той апрануўся ў палковніцкую вопратку і дапамагаў белапольскім окупантам заліваць крывёю абшары Беларусі. І вось гэтага „адданага беларуса" ўжо пры савецкай уладзе праз савецкі друк нацыянал-дэмократы і іх прыяцелі ўзносілі на вышыню народнага гэроя", „правадыра працоўных" і нават надавалі годнасьць „рабоча - пролетарскага пісьменьніка". Але-ж гэта паміж іншым.

Асноўнае тое, што радаўцы, нацыяналдэмократы, якія яшчэ ўчора бачылі будучнасьць Беларусі пад протэкторатам Нямеччыны, сёньня ўжо крычалі па ўсіх менскіх завулках, што „мы хочам верыць, што ён (Пілсудзкі), гэты лыцар з Захаду, не па тое заўладаў сэрцам Беларусі, каб яе скрыўдзіць, але каб падняць з заняпаду зачараваную княжну ў сялянскіх шатах" (Звон). І простытуткі з „народнай рады" на панэлях Менску сьпявалі накшталт гэроіні Чарота у „Босых на вогнішычы" „Палюбі хоць трошкі, камрад", прадаваліся ўсім, хто мог-бы „памагчы ўтварэньню незалежнай і непадзельнай Беларусі" (Звон). А разам з тым гандлявалі агулам і ў раздроб целам і крывёю працоўных Беларусі і дапамагалі „лыцару з Захаду" Пілсудзкаму ў крывавым паходзе „за Бярэзіну", „туды за Смаленск!" Варта яшчэ раз напомніць прамову А. Прушынскага (А. Гаруна), якую ён прысьвяціў Пілсудзкаму 18-IX-19 г.

„Вольна і спакойна жывем мы сягоньня і нават маем радасьць, што бачым вас, пане начальніку... Але гаворачы словамі вешчага Баяна нашага, плачуць яшчэ маткі ў Віцебску, стогнуць людзі ў Магілеве; маўчыць... хаўтурны голас аб'імшэлых званіцаў Смаленску... сэрцы нашыя, радуючыся за нашае аслабаненьне, ня могуць быць спакойнымі за іхнюю долю".

Лёсікі, Цьвікевічы ды іншая нацыянал-дэмократычная дрэнь са скуры лезьлі вон і даводзілі Пілсудзкаму патрэбнасьць яго крывавага паходу „да канца", разумеючы пад канцом поўны разгром пролетарскай рэволюцыі. Яны гаварылі праз свой „Звон" Пілсудзкаму, што тыя землі, якія засталіся за савецкаю ўладаю, ня горшыя за землі, окупаваныя ім, і што народ за Бярэзінай і за Смаленскам ня горшы за народ Меншчыны, Віленшчыны і г. д.

Каб дапамагчы інтэрвэнтам зьвяршыць сваю крывавую справу, контррэволюцыйная рада стварыла сваё „нацыянальнае войска".

Булак-Балаховіч, гэты чорнасоценны пагромшчык, са сваею бандаю быў уключаны ў склад „беларускага войска„ як „асобны атрад Беларускай Народнай Рэспублікі". Пры гэтым, балахоўская банда была ўключана „у склад войска БНР", офіцыяльна праведзена нават протаколам „Рады міністраў".

Для гэтай балахоўскай банды „міністры БНР" выпрошвалі і шчодра атрымлівалі грошы як „у крэдыт", так і „потым разьлічымся" і ад эстонскага ўраду, і ў амэрыканскага „дзядзюшкі", і ў французскіх ды ангельскіх імпэрыялістаў.

Для сваіх „жаўнерыкаў" нацыянал-дэмократычныя баяны пісалі баявыя і паходныя маршы і песьні, услаўлялі поэзыяй пагромны шлях „нацыянальнага войска". Той-жа Янка Купала ў „боевой трясучке", як гаварыў Д. Бедны, надрываў свой голас:

„І мы ў шапку спаць ня будзем
І пакажам сьвету, людзям,
Як баронім межы родны
Ад напасьці, ад нягоднай".

г. зн. ад бальшавікоў.

Прасякнутыя зоолёгічнай нянавісьцю, да рабочых і сялян Расіі, нацыянал-дэмократы ўпрашвалі інтэрвентаў зьнішчыць „азіятаў"—расійцаў. Усе гэта аднак ня шкодзіла беларускай контррэволюцыі заключаць згоды з Дзянікіным ды іншымі.

Крывавы паход інтэрвэнтаў нацыяналдэмократы разглядалі як „барацьбу культуры з барбарствам сьвету, з цемраю". Буржуазная Польшча ў іх вачох набывала „прадстаўніка заходняй культуры", якая „мае за мэту прылучыць Беларусь да заходняй культуры".

Якую „культуру" несла працоўным Беларусі буржуазная Польшча, а таксама Балаховіч, яшчэ добра памятуюць рабочыя і сяляне Беларусі, і мы пра гэта ня будзем гаварыць.

Яшчэ памятаюць рабочыя і сяляне, як за „культурным прадстаўніком Захаду, які агнём і жалезам насаджаў „культуру", ехаў з карацельнымі атрадамі памешчык і капіталісты.

Верныя, як сабакі сваім гаспадаром, нацыянаы-дэмократы, даводзілі праз свой друк рабочым і сялянам, „беларускаму народу", што ўсё, што робяць паны, паны-пілсудчыкі, робіцца ў інтарэсах працоўных.

Калі капіталісты наводзілі свае парадкі на фабрыках і заводах, дык нацыянал-дэмократы даводзілі, што гэта так і трэба, бо „адсутнічае поўнасьцю інтэлектуальнае разьвіцьцё сярод рабочых" (Звон), бо рабочыя ня могуць ісьці „далей сваіх кішанковых інтарэсаў, дзелячы касу „свайго" заводу" (Звон).

Нават мысьль пра перадачу заводаў і фабрык рабочым нашыя „прадстаўнікі народу" лічылі ня інакш, як уплывам „маскоўскага імпэрыялістычнага духу". Рабочым досыць таго, што нацыянал-дэмократы будуць дамагацца „адпаведных варункаў працы, роўных з тымі, якімі карыстаюцца ўсе рабочыя культурных старонак", г. зн. капіталістычных умоў працы.

Не пакідалі нашыя „апостолы" і селяніна „пакрыўджаным". Яны ўсялякімі сродкамі прагнулі давесьці, што селянін „ня мае права" атрымаць дарэмна зямлю. Як на „аўтарытэтны" довад", яны спасылаліся на „моральны бок" справы: „Ці можна даць дарэмна зямлю тым, каторыя, дастаўшы яе, напэўна, дарэмна яе нікому не дадуць?" (Звон).

Адказ: бязумоўна нельга.

Але-ж, апрача гэтага „моральнага боку", ёсьць і іншае, што не дазваляла нацыянал-дэмократам падтрымліваць сялянскія патрабаваньні. Будучы вернымі ахоўнікамі традыцый „Нашай нівы", нацыянал-дэмократы ня эьбіраліся „служыць адным мужыкам", а служылі ўсяму беларускаму народу".

„Ня можна праводзіць рэформы на карысьць толькі аднаго стану, а ня цэлага грамадзянства, пісалі яны ў сваім „Звоне".

А таму „ня можна, надаючы дарэмна зямлю народу, пусьціць з торбаю зямляўласьнікаў, каторыя як-ніяк, рабілі карысную працу, прадуктуючы рэчы пажываньня для таго-ж пролетарыяту" (Звон).

Дарэчы пра „інтэрэсы пролетарыяту".

„Клапоцячыся" пра інтэрэсы пролетарыяту нацыянал-дэмократы даводзілі, што гэтыя „пролетарскія інтэрэсы" патрабуюць, каб сялянству не даваць зямлю бяз выкупу. Вось іх довад: „Перадаючы дарам зямлю сялянам, у каторых цяпер такая процьма грошай і каторыя вядуць натуральную гаспадарку... мы яшчэ больш панізім курс грошай, а з другога боку адымем у селяніна патрэбу наогул прадаваць продукты для пролетарыяту гарадоў" (Звон). Мы ня будзем тут гаварыць пра эканомічную пісьменнасьць былых „акадэмікаў", а зьвернем увагу чытача яшчэ на адзін „аўтарытэтны довад", у карысьць застаўленых маёнткаў ва ўласнасьці памешчыкаў.

„У інтэрэсах пролетарыяту на Беларусі (што за скромная абмежаванасьць? ЛБ) ёсьць, каб ня зьнішчаныя маёнткі далей вялі свае гаспадаркі, даўшы чалавечыя варункі жыцьця працуючым у іх рабочым" (Звон). Як бачыць чытач, капіталісты і памешчыкі і іх служкі, беларускія контрэволюцыйныя дэмократы, абаранялі ад пролетарыяту і рэволюцыйнага сялянства свае эксплёататарскія інтэрэсы інтарэсамі... пролетарыяту.

Для кулацтва нацыянал-дэмократы, зноў-такі будучы вернымі ахоў-

нікамі сталыпынскіх традыцый „Нашай нівы"—раілі „мець на ўвазе лепшыя формы зямлякарыстаньня. Значыцца трэба заводзіць хутары ці фэрмы" (Звон), г. зн. тое, што праводзілі Смолічы, Прышчэпавы праз Наркомзем.

Такім чынам, нацыянал-дэмократы, як бачыць чытач, „клапаціліся" пра ўвесь „народ". На самой справе нацыянал-дэмократы, ўжываючы слова „народ", баранілі інтэрэсы капіталістых, памешчыкаў, кулакоў, не забываючыся адначасова і пра інтэрэсы свае як ідэолёгаў вышэй названых катэгорый.

Палітычнай формай, у якой павінны былі рэалізавацца дамаганьні нацыянал-дэмократаў, павінна была быць „БНР". І гэта ня толькі ў гісторычнамінулым, але асноўная мэта іх была ўтварэньне БНР на сучасным этапе іх контррэволюцыйнай дзейнасьці. Але-ж адначасова не адмаўляліся і ад монархіі. Сваё імкненьне да палітычнага афармленьня, да адрыву Беларусі ад агульна-рэволюцыйнага руху беларуская буржуазія і яе прыслугачы, нацыянал дэмократы, імкнуліся паказаць як „агульнанацыянальную справу", ставячы на першае месца нацыянальны момант. Пры гэтым характэрна адзначыць, што высоўваньне на першы момант нацыянальнага моманту рабілася зусім сьвядома, па тактычных меркаваньнях.

Вось што пра гэта піша ў „Звоне" нейкі Раман Суніца (Раман Скірмунт?): „усенароднае значэньне вызваленчы рух можа атрымаць толькі тады, калі ў яго аснове ляжыць момант нацыянальны, а не які іншы. Моманты клясавыя, соцыяльныя, экономічныя і ім падобныя могуць быць побач, у падатковых пунктах нацыянальнае аблічча формы, але не павінны займаць у ёй першараднага месца, бо гэта адразу разабʼе сілы ўсенароднага руху клясавымі ды соцыяльнымі антагонізмамі і партыйнымі супярэчкамі".

Якога „нацыянальнага вызваленьня" дамагаліся няцыянал-дэмократы, ужо мы бачылі і раней.

Ідэя БНР, па свайму тыпу і клясаваму зьместу нічым не адрозьніваецца ад звычайных буржуазна-дэмократычных рэспублік, якія ў моц дыялектыкі клясавай барацьбы перарастаюць у фашыстаўскую дыктатуру. Такую фашыстаўскую дыктатуру, пад протэкторатам фашыстаўскай Польшчы, і марылі стварыць Лесікі, Некрашэвічы, Ластоўскія ды іншая сволач пасьля зьвяржэньня савецкае ўлады.

Вось некалькі меркаваньняў Рамана Суніцы пра клясавую структуру БНР. „Наш народ,—піша Суніца,—цэлы час свайго гісторычнага жыцьця расьціў і адначасна траціў сваю інтэлігенцыю, панства, буржуазію, аддаючы іх дужэйшым суседзям". А з гэтай прычыны „нацыя наша заўсёды вызначалася аднабочна, аднаклясава, бо пераважна была сялянскай". А гэтае апошняе, па думцы Суніцы, вызначае слабасьць беларускай нацыі і нават „асабліва шкодзіць нацыянальнайсправе ў рашучыя гісторычныя моманты".

Наконт аднаклясавасьці беларускай нацыі сябры Суніцы давялі адваротнае, давялі што ёсьць і беларускі памешчык і беларускі капіталіст, і давялі гэта сваёю практыкай.

Суніца працягвае сьпяваць:

„У сучаснай стадыі людзкага наступу нацыя ня можа абыйсьціся без буржуазных элемэнтаў, і мы, калі хочам быць нацыяй, мусім ісьці агульналюдзкаю сьцежкаю. Асабліва гэта важна нам, беларусам"... (Звон).

Як бачыць чытач, ідэолёгі буржуазіі хацелі давесьці рабочым і сялянам, што без буржуазіі нельга абыйсьціся, і гэта даводзілі тым рабочым і сялянам, якія сваёй рэволюцыйнай гэроічнай барацьбой супроць буржуазіі даводзілі адваротнае: шкоднасьць і непатрэбнасьць „буржуазных элемэнтаў".

Але вось пачытайце далей, як нацыянал-дэмократы „даводзілі" рабочым і сялянам Беларусі неабходнасьць буржуазіі як кіраўніка БНР:

„Дзяржаўнае адраджэньне вымагае ад нацыі перш за ўсё вялікае працы. На гэту працу павінны быць выкары-

станы усе інтэлектуальныя сілы нацыі,—а іх найбольш якраз у яе буржуазных слаёх. Лёгка важыць гэтыя сілы, адкідаць іх, а тым больш ставіць іх у абставіны, варожыя нацыянальнаму руху, гэта была-б невыбачальная абмылка і страта для нацыянальных інтэрэсаў" (Звон).

Вось частка клясавай структуры БНР, якую абвяшчалі нацыянал дэмакраты і якую хацелі яшчэ раз абвясьціць пасьля зьвяржэньня савецкае ўлады, што зьявілася асноўнай мэтай сучаснай іх контррэволюцыйнай дзейнасьці.

Ня будзем застанаўлівацца на „незалежнасьці" „Беларускай Народнай Рэспублікі", бо самі аўтары яе ніколі ня верылі ў сапраўдную незалежнасьць. Лёзунг „незалежнасьці", як мы ўжо гаварылі, быў высунуты для таго, каб аб'яднаць усе контррэволюцыйныя элемэнты на Беларусі. Самі-ж аўтары лёзунгу „незалежнасьць" цьвёрда кіраваліся іншымі меркаваньнямі. Вось яны:

„Эканомічна, як край, ня маючы ні свайго жалеза, ні вугалю, ні фабрык і заводаў. Беларусь будзе ад некага залежаць", пісалі яны ў сваім „Звоне". А таму, гаварылі яны трошкі раней, „і беларускія патрыоты, і Польшча, і Антанта будуць рабіць усё магчымае, каб даць „Беларусі незалежнасьць яе ад Расіі". Вось гэта і значыць „незалежнасьць". Што-ж тычыцца таго, ад каго будзе залежаць Беларусь, дык нашыя „патрыоты" пасьля паражэньня стаўкі на нямецкі імпэрыялізм рабілі ўсё магчымае, каб Беларусь залежала ад капіталістычнай, фашыстаўскай Польшчы. І ў гэтай справе яны разьлічвалі не на рабочых і сялян Беларусі, а на буржуазныя элемэнты ўнутры краіны, а галоўным чынам на інтэрвэнцыю. Пра гэта яны не бяз цынізму гавораць у сваіх паказаньнях.

Сканчэньнем вайны з белай Польшчай ня скончылася контррэволюцыйная дзейнасьць беларускага нацыянал-дэмократызму. Атакаваныя з двух бакоў: з боку савецкае ўлады і ўнутры з боку „сваіх" рабочых і сялян Беларусі, „народныя міністры" разам з сваімі гаспадарамі і „земляком" Пілсудзкім прымушаны былі падмазаць амэрыканскім маргарынам свае пяткі і кінуцца наўцёкі. Частка „патрыотаў" беларускага народу тыпу Аляксюка значны час працягвала ўзброеную барацьбу супроць дыктатуры пролетарыяту ў бандах БНР пад командаваньнем Балаховіча, другая частка асела ў Вільні, трэцяя частка забралася далей... у Прагу, Бэрлін, Парыж і г. д і там праяўляла свае махлярскія здольнасьці, вынаходзіла новыя формы барацьбы супроць рабочых і сялян, якія пачалі будаваць і пераможна будаваць соцыялізм.

Цяпер, калі мы ўступілі ў паласу разгорнутага соцыялістычнага наступу па ўсяму фронту, калі пролетарская рэволюцыя ў сваім пераможным руху зьнішчае, на базе суцэльнай колектывізацыі, апошнюю капіталістычную клясу, калі сусьветны капіталізм шукае выйсьця з тупіку ў вайне супроць соцыялістычнай краіны,—цені мінулага зноў узьнімаюць свае галовы. У саюзе з інтэрвэнтамі кучка буржуазных і дробнабуржуазных інтэлігентаў, ідэолёгаў кулацтва, усяго капіталістычнага бруду рыхтавалі сумесна з сусьветным імпэрыялізмам новую крывавую лазьню рабочым і сялянам Беларусі і Савецкага саюзу. Але-ж, як і ў мінулым контррэволюцыя пацярпела паражэньне, так і цяпер пільнасьць рабочае клясы не дала магчымасьці ажыцьцёвіць свае крывавыя замыслы. Разам з выкрыцьцём контррэволюцыйнай, шкодніцкай работы Лёсікаў, Ластоўскіх, Некрашэвічаў, Цьвікевічаў і К-о сарвана канчаткова вопратка „народных", і яны паўсталі перад рабочымі і сялянамі ва ўсёй сваёй нагаце.

Менск 25-29/XII-30 г.

С. Куніцкі

Аповесьць Сымона Баранавых „Чужая зямля“

(Замест рэцэнзіі)

С. Баранавых—пісьменьнік пасьлякастрычнікавай пары

Калі глядзець з пункту гледжаньня часу, калі С. Баранавых пачаў сваю творчую мастацкую дзейнасьць, дык ён зьяўляецца яшчэ зусім маладым пісьменьнікам у кругабезе навейшай беларускай літаратуры. Яго першыя мастацкія апавяданьні на старонках нашых газэт пачалі зьяўляцца ў 1927 г. (тады яшчэ пад прозьвішч. С. Баранаў). Яго першае апавяданьне „У млыне“ было надрукавана ў газэце „Чырвоная зьмена“ у 1927 г. З гэтага часу разьвіцьцё творчага таленту пісьменьніка ідзе параўнаўча шпаркім тэмпам. На старонках розных нашых газэт, а таксама пазьней і на старонках часопісі „Маладняк“ пачынаюць адно за другім зьяўляцца яго невялікія апавяданьні. А ў 1929 г. на старонках часопісі „Маладняк“ С. Баранавых ужо друкуе сваю першую аповесьць „На абрэзках зямлі“. Затым у гэтым-жа годзе на старонках часопісі „Полымя“ друкуе другую аповесьць „Межы“.

Зараз гэтыя абедзьве аповесьці вышлі асобнымі кніжкамі. Толькі першая аповесьць „На абрэзках зямлі“ вышла ў асобнай кніжцы пад загалоўкам „Чужая зямля“. Таксама ў гэтым-жа годзе разам з асобным выданьнем аповесьцяў вышаў яго зборнічак апавяданьняў у сэрыі „Бібліотэка школьніка“ „Злосьць“.

Як бачым, пісьменьнік С. Баранавых за невялікі кавалак часу, якіхнебудзь тры гады, даў досыць значную творчую продукцыю.

Першыя яго творы (апавяданьні) уяўляюць сабой паасобныя малюнкі вясковага побыту працоўнага сялянства. У іх аўтар часьцей усяго зарысоўвае сялянскую някультурнасьць, беднасьць, што вырастае на глебе дробнай індывідуальнай гаспадаркі.

Нешта адменнае па характару адлюстраваньня рачаіснасьці ўяўляюць сабой яго аповесьці: „Чужая зямля“ і „Межы“. Гэтыя абедзьве аповесьці ўжо маюць пэўную выразную соцыяльную напоўненасьць, соцыяльную накіраванасьць. Аўтар гэтых аповесьцяй імкнецца паказаць ня толькі тую ці іншую рачаіснасьць, канстатаваць яе, але ён імкнецца паказаць тыя соцыяльныя прычыны, на якіх тая ці іншая рачаіснасьць грунтуецца. У аповесьцях аўтар паказвае жыцьцё ў процэсе клясавай барацьбы.

У даным сваім артыкуле я спыню ўвагу чытача толькі на аднэй аповесьці „Чужая зямля“. Я буду імкнуцца разгледзець тыя вобразы, якія падае аўтар у гэтай аповесьці, і растлумачыць іх клясавую прыроду.

Мы ведаем, што пісьменьнік падае нам тую ці іншую рачаіснасьць праз сыстэму вобразаў. „Творчасьць мастака—кажа В. Фрычэ—тым адрозьніваецца ад творчасьці вучонага, што ён будуе свой сьвет ня з ідэй, а з вобразаў. Мастацкая творчасьць ёсьць творчасьць вобразаў. Самыя вобразы могуць быць рознага зьместу: ці непсыхолёгічныя—вобразы прыроды, вобразы рэчаў, ці псыхолёгічныя—вобра-

зы чалавека, вобразы характараў" (арт. В. Фрычэ „Художественные образы Л. Н. Толстого" зборнік „Лев Толстой" (1828—1928) выд. „Работник Просвещения" Москва. 1928 г.).

Тыя вобразы, якія падае нам пісьменьнік С. Баранавых у аповесьці „Чужая зямля", узяты з рачаіснасьці часоў белапольскай окупацыі Беларусі. Мы спачатку бачым іх у гэтых абставінах. Затым гэтыя вобразы фігуруюць перад намі ў абставінах першых дзён савецкай улады, калі Беларусь была вызвалена з-пад соцыяльнанацыянальнага ўціску белапалякаў, і калі працоўныя Беларусі пачыналі разгортваць сваё жыцьцё, сваё будаўніцтва ўжо не пад эксплёатацыяй зямляўласьнікаў-капіталістых, а пры сваёй уладзе, пры дыктатуры пролетарыяту. Менавіта гэты гісторычны момант паўстае перад намі ў аповесьці „Чужая зямля".

Аўтар фактычна ў аповесьці „Чужая зямля" падае нам вобразы дзьвюх кляс: з аднаго боку, перад намі спачатку і да канца аповесьці дзейнічаюць вобразы кулацтва, а з другога боку, вобразы, эксплёатуемыя гэтым кулацтвам. Перад намі ўсплываюць вобразы працоўнага сялянства, вобразы батрацтва, вобразы прадстаўнікоў савецкай улады, хаця апошнія ня зусім выразны. Але аб гэтым ніжэй.

Вобразы кулацтва выступаюць перад намі з досыць яркай паўнатой. Аўтар адзначыў у асноўным усе тыя характэрныя рысы, якія ўласьцівы прадстаўніку кулацтва, з яго ідэалам, з яго клясавай накіраванасьцю.

З самага пачатку аповесьці выступае перад намі вобраз кулака Клямкі. Выступае ён з поўным здавальненьнем у лёсе свайго жыцьця. Ён з пашанай ставіцца да панска-польскай улады, як да ўлады сваёй, якая спрыяе яго жыцьцёвым запатрабаваньням, дапамагае яму пашыраць сваю гаспадарку. Ён бесклапотна няньчыцца з сваёй гаспадаркай. Мы бачым вобраз Клямкі ў асяродку яго моцнай гаспадаркі, якую ён імкнецца пашырыць ва ўсе бакі. У яго няўпынная цяга да багацьця. Ён сябе імкнецца чым-небудзь паказаць перад сваімі суседзямі. „Абодвы жарабцы Клямкі—аж сьвіцяцца, аж палыскуюцца: вельмі гладкія. Можна шклянку вады паставіць у аднаго на „крыжы"—не разальлецца, таксама паставіўшы--капля ня капне і ў другога" (ст. 10). Жарабцы—гэта Клямкаў гонар. Яны ў яго служаць спэцыяльна для шляхецкага выезду кудынебудзь на хвэст, служаць для гонару, для забавы. Менавіта ў такім гонары і забаве сустракаем з пачатку аповесьці вобраз Клямкі.

У такім-жа гонары разгортваецца другі вобраз прадстаўніка кулацтва—гэта вобраз Трамбіцкага. Гэты вобраз нічым не адрозьніваецца ад вобразу Клямкі. Той самы гонар, тую самую прагнасьць да багацьця, што мае Клямка, мае і Трамбіцкі. Розьніца тая, што Клямка любіць паказаць сябе, свой гонар, з сваімі жарабцамі, тады як Трамбіцкі свой гонар вывозіць на сабаках. Клямка спэцыяльна для гэтага гонару трымае пару жарабцоў, а Трамбіцкі—цэлую псярню гончых сабак. „Макар Нічыпаравіч Клямка любіў разводзіць, любіў цешыцца жарабцамі, а яго сусед—Янка Кліменьцевіч Трамбіцкі любіў разводзіць і любіў таксама цешыцца ганчакамі" (ст. 13). З самага пачатку бачым, абодвы гэтыя суседы напоўнены нейкім шляхецкім гонарам, які імкнуцца праз што-небудзь паказаць. Гэта, бязумоўна, характэрна для кулака. Гэтую рысу пісьменьнік С. Баранавых падмеціў і адлюстраваў вельмі ўдала.

І Клямка і Трамбіцкі маюць досыць вялікія кавалкі зямлі. „Адным словам:--у першага дзьве валокі тлустае чорнае глебы, а ў другога—адна з паловаю" (ст. 32). Зямля іх мяжуецца. Паміж сабой яны жывуць у вялікай злагадзе. Пры кожнай штодзённай сустрэчы яны радуюцца гэтай сустрэчы, сьмяюцца ад радасьці.

— Ягамосьцю Макару,—зьвяртаецца Трамбіцкі.

— Вашэці Янаку, —іначай не зьвяртаецца Клямка.

— Калі, вашэці, за жнеямі паедзем?—пачынае Клямка.—Разам давайце паедзем.

— Давайце, ягамосьцю,—адказвае Трамбіцкі,—давайце на дзьвёх парках... нечага за адзін раз (ст. 37).

Дружба ў іх шчыльная.

Клямку і Трамбіцкага амаль нічым разьлічыць нельга. У іх ва ўсім адзінства. У абодвых аднолькавыя погляды на жыцьцё, на рэчы. Яны нават згодны злучыць у адну гаспадарку свае хутары. Клямка з вялікай радасьцю глядзіць на свайго сына Ромуся, які кахае дачку Трамбіцкага. Радасьць яго ахоплівае толькі таму, што яго сын ажэніцца на роўнай сабе. На такой-жа багатай, як і сам. Клямкава прагнасьць да багацьця праяўляецца і тут. Ромусь зьбіраецца жаніцца. Але на кім жаніцца?—На Лёлі, на роднай дачцы суседа. Такога-ж суседа. „Самага блізкага, што от толькі цераз мяжу. Самага найзалацейшага суседа, у якога ў банку тры тысячы чыстага золата, дзесятка ў дзесятку“ (ст. 10).

Ня супярэчыць гэтаму і Трамбіцкі. Ён таксама з радасьцю гатоў аддаць за Ромуся сваю Лёлю. Праўда, таксама ўлічвае карысны бок справы. Трамбіцкі кажа:

„Дык хіба ж можна, каб ня радавацца? Хіба можна, калі ў Нічыпаравіча адзіны сын, які яму вока ніколі аніякою магулінкаю нават не зацярушыў? Хіба можна, калі яго сын, апрача ўсяго, утварае з суседам радавую сувязь. Тую сувязь, якая—калі што якое—хутары можна аб'яднаць, нават злучыць у адно непадзельнае“ (ст. 11).

Трамбіцкага вабіць таксама багацьце суседа. Яму падабаецца Ромусь, як паніч, як выпешчаны шляхцюк, які „вока ніколі аніякаю магулінкаю, нават, не зацярушыў“.

У ня меншай згодзе Клямка і Трамбіцкі жывуць і з трэцім сваім суседам крамаром Довідам Самуілавічам Ліпскім. З Ліпскім іх таксама злучае аднолькавая клясавая прырода.

Ліпскі местачковы жыхар. У мястэчку ў яго свая крама, „ён гандлюе паркалем, двойным кортам, сукном—хоць і ня чыстым—і ўсімі іншымі дробязямі, якія пачынаюцца ад „барскага“ мыла і канчаюцца юшкамі“ (ст. 20).

Жыве Ліпскі ў адным мястэчку доўгі час. Жыцьцё яго тут ня зусім здавальняе. Ён адчувае сябе адзінока, няма каля яго такіх людзей, з якімі-б ён мог падзяліць свае ідэалы, правесьці весела час. Яго абкружае местачковая беднота, з якой ён нічога супольнага ня можа мець.

„Калі-б не складалася чыстая гатоўка, якая дасягае кожны год у суме тысячы—тысячы пяцьсот рублёў, Давід Самуілавіч не пражыў-бы от на адным месцы семнаццаты год“ (ст. 21—22).

Ідэал яго—багацьце.

Ліпскі паважае людзей толькі багатых. У горадзе ён мае шырокае кола буйных знаёмых гандляроў, з якімі ён дружыць, знаходзіць у іх сваю раўню. Бываючы ў горадзе, ён заўсёды начуе ў нейкага Фіша, які „трымае ўнівэрсальны магазын“.

Праўда, у мястэчку мае знаёмства Ліпскі с гадзіньнікавым майстрам, з дырэктарам местачковай школы. Але гэтае знаёмства лятучае, між іншым. Шчыльнейшую дружбу ён трымае з Клямкам і Трамбіцкім. У іх знаёмства цягнецца доўгі час. Яны адзін аднаго вельмі добра ведаюць. „Іх бацькі некалі дружылі. З таго часу і яны не парушаюць сваёй дружбы...“ „Калі ў аднаго, альбо ў трэцяга бывае якая-небудзь „бяседа“, яны пазываюць адзін другога“. Калі адбываюцца ў Ліпскага імяніны, у першую чаргу мы на іх бачым Клямку і Трамбіцкага, як лепшых гасьцей, як адзінадумцаў з Ліпскім.

Гэтыя тры вобразы неяк зьліваюцца ў адзін. Пры ўсім жаданьні клясавага разьлічча паміж імі знайсьці нельга. Іх ідэалы сходзяцца ў адным пункце. Кожны з іх прагне да нажывы. Кожны з іх імкнецца пашырыць сваё багацьце за кошт эксплёатацыі

працоўных. Кожны з іх трымае батракоў. Для кожнага з іх прыемна існаваньне панска-польскай улады. І наадварот, у іх поўная згода ў поглядах на ўладу працоўных, як на варожую ім. Яна іх пужае. Сабраўшыся ў месца, у іх няма іншай гутаркі, як пра тыя падзеі, што адбываюцца ў Маскве. На імянінах у Ліпскага ў іх няма іншай гутаркі, як толькі пра бальшавікоў, якіх яны называюць „анцыхрыстамі".

„І гаварылі. І было пра што гаварыць. Асабліва пра навіны сёньняшняга дню:—пра „Маскоўскія голады", пра „бунты ў Маскве", пра „заўтрашні канец бальшавікоў", пра „вялікую польскую зямлю".

„І гаварылі. І кожны дабаўляў да гаворкі па маленькаму кавалачку свайго хаценьня. А з маленькіх кавалачкаў вялікі кавалак вырастаў, ад кавалка сатканая навіна вырастала. І тады дзівіліся гэтай навіне, радаваліся..." (ст. 23—24).

Паміж імі поўнае клясавае адзінадушша. Паміж імі ў соцыяльнай роўніцы поўная згода. Часамі формальна гэта згода парушаецца, але не на соцыяльнай глебе, а на глебе нацыянальнай. „Трамбіцкі з Клямкаю розных вер. І гэта адна з галоўных прычын магчымай у іх супярэчнасьці". (ст. 39). Але-ж гэтая супярэчнасьць далей заўваг ня ідзе. Гэтая супярэчнасьць разгадваецца ў суседзкай, сяброўскай развазе. Яны адзін аднаму уступаюць, згаджаюцца. А калі часамі зусім і не згаджаюцца, дык гэта нязгода ня выказваецца, не выкрываецца, яна захоўваецца ў нутры. Але развазжаньне адносна вер у іх мае месца. Трамбіцкі, зварочваючыся да Клямкі, ліcьліва, з нейкай пагардай кажа:

— „Суседзе Макару, як сабе хочаце, а наша вера больш далікатнейшая, больш гжэчная. Наша вера цяжкая, як далікатны бадзіст".

— „Вашэці Янаку, я аб гэтым нават і ня думаю супярэчыць, што яно так, то пэўна-ж так. (А ў сваіх адчуваньнях Клямка думаў: „не, восані, ня так" (ст. 39). На гэтых заўвагах іх гутарка аб верах канчалася. Яны абодва з гонарам застаюцца кожны пры сваёй веры. Кожны лічыць сваю веру, сваю нацыянальнасьць вышэй другой.

Мы бачым, што нацыянальнае разьлічча іх соцыяльнай дружбы не разрывае. Ніяк, напрыклад, Ліпскі ня можа сябраваць з сваімі местачкоўцамі—яўрэйскай беднатой. Няма ніякай дружбы ў Клямкі і Трамбіцкага з навакольным вясковым працоўным сялянствам. Іх дружба сыходзіцца на клясавай роўніцы. Складае адзін фронт супроць працоўных.

І калі Баранавых дае аднолькавы вобраз кулака з розных нацыянальнасьцяй, дык ён, мабыць, гэтым самым толькі хоча падкрэсьліць, што ў кожнай нацыянальнасьці ёсьць і багаты і бедны—эксплёататар і эксплёатуемы. Што эксплёататары, якой бы яны нацыянальнасьці ні былі, складаюць адзін фронт супроць працоўных.

Трэба сказаць, што С. Баранавых вобразы заможнікаў, прадстаўнікоў кулацкай клясы, у данай сваёй аповесьці прадставіў вельмі поўна, з усёй іх клясавай сутнасьцю. Гэты факт зьяўляецца яркім доказам, у супрацьлегласьць поглядам тых асоб, якія да сёньняшняга дню стаяць на пляцформе Пераверзева і крычаць, што пісьменьнік аднэй клясы ня можа даваць об'ектыўна правільна вобразы іншай клясы.

Даны факт востра супярэчыць гэтай пляцформе, бо мы ведаем добра з усёй сыстэмы творчасьці пісьменьніка С. Баранавых, што ён ні ў якім разе па сваёй псыхоідэолёгіі да класы кулацтва не належыць. Але гэта між іншым.

Мы яшчэ ня скончылі поўнага разгляду вобразаў кулацтва. Мы разгледзелі гэтыя вобразы ў абставінах польска-панскай улады часу окупацыі Беларусі. Яны поўнасьцю адпавядаюць гэтым абставінам. Менавіта, кожны працоўны мог бачыць падобны вобраз падпанка. Кожнаму працоўнаму селяніну прыходзілася здымаць перад ім шапку за скібку хлеба,

памагаць набіваць яму золатам кішэні. Кожны бачыў, як гэтыя падпанкі, напоўненыя вясёласьцю, здавальненьнем, спраўлялі імяніны, ад бязьдзельля раз'яжджалі на хвэсты, займаліся паляваньнем,—што называецца ўпівалiся радасьцю жыцьця за крывавы пот працоўных.

На іх-жа баку была панска-польская ўлада. Мы ведаем, што працоўны селянін у часы бела-польскай окупацыі насіў на сваіх плячох той самы (а ў некаторых выпадках яшчэ большы) соцыяльна-нацыянальны цяжар, што і пры цару. Паны-палякі-окупанты для працоўнага селяніна стваралі абставіны пакуты, а для багацеяў, кулацтва—вясёлае жыцьцё. Гэта вясёлае жыцьцё ня мог ня прыкмеціць і С. Баранавых, паколькі гэтае жыцьцё з усёй цяжкасьцю клалася на плечы таго соцыяльнага пласту, прадстаўніком якога зьяўляецца пісьменьнік.

С. Баранавых, ці лепш сказаць яго соцыяльны пласт, гэтае жыцьцё адчуў. Баранавых яго здолеў ператварыць у мастацкія вобразы. Гэтыя вобразы яму ўдаліся.

Удаліся таксама і вобразы Ромуся і Лёлі.

Ромусь і Лёля—тыповыя прадстаўнікі кулацкай моладзі, кулацкага вясёлага жыцьця. Калі нават не казаць аб тым, што Лёля дачка кулака Трамбіцкага, а Ромусь сын кулака Клямкі, дык з іх мэтаімкнёнасьці, іх ідэалаў відаць, што гэтыя асобы выраслі ў абставінах моцнай гаспадаркі, на руках мамак і нянек.

Лёля—гэта тыповая провінцыяльная хутарская мешчанаватая паненка. Яна ўжо дарослая. Фізычнай працай ніякай не займаецца. Яна толькі зацікаўлена сабой, сваім лёсам, шчасьцем. Яна марыць аб тым, за кого яна выйдзе замуж, які ў яе будзе муж. Ці ён будзе сярэдняга ўзросту, ці на поўсантымэтра вышэй сярэдняга. Ці будзе з вусамі ці бяз іх. Яе ўяўленьне сконцэнтравана навакол свайго „я“.

Яна пачынае ўяўляць сябе самастойнаю жанчынаю. От яна, Лёля, гэткая грузная ўжо. За сталом сядзіць яе муж, а яна накладае на фарфаравы сподак яму ёю званае з трускавак варэньне.

— Мой муж павінен быць сярэдняга росту,—разважае Лёля.

— Не, як Ромусь, ці што.

— „І абавязкова з вусікамі. З гэткімі вусікамі, як у...“ (ст. 17).

Па аднэй вось гэтай развазе можна судзіць, што чалавек жыве бесклапотна, сыта, жыцьцём не ацяжараны.

Такім самым бесклапотным зьяўляецца і Ромусь. Таксама шчасьлівы ў жыцьці. Нічым не заняты, толькі марыць пра каханьне, у якім бачыць усё шчасьце жыцьця.

„Ромусь, стоячы ў сваім садзе, гледзячы на месяцаву гульню, яго жарты, разважаў тады:

— „Пры месяцы, кажуць, большы наплыў каханьня ў маладых асоб. Яны прызнаюцца адно другому ў шчырасьці, яны палчэй любяцца пры месяцы“ (ст. 17).

Ромусь і Лёля ніколі ня сумуюць. Яны нават не клапоцяцца аб тым, што робіцца на сьвеце, што робіцца па-за межамі панскага ўладарства, як гэта клапоцяцца і цікавяцца іх бацькі.

Але канец вясельлю-панству набліжаецца. Полымя рэволюцыі ўсё ўзрастае. Яно пачынае прыпякаць паноў-окупантаў. Апошнія ня вытрымліваюць. Яны вымушаны пакінуць Беларусь.

Замест панска-польскай эксплёататарскай улады над Беларусьсю ўздымаецца чырвоны сьцяг улады саветаў. Адбываецца зьмена ва ўсім соцыяльна-эканомічным жыцьці краіны. На гісторычную арэну падымаецца новая кляса, кляса пролетарыяту ў злучэньні з асноўнай часткай працоўнага сялянства. Канчаткова нацыяналізуюцца фабрыкі і заводы. Зямля ўся пераходзіць у карыстаньне працоўнага селяніна. Кулацтва адпіхваецца ад удзелу ў політычна-эканомічным жыцьці. Шпаркім тэмпам разгортваецца жыцьцё працоўных. Б'е імпульс новага жыцьця.

Што-ж у гэты час адбываецца з бесклапотнымі, вясёлымі вобразамі кулацтва? Яны ня зьнікаюць. Яны застаюцца і пасьля гэтай політычна-соцыяльнай зьмены. Але, як мы бачым з аповесьці, яны не дапускаюцца ні да якога кіраўніцтва ў соцыяльным жыцьці. Наадварот, адчуваецца, што пад імі глеба раскладаецца.

Адчуваюць гэта пад сабою і самі кулакі. Яны „мяняюць" сваю політыку. Яны, глыбока затаіўшы сваю варожасьць да новай, савецкай улады, пачынаюць прыстасоўвацца да новых абставін. Аўтар як-бы сочыць за гэтымі вобразамі далей. Ён хоча паказаць, што кулак ні ў якім разе ня можа пераламаць сваю псыхолёгію і здаволіцца ідэямі працоўных, успрыняць гэтыя ідэі. Баранавых у даным выпадку клясавую сутнасьць кулака расчыняе далей.

Мы бачылі, як Клямка, Трамбіцкі і Ліпскі яшчэ ў час свайго панаваньня (пад скрыдлам паноў-окупантаў), у час вясёлых імянін Ліпскага хваляваліся аб тым, што там недзе „бунты ў Маскве", што за панска-польскім уладарствам узрастае полымя рэволюцыі, расьце соцыяльная для іх небясьпека. Але яны тады былі ахоплены вялікай надзеяй на „вялікую польскую зямлю". Яны тады ў аберучкі трымаліся за яе.

Цяпер у іх гэтая надзея парушана сілай працоўных, рэволюцыяй. Яны сустрэліся з новай рачаіснасьцю, і яны вымушаны, захаваўшы тую-ж надзею глыбей, прыстасоўвацца да гэтай новай, для іх зусім чужой, рачаіснасьці.

Цяпер, як антытэза, вобразам кулакоў супроцьстаўляецца вобраз працоўнай масы, партыі, вобраз загнаных раней сялян. Уздымаецца і пачынае дзейнічаць, мяняць свой вобраз жыцьця фігура Клямковага батрака Лукаша Вуцкіна, якого да гэтага часу мы амаль ня бачылі.

Бурліць новае жыцьцё. Пачынаецца перабудова старой вёскі, тае вёскі, якая ганебна эксплёатавалася пры цару, якая знаходзілася ўвесь час у беднаце, у гразі і цемры, якую і на далей не пакідалі трымаць у такім-жа стане, таксама эксплёатаваць панычалякі і іх спадарожнікі розныя Трамбіцкія, Ліпскія і Клямкі.

Гэты тыповы выгляд старой вёскі падае нам Баранавых.

„Хаты крынічнікаў, гледзячы здалёк, здаваліся ўрослымі ў зямлю. Яны асуналіся, заплюшчылі свае вочы-вокны, абыралі ад усяго... То там, то сям тырчэлі ўзодраныя ветрам шчыты; часамі вісела на бок нахіленая вакеніца: гэта вырваўся з сьцяны і даўно, аж ад леташняга яшчэ, згубіўся крук, які яе падтрымліваў. Вакно,—ані ў аднэй хаце ня было, каб спр. . . цэлыя шыбы. Калі не адна, дзьве тры былі выбіты і „да часу" заткнуты лапсардаком на кудзелі альбо старым вынашаным андараком. Часамі шыбы былі „напраўленыя", гэта з некалькіх кавалкаў шкла складзена была шыба, замацованая „казачкамі" (ст. 72).

Гэта ўбогая вёска, уросшая па вокны ў зямлю, цяпер бурліць новым жыцьцём. Пачынае прачынацца ад прадвечнай цемры. Пачынае разбураць спарахнелыя будынкі і на іх месца ставіць новыя, прыгожыя. Адразу адчуваецца зьмена.

„Кожны дзень, што-небудзь прыбывала новае: то на аднэй будыніне-зрубе кроквы стаўляліся, і гэта адразу кідалася ў вочы; то страха новая блішчэла пад сонцам, і яе нельга было не заўважыць; то вочап вытыркаў з усяго гэтага і таксама мазоліў суседзкія вочы. Кожны дзень, а што-небудзь дражнілася з суседзямі,—драпежыла зірк то Трамбіцкага, то Клямкі" (ст. 93).

Адбываецца разьмеркаваньне паміж працоўнага сялянства кулацкай маянтковай зямлі. Трамбіцкі і Клямка адчуваюць, што дабяруцца і да іх валок. Іх гэта надзвычайна пужае.

Трамбіцкі расхвалёваны кажа свайму суседу:

— „Чуткі ня ладныя, пакуль што. Зямлю зьбіраюцца дзяліць... пана Завішынскага. Сканчэньне сьвету, дальбог“ (ст. 81).

Ранейшай кулацкай вясёласьці мы цяпер ужо ня бачым. Яна ператварылася ў востры ўнутраны боль, у затоенае агідзтва, у шалёную затоеную злосьць да савецкай улады, да разгорнутага савецкага будаўніцтва. Але разам з гэтым у іх уся надзея, што паны-палякі вернуцца. Яны ніяк ня могуць згадзіцца, што „бязбожнікі“, „анціхрысты“ надоўга абсталююцца і зьнішчаць іх шляхецтва, панскае „далікацтва“.

„Нашы“—моц, „нашы“,—на адну хвіліну адступілі. „Нашы“—свае людзі, адна тая кроў і вера.» Адзін інтэрэс да „далікацтва“ (ст. 80),—так разважаюць паміж сабою Клямка з Трамбіцкім на другі дзень адступленьня белапалякаў, якіх яны называлі „нашы“.

Кулакі ўсякім чынам імкнуцца захаваць свае сядзібы, свае валокі ўцалку. Бо ў іх надзея, што „гэтая большасьць“ ну ня больш калі яшчэ пару дзён затрымаецца. Ня больш. „А значыць іх гаспадарка застанецца цэлай, як і была“.

У гэты час то сям, то там пачалі зьяўляцца „нейкія пасёлкі“. З Выканкому (земаддзелу) прыяжджае прадстаўнік рабіць абрэзку зямлі і ў Трамбіцкага. Трамбіцкі імкнецца як-небудзь абараніцца. Зразумела, тут сілай нельга. Ён пачынае лісічкай круціцца навокал прадстаўніка земаддзелу Сініцкага. Яму ўдаецца Сініцкага схіліць на свой бок і яму на некаторы час гэтым самым удаецца адцягнуць абрэзку сваіх валок. Але гэта некаторы час, пакуль партыйная організацыя ня ўскрыла здрадніцкую дзейнасьць Сініцкага, як прадстаўніка земаддзелу. Далей мы бачым, што і Клямкаву і Трамбіцкага зямлю абразаюць і раздаюць яе батраком, беднаце. Атрымоўвае сабе вучастак і батрак Клямкі Лукаш Вушкін.

Гэты пераломны момант вельмі характэрны для першых дзён савецкай улады. Але трэба сказаць, што ён не знайшоў поўнага адбіцьця ў аповесьці „Чужая зямля“.

Гэты пераломны момант характэрны ня толькі тым, што адбываўся падзел абшарніцкай зямлі, абрэзка кулацкай, адбудова вёсак, пабудова новых пасёлкаў і г. д. Гэты момант характэрны абвостранай клясавай барацьбой паміж кулацтвам, з аднаго боку, і бяднейшым сялянствам з другога. У гэты момант кулак, акрамя сваёй схаванай палітыкі, акрамя рознага падлізваньня, выступаў і адчынена. Мы ведаем прыклады з гэтага часу, што кулакі ня толькі імкнуліся падкупіць „прадстаўніка“ савецкай улады,—гэта таксама мела месца, але мы ведаем таксама, што кулакі забівалі прадстаўнікоў савецкай улады. Забівалі старшынь сельсаветаў, забівалі старшынь камбедаў, селькораў. Кулак уступаў сваю зямлю ня надта лёгка.

Гэты момант у аповесьці неяк стушоўваецца. Тут няма належнай выпукленасьці. Рысы, якія аўтар схапіў з гэтага моманту, яны, бязумоўна, мелі месца, але-ж яны не зьяўляюцца галоўнымі, характарызуючымі гэты момант. А тым часам увесь націск аўтара аповесьці прыпадае менавіта на гэты пераломны момант.

Тыя вобразы, якія Баранавых супроцьстаўляе вобразам кулацтва, не паданы ўва ўсёй сваёй шырыні. Яны па сваёй ідэі, па замыслу аўтара адпавядаюць сваёй аснове рачаіснасьці, але не паказаны ва ўсіх дзеяньнях, у якіх падобныя вобразы прымалі ўдзел у гэты гісторычны час. З боку гэтых вобразаў няма адпаведнай актывізацыі ў клясавай барацьбе.

Самы бадай галоўны вобраз, які супроцьстаўляецца вобразам кулакоў, гэта вобраз Лукаша Вушкіна.

Вушкіна, як мы ўжо зазначалі, ня відаць амаль было аж да вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Зьяўляецца ён перад намі з усьмешкай на твары, адчувае радасьць, але-ж разам з гэтым нейкі інэртны,

бяз выразнай мэтаімкненасьці. Ён ня ў змозе нават агрызнуцца на свайго гаспадара Клямку. У яго як бы зусім няма да кулака Клямкі соцыяльнай нянавісьці. Ён толькі перастае баяцца яго як гаспадара. І нават тады, калі кулак Клямка шалеў ад злосьці, што ў яго забяруць зямлю і аддадуць Лукашу, калі ён падскакваючы да Лукаша на ўсё горла крычаў:

„Хто першы ўзыдзе на маю зямлю, галава вашэці не затрымаецца на карку. Размажджу. Чнару яго не застанецца. Садухі яму ня месцы. Мяне, мяне пазнае жульлё. Далі бог, ня зыці мне з гэтага месца! Алах—кажу! Разумееш, Лукаш? Ты, разумееш, пытаю цябе? Ведаеш маю натуру, га? (ст. 95).

У гэты нават час Лукаш застаецца замкнутым і не дае адпаведнага адказу.

„Лукаш маўчаў. Ён забыўся на бурачную жыжку, якая расплёскалася па голым стале. Глядзеў гаспадару ў запаленыя вочы і маўчаў. Яму чамусьці ня было страшна ад гэтага гаспадарскага крыку. Раней ён задрыжаўбы ад яго. А цяпер усьмешка прасілася на вусны" (ст. 95 96).

Таксама ня бачым вострага супраціўленьня да Клямкі і Трамбіцкага з боку сялян вяскоўцаў. Бачым толькі нейкае загульваньне ў суседзтва.

„Крынічнікі, пячуркаўцы, сустракаючыся з Клямкам, з Трамбіцкім, казалі:

„—Суседзямі будзем. Абы здароўе. У злагодзе будзем жыць. Знаёмы-ж... (ст. 94).

І гэта ў той час, калі з боку кулацтва на кожным кроку праяўлялася да працоўнага селяніна варожасьць. Яны на загульваньне ў суседзтва адказвалі:

„—Такія то авадні—падноска што твайго ня варты". Бязумоўна, вобраз Лукаша Вушкіна ня можа цалкам зьліцца з вобразам батрака нават тады, калі аўтар яго робіць зусім забітым, няпісьменным, які нічога ня ведае.

Гэты вобраз шмат бліжэй стаіць да серадняка, чым да батрака, таму, што батрак у той час адыгравaў у барацьбе з кулацтвам куды большую ролю, як „загульваньне ў суседзтва" з кулаком, як гэта паказана ў аповесьці. Батрацтва і беднота зьяўляліся ў той час адзінай апорай партыі і савецкай ўлады на вёсцы ў барацьбе з кулацтвам, у барацьбе за перабудову старой вёскі. А ў Баранавых атрымоўваецца нібы загульваньне з кулаком у суседзтва. Хоць яго загульваньне нам Баранавых паказвае з сарказмам да кулака.

Такім чынам мы разгледзелі вобразы кулацтва, як прадстаўнікоў буржуазнай клясы. З другога боку, мы паказалі тыя вобразы, якія аўтар аповесьці так ці іначай супроцьстаўляе пасвойму гэтай кулацкай частцы вёскі. Асноўным вобразам з апошніх—гэта Лукаш Вушкін і працоўная маса сялян у цэлым—вёска.

Нас яшчэ цікавіць вобраз „прадстаўніка" мясцовай савецкай ўлады Сініцкага. Сініцкі, як мы бачым з аповесьці, здрадзіў савецкай ўладзе, ідэям працоўных і пайшоў на згодніцтва з кулацкай часткай вёскі.

Гэты вобраз у сваім учынку спачатку як-бы компромэтуе савецкую ўладу. Сініцкі—прадстаўнік земаддзелу выканкома—замест таго, каб абразаць кулацкія валокі і раздаваць іх безьзямельнаму сялянству, пачынае об'ектыўна абараняць гэтыя валокі: заводзіць з кулакамі дружбу.

Каго-ж сабой ўяўляе вобраз Сініцкага ў псыхолёгічным разрэзе? Па-першае, гэта чалавек эгоцэнтрык. Яго зусім ня цікавіць „пабочнае", грамадзкае. Ён выключна сочыць за сваім „я". Ён кажа:

„Што мне да нейкіх пабочных сьпеваў! Я павінен мець на ўвазе, што гэта мая пласьцінка сыходзіць. Таму і павінен сачыць за ёю—не прапусьціць аніводнае яе ноты, не раскідаць мае ўвагі наабопал мяне. Гэта і будзе маё „апрадзяліўся". Я яго павінен мець на ўвазе і толькі ў уяўленьні

музычным не парушаным. Таму павінен мець, што я для яго існую, а яно для мяне“. (ст. 102).

Для яго галоўнае—скласьці ўмовы жыцьця для самога сябе. Праўда, калісьці Сініцкі крычаў: „Н-няхай жыве р-рэволюцыя ўва ўсім сьвеце“! Але гэта было калісьці. „Больш рэволюцыйнасьці ў Еўстафія Прахоравіча, як да гэтага часу, так і пасьля—такой заядлай ня было. Магчыма таму, што непатрэбна была рэволюцыйнасьць“ (ст. 101-102).

Баранавых у вобразе Сініцкага высоўвае хісткага інтэлігента. Таго інтэлігента, праз якіх варожыя пралетарыяту і ўсім працоўным соцыяльныя групоўкі распаўсюджваюць у савецкіх установах свае ідэі, праз якіх імкнуцца правесьці сваю політыку.

Фальш Сініцкага, як прадстаўніка мясцовай ўлады, як прадстаўніка (загадчыка) земаддзелу выканкому, аўтарам зусім расчыняецца. І як мы бачым пад канец аповесьці, Сініцкі за свае ўчынкі, за здраду працоўным арыштоўваецца.

Баранавых ярка падкрэсьлівае, што гэта ня сумленны, адданы прадстаўнік Савецкай ўлады, гэта не абаронца працоўных. Сапраўдным абаронцам працоўных, іх кіраўніком, які стаіць за праўду, які дапамагае працоўным будаваць лепшае жыцьцё—гэта зьяўляецца партыец Мацьвейчык. Хаця гэты вобраз паказаны цьмяна, але ён адчуваецца тэй сілай, тым падмуркам, на якім будуецца новая вёска, на якім будуюцца цяперашнія колгасы і саўгасы. Гэты вобраз зьяўляецца нязьменным правадніком працоўных у іх будаўніцтве. Гэты вобраз характарызуе нам сам Сініцкі.

„Канешне,—кажа ён,—каб пра ўсё „балаўство“ маё праведаў Мацьвейчык,—мне не паздаровілася-б... Я думаю.. Ён, як сабе ні кажы, чалавек парадку і добрадзейства. Чорт іх ведае гэтакіх партыйцаў, як ён: ня жыць перш-на-перш для сябе, а для некага... памойму адна недарэчнасьць. А ён іменна, жыве для ўсіх гэтых засмуголеных, што ня ўмеюць зьвязаць два словы, людзей. Па-мойму—бязглузьдзіца.

„—І канешна, каб ён ведаў, што ў маёй папцы па зямельных справах ляжыць каля дваццаці неразгледжаных заяў розных Вушкіных.. ён напэўна ашалеў-бы...“ (ст. 111-112).

Ужо гэтая характарыстыка вызначае нам вобраз Мацьвейчыка, як чалавека адданага справе працоўных, справе будаўніцтва новае вёскі.

Астатнія вобразы, якія сустракаюцца ў аповесьці „Чужая зямля“ (а іх досыць шмат) чаго-небудзь самастойнага сабой не ўяўляюць. Усе яны так ці іначай зьяўляюцца ўскоснымі дапаможнікамі для выяўленьня характараў асноўных, характарызуемых намі вобразаў.

Галоўныя псыхолёгічныя вобразы аповесьці — „Чужая зямля“ намі разгледжаны. Іншыя, не псыхолёгічныя вобразы ўяўляюць сабой бадай ня меншы інтарэс, у сэнсе выяўленьня агульнай накіраванасьці і ідэі твору, але спэцыяльна я на іх застанаўляцца ня буду, а абмяжуюся кароткай іх агульнай характарыстыкай, — на колькі яны сугучны, компануюць з вобразамі псыхолёгічнымі.

Композыцыя аповесьці цалкам компануе характару разьвіцьця псыхолёгічных вобразаў. Тут нельга ўзяць які-небудзь вобраз у паасобку ад іншых вобразаў і ўявіць цалкам яго клясавую сутнасьць. Кожны вобраз уяўляе сабой частку сыстэмы, у якой адчуваецца тая ці іншая соцыяльная група або кляса. Вобразы рухаюцца масай. Адчуваецца масавая сугычка вобразаў аднаго соцыяльнага пласту з вобразамі другога, супроцьлеглага па сваёй мэтаімкненасьці. Увесь час узьнікае супярэчнасьць паміж вобразамі не на глебе індывідуальнага характару, а на глебе соцыяльна-клясавага, на глебе клясавых ідэалаў.

У час бела-польскай окупацыі шырока дзейнічаюць вобразы кулакоў і зусім мала вобразы працоўных. Зьмяняюцца гісторычныя абставіны, улада пераходзіць у рукі працоўных—бачым адваротнае: шырока дзейнічаюць

вобразы працоўных, а кулацтва неяк згрупавана толькі каля свайго хутара. Яму няма разгону.

Гэта цалкам компэнуе з агульнай накіраванасьцю аповесьці, з яе ідэяй. Тое самае можна наглядаць і ў пэйзажных вобразах.

Калі падаецца пэйзаж вёскі часу бела-польскай окупацыі, то ў ім (пэйзажы) мы бачым нешта забітае, нягрыгледжанае, гніпое, на якое і сонца ня сьвеціць і ніхто ўвагі не зварочвае. Хаты ўросшы ў зямлю, стрэхі параскіданы, вокны пазатыканы анучамі. Вёска—нібы сірата якая, што ня мае каму паскардзіцца, ня мае свайго абаронцы. Тады як хутары, у якіх жывуць кулакі, шумяць вясёласьцю, бурляць жыцьцём. У хутарох адбываюцца балі, кахаецца бязьдзейная моладзь, адчуваецца іх апякун—белапольская ўлада.

Зьмяняецца політычны лад, бачым зусім адваротнае і ў пэйзажы. Дастаткова глянуць на пэйзаж той самай вёскі, і ў ім можна ўбачыць нешта радаснае, расквітаючае. Растуць новыя будынкі, якія ўздымаюцца высока. Праглядваюць вялікія сьветлыя вокны. Адчуваецца як, з усьмешкай на твары, рухаецца працоўнае сялянства—будуе лепшае жыцьцё.

Глянуць на хутар, там нешта застылае. Ці калі ўзяць пэйзаж прыроды, які падаецца ноччу, у час белапольскай окупацыі, бачым нешта сумнае, замёрлае.

„Цемра ночы аж сыпле іскры. На небе ані аднае зоркі. Але цёплая ноч. Ціха на абшарах вясковых сядзіб, ні аднаго гуку. Там, на выгане, што здратаваны конскімі ды каровінымі капытамі, таксама ціха. Перавернутае чорнае куп'е-жужалка маўчыць, нібы дрэмле. І аж да раніцы дрэмле, датуль, пакуль ізноў не раскатурхаюць яго, не перавернуць на другі бок конскія ды каровіны капыты (ст. 51.).

Як бачым, і композыцыя і пэйзаж цалкам адпавядаюць псыхо-ідэолёгічнай накіраванасьці твору, яго ідэі.

Гэтая сугучнасьць, гэтая адпаведнасьць ва ўсіх компанетах сьведчыць аб ступені мастацкасьці твору, сьведчыць аб тым, што С. Баранавых асіліў свой творчы замысел, адлюстраваўшы рачаіснасьць праз сыстэму вобразаў, выявіўшы праз гэтую сыстэму ідэю таго соцыяльнага пласту сялянства, быцьцё якога вызначыла і самога пісьменьніка.

Бязумоўна ступень мастацкасьці аповесьці „Чужая зямля" мы ня ўздымаем высока таксама, як і не апускаем яе нізка.

Ступень мастацкасьці ўзьняць высока нельга таму, што на самой аповесьці адчуваюцца часткова нейкія нарасьці. Маюцца некаторыя кавалкі, якія, калі не мяшаюць, не зацямняюць выяўленьню асноўнай ідэі аповесьці, дык ва ўсякім разе бяз іх магчыма абыйсьціся.

Гэтую нарасьць чытач можа адчуць сам, калі дойдзе ў аповесьці да таго месца, дзе падаецца вясельле ў вёсцы Пячуркава. Калі Габрусь з вёскі Машкі бярэ солтысавага брата Тодара дачку Паладзю і дзе польскі жаўнэр Казюк застрэліў Ваціка, сына батрака. Гэтае месца неяк стаіць у баку ад выяўленьня асноўнай ідэі твору. Гэтае месца ўяўляе сабой якбы асобны ад аповесьці малюнак.

Таксама нельга не заўважыць на самы канец аповесьці, дасказ, які падаецца ў выглядзе дзеньніка. Гэты дзеньнік дае разьвязку аповесьці. Бязумоўна, бяз гэтага дзеньніка ці бяз эпілёга аповесьць была-б без канца, таму што дзеньнік падае весткі, што абрэзалі кулакоў, падае весткі аб лёсе Лёлі і Сініцкага. Але-ж самы дзеньнік зьяўляецца некаторым паўтарэньнем ужо таго, што падавалася, ці лепш сказаць выяўлялася ў процэсе разьвіцьця ранейшых падзей. Менавіта гэтае паўтарэньне мае месца ў абмалёўцы вобраза Ромуся. Вобраз Ромуся, у асноўным яго сьветаадчуваньні, нам ужо падаецца да дасказу аповесьці. У дасказе ж цікава для чытача даведацца, якія ў Ромуся, як кулацкага сына, адносіны да

службы ў чырвонай арміі. Але ўжо зьяўляецца зусім непатрэбным падрабязнае спыненьне на яго агульнай накіраванасьці, як клясавай існасьці яго, што робіць ў дзеньніку С. Баранавых.

Патрэбна таксама адзначыць і на культуру мовы С. Баранавых.

Наогул мова пісьменьніка багата сваёй лексікай (лексікай сялянскай), адзначаецца сакавітасьцю. Праўда сустракаюцца некаторыя словы вузкага провінцыялізму: „карабкалася“, „джэгаючы“, „прывярзецца“, „балбес“, „гавэнда“, „важач“, „шалыгаў“ і інш. Сустракаюцца ня зусім зразумелыя словы: „трыб“, („зьбілася з трыбу“), „чнару“, „бі корцікам“.

Таксама можна сустрэць у С. Баранавых ня зусім выразныя сказы: „ня знойдзеш гадзіннага часу“, „даігрывай музыку“, „тлела доўгім кнотам“ і інш.

Але на падставе азначаных недахопаў нельга сказаць, што аповесьць „Чужая зямля“ не мастацкая.

Ужо тое, што аповесьць „Чужая зямля“ ў асноўным, па сваёй форме адлюстраваньня, адпавядае гісторычнай рачаіснасьці, адпавядае самому зьместу і ідэі аповесьці, ідэі пэўнага соцыяльнага пласту сялянства, на пэўнай ступені гісторычнага разьвіцьця, кажа, што аповесьць заслугоўвае ўвагі з мастацкага боку.

Якую-ж асноўную ідэю праводзіць аўтар праз сваю аповесьць „Чужая зямля“, і з якой яркасьцю гэта ідэя выяўляецца для ўспрыняцьця чытачу?

На наш погляд, асноўная ідэя, якую аўтар паклаў у аснову сваёй аповесьці і якую ў пэўнай меры праз дынаміку вобразаў выявіў—, гэта ідэя ўзаемаадносін дзьвюх супроцьлеглых па сваёй канчатковай мэце кляс: з аднаго боку кляса куляцтва і, з другога боку працоўнае сялянства. Баранавых на працягу ўсяе аповесьці падкрэсьлівае характэрныя рысы кулака; яго эксплёататарска-буржуазныя тэндэнцыі, яго прагнасьць да нажывы, яго нацыяналізм, індывідуалізм, тэндэнцыя паказаць сябе, вылучыць сябе чым-небудзь з грамадзтва. На працягу ўсяе аповесьці гэтыя характэрныя рысы Баранавых падкрэсьлівае ўсім узмахам пяра. Ён адносіцца да гэтых рыс адмоўна, з агідай. Ён цалкам стаіць на баку працоўных, якія раней адчулі на сабе ўсе гэтыя кулацкія тэндэнцыі, якія пры цару і белапольскай окупацыі Беларусі зьяўляліся ўгнаеньнем глебы для буржуазна-кулацкай кветкі, пах якой быў прыемным і царскаму і пасьля белапольскаму ўраду. Ён цалкам стаіць на баку тых, якія з энэргіяй перабудоўвалі фэўдальную вёску, якія разбураюць глебу буржуазна-кулацкага квятніка і якія цяпер узорваюць глебу вялікіх колгасаў і саўгасаў і садзяць чырвоныя кветкі, пах якіх прыемны для ўсяго працоўнага народу і пах якіх канчаткова атручвае Трамбіцкіх, Клямкавых, Ліпскіх, як клясавую існасьць.

Мы бачым, як увесь гэты кулацкі пэрсонаж аповесьці: і Клямка, і Трамбіцкі, і Ліпскі, і Ромусь, і Лёля, сваёй клясавай сутнасьці не мяняюць. Абставіны савецкай ўлады на іх ня дзейнічаюць. Яны ўвесь час хаваюць у сабе затоеную злосьць і чакаюць выпадку зноў схапіць за шыю працоўных.

Яны чакаюць сваіх збавіцеляў. Улада працоўных іх ня грэе.

„—Тыдзень, вашэці, месяц, год, — кажа Клямка да Трамбіцкага, — год, будзем чакаць, а ня будзем рабіць вясельля. Датуль будзем чакаць, пакуль апошні іхні лысы чорт ня выедзе з мястэчка. Так, так, проша пана.

„—Нават паўтара гады будзем чакаць, — кажа Трамбіцкі. — Канешна, гэтага ніколі ня будзе. За паўтара гады: — уга! Як векавечны камень уросшы ў зямлю, і яго ня скранеш з месца—гэтак нашыя за паўтара гады ўрастуць у Маскве.

Тое-ж самае мы бачым, калі Ромуся забіраюць у чырвоную армію.

Трамбіцкі увесь час яго навучае каб ён ня служыў бальшавікам, каб

ён, як толькі чуць што будзе чуваць, што набліжаюцца палякі, уцякаў да хаты.

— „Абы толькі чуць што, дзеткі, казаў Трамбіцкі,—ну, рухі вайсковыя і ўсё такое—дамоў адразу. Адразу ідзі дамоў. Ідзі, каб мала хто бачыў цябе. Бо нашы... нашы, ягамосьць, незаводня тут будуць. Тады згніеш там, прападзеш у гэтых недавяркаў". (ст. 83).

Мы бачым, што ў кулака адна надзея на зварот „нашых".

Яшчэ досыць яскрава сьцьвярджае думку пісьменьнік Баранавых, што кулак ніяк ня можа пайсьці за працоўнымі—гэта вобраз Лёлі.

Здавалася-б Лёля, як маладая асоба, магла-б успрыняць уплыў новай грамадзкасьці, паддацца яе ідэям. Але гэта ня так. Лёліны думкі, погляды сходзяцца з поглядамі бацькі, з поглядамі Трамбіцкага. Яна таксама тоіць агіду да бальшавікоў, таксама ня можа зьліцца з новым.

Калі ўперад мы яе бачылі вясёлай, бесклапотлівай паненкай, якая марыла пра каханьне, замужнасьць, дык цяпер, у абставінах улады працоўных, гэтая бесклапатлівая паненка абуджана сваімі клясавымі інтэрэсамі, нянавісьцю да бальшавікоў. Яна таксама лічыць вялікай памылкай, што Ромусь пайшоў у чырвоную армію.

„Лёля часта ляжала дома, ужо ў пасьцелі, з думкамі невінаватага дзіцяці:

„Дрэнна Ромусь робіць. Яму казаў бацька,—ня слухае: прападзе. Прыдуць палякі—ня вернецца. Позна тады будзе. Да бальшавікоў могуць прылічыць (ст. 91).

Нават Ромусь, якого мабілізавалі ў чырвоную армію, і той ніяк ня можа зьліцца з колектывам апошняй. Ён ня можа абараняць тых ідэй, якія абараняе чырвоная армія. Яго клясавая прырода ня можа распусьціцца нават у такім колектыве, як чырвоная армія. Ён увесь час шукае тэй шчыліны, праз якую-б можна было-б уцячы. Урэшце гэту шчылінку ён знаходзіць і ўцякае. Ідучы па дарозе дамоў, ён марыць: „Мне здавалася, во-во нагоняць палякі, захопяць палякі, адбяруць мяне... добрыя мае палякі" (ст. 142).

Ідэю, што кулак да канца вораг працоўных, Баранавых яскрава і праўдзіва, такім чынам, даводзіць да канца.

Яскравым відаць і тое, што толькі працоўныя самі, пад кіраўніцтвам сваёй партыі, пад кіраўніцтвам Мацьвейчыкаў, могуць будаваць сваё лепшае жыцьцё. На баку апошняга знаходзіцца і ўвесь аўтор аповесьці. Але ня гледзячы на ўсю шчырасьць С. Баранавых, пры выяўленьні соцыяльнай супярэчнасьці, мы яго аднясём да пласту серадняка, серадняка, ідучага ўсьлед за беднатой.

У гэты соцыяльны пласт мы адносім С. Баранавых на падставе разглядаемай аповесьці, на падставе аналізу сыстэмы яго вобразаў.

Ужо той факт узаемаадносін працоўнага сялянства, „батрака" Лукаша Вушкіна да кулацтва, як да супроцьлеглай па сваёй клясавай сутнасьці соцыяльнай групы, наш погляд сьцьвярджае.

І „батрак" Вушкін і сялянства (працоўнае) у цэлым да кулацтва адносяцца з нейкай мяккасьцю, уласьцівай менавіта серадняку, але не беднаку і ні ў якім разе батраку.

Баранавых гэтыя ўзаемаадносіны не паказаў у данай аповесьці ў абвостраных клясавых супярэчнасьцях, у гарачым клясавым запале, а ў нейкім загульваньні працоўнага сялянства з кулаком у суседзтва, хоць гэтае загульваньне, поўнае сарказму, які балюча б'е па кулацкай псыхолёгіі і які паказвае бязумоўную супярэчнасьць паміж кулацтвам і працоўным сялянствам.

Паказаць у абвостранай клясавай барацьбе, паказаць адбіваемы ў аповесьці гісторычны момант у гарачым клясавым запале з боку працоўнага сялянства і асабліва з боку батрацтва Баранавых ня мог у сілу таго, што той соцыяльны пласт серадняцтва, прадстаўніком якога зьяўляецца Баранавых, гэтай клясавай вастраты,

гэтага гарачага запалу ня мог так адчуць, як адчуваў бядняк і асабліва батрак у гэты гісторычны момант.

Гэтае наша аднясеньне С. Баранавых да пласту серадняцтва, да таго пласту серадняцтва, якое ідзе за беднатой, за сьцягам комуністычнай партыі, яшчэ сьцьвярджаецца і тым, як у аповесьці паказваецца час белапольскай окупацыі Беларусі.

Мы ведаем, што гэты момант таксама характэрны абвостранымі клясавымі адносінамі з боку працоўнага сялянства і асабліва бядняцтва і батрацтва (ня кажучы ўжо аб пралетарыяце, паколькі даных вобразаў у аповесьці няма) да панска-польскага ўладства.

Мы ведаем, што ў часы бела-польскай окупацыі Беларусі белапольская ўлада цалкам стаяла на абароне эксплёатуючай клясы.

Для заможнікаў, капіталістых, кулакоў былі створаны ўсе ўмовы для іх далейшага росту праз эксплёатацыю працоўных мас.

Працоўнае сялянства, было цалкам супроць такой ўлады. Працоўнае сялянства з энэргіяй ішло на дапамогу пролетарыяту змагацца супроць окупантаў-паноў і іх парадкаў.

Працоўнае сялянства ўжо ўбачыўшы проблеск Кастрычніка, убачыўшы Савецкую ўладу, як ўладу працоўных, бязумоўна не магло востра не супярэчыць зноў той-жа панска-капіталістычнай ўладзе, пад якой праходзіла ўсё жыцьце селяніна, сэнс якога ён ужо зразумеў.

Мы ведаем, што ў гэты час унутры ўлады акупантаў адбываецца вострая барацьба пролетарыяту і працоўнага сялянства за зварот улады саветаў.

Тысячы пролетарыяў, тысячы беларускага сялянства ідуць у лясы, складаюць узброеныя партызанскія атрады і адтуль б'юць па ўладзе акупантаў, па ўладзе зямляўласьнікаў-капіталістых.

Вось гэты характэрны момант таксама належным чынам не адзначаны ў аповесьці. У аповесьці гэты момант паказаны без асаблівых клясавых супярэчнасьцяй, якія (абвостраныя супярэчнасьці) на справе, у рачаіснасьці мелі месца.

Гэтага С. Баранавых у сваёй аповесьці дакладна не паказаў.

Наогул аповесьць „Чужая зямля“ заслугоўвае ўвагі, як па каштоўнасьці тэй ідэі, якую яна выяўляе, так і з боку мастацкага.

Працоўнага чытача яна будзе запальваць клясавай нянавісьцю да кулацкіх ідэй, будзе запальваць творчым энтузыязмам у барацьбе за нашае будаўніцтва.

Ал. Кучар

Пра адну рэакцыйную аповесьць

(*Кузьма Чорны—„Лявон Бушмар“*)

„Чалавеку цяжка перарабіцца адразу. Можна думаць і гаварыць іначай, а сам чалавек доўга будзе ранейшым. Так, як ляцяць кожны год, абы толькі замакрэе веснавы сьнег, гусі над Бушмаравай сялібай, так, як адлятаюць яны над гэтымі-ж лясамі назад, абы толькі пацямнее ад старасьці на іржышчы белае павуціньце, гэтак сваімі дарогамі будзе хадзіць чалавек, пакуль увесь узыдзе на дарогі іншыя.

(*„Лявон Бушмар“, стар. 48*).

I.

Пролетарская літаратура ў сучасны, рэконструкцыйны пэрыод паставіла перад сабой вялікую задачу аўладаньня творчым мэтодам дыялектычнага матэрыялізму—як адзіным мэтодам пазнаньня рачаіснасьці і актыўнай пераробкі яе.

Пролетарская літаратура паставіла перад сабой задачу паказу рачаіснасьці ва ўсёй яе паўнаце, ва ўсіх яе супярэчнасьцях, перамаганьні гэтых супярэчнасьцяй і станаўленьні новае якасьці, паставіла перад сабой задачу найбольш поўна і праўдзіва адбіць клясавыя баі, якія адбываюцца ў Савецкім Саюзе пры рашучай схватцы за перамогу соцыялізму, і самой быць дзейным і актыўным фактарам у гэтых баёх.

Пролетарская літаратура паставіла перад сабой задачу паказу чалавека нашае эпохі, як сапраўднага будаўніка, чалавека актыўнага, дзейнага, які перабудоўвае сьвет, чалавека, які адначасова сам зьмяняецца ў гэтай перабудове сьвету, чалавека ва ўсіх яго супярэчнасьцях, у станаўленьні і нараджэньні новага чалавека. Інакш кажучы, пролетарская літаратура змагаецца за паказ жывога чалавека, клясавага чалавека.

З надворнага боку і з першага погляду апошняя аповесьць Кузьмы Чорнага „Лявон Бушмар“ куды ў большай ступені, ніж іншыя яго творы, ня толькі ня супярэчыць асноўным задачам, пастаўленым перад рэволюцыйным пісьменьнікам для адбіцьця рачаіснасьці рэконструкцыйнага пэрыоду, а, наадварот, адпавядае гэтым задачам, стаіць у поўнай адпаведнасьці з гэтымі задачамі. Калі ў ранейшых творах Кузьмы Чорнага, як раман „Зямля“, зборнік апавяданьняў „Верасьнёвыя ночы“, бракавала ў адбіцьці пасьлякастрычнікавае вёскі, соцыяльнай гастрыні, поўнага адбіцьця клясавых узаемаадносін, клясавага змаганьня, дык у гэтай апошняй аповесьці здавалася-б усё добра.

Тут вам і колектывізацыя на вёсцы, і абрэзка зямлі кулака, і экслёатацыя кулаком Бушмарам батракоў і, нарэшце, адчынены наступ кулака на колгас. З дапамогай падкулачнікаў Бушмар падпальвае колгас.

А людзі ў Кузьмы Чорнага яшчэ якія „жывыя“, ні жаднай адзнакі штампу, шаблённасьці...

Чаго-б здавалася больш можна патрабаваць ад рэволюцыйнага пісьменьніка?

І ўсё-ж такі, ня гледзячы на ўсе надворныя адзнакі, нібыта нават пролетарскага твору, мы пастараемся давесьці, што аповесьць „Лявон Бушмар“ ня толькі не зьяўляецца пролетарскім творам, а выражае проста троцілежныя пролетарскаму разуменьню тае рачаіснасьці, якую яна падае, погляды і об'ектыўна служыць на руку клясаваму ворагу пролетарыяту.

Зразумела, што давесьці гэтае зможа толькі той, хто, ня гледзячы на надворныя адзнакі таго ці іншага твору, акунецца глыбей у самую суцясьць твору, а менавіта паспрабуе адзначыць тыя першапачатковыя падставы, на якіх будуецца творчасьць пісьменьніка.

Вось з пункту погляду аналізу першапачатковых карэньняў, на якіх будуецца творчасьць К. Чорнага і, у прыватнасьці, аповесьць „Лявон Бушмар“, як найбольш таленавітага і глыбокага твору з усяе творчасьці пісьменьніка, мы і пяройдзем да нашага разгляду.

* * *

На сваім творчым мэтодзе Кузьма Чорны—матэрыялісты. Але ён у сваёй творчасьці стаіць на позыцыі яго матэрыялізму, які Пляханаў назвае сэнсуалістычным матэрыялізмам. Чорны працягвае традыцыі натуралістых, творчы мэтод якіх

„был теснейшим образом связан с точкой зрения того материализма, который Маркс назвал естественно-научным и который не понимает, что действия, склонности, вкусы и привычки мысли общественного человека (падкрэсьлена ў тэксьце—Ал. К.) не могут найти себе достаточное об'яснение в физиологии или патологии (у тэксьце—Ал. К.), т. к. обусловливаются общественными отношениями. Оставаясь верным этому методу, художники могли изучать и изображать своих „мастодонтов“ и „крокодилов“, как индивидуумов, а не как членов великого целого“

(Г. В. Плеханов—Собрание сочинений. Том XIV, стар. 146. Падкрэсьлена мною—Ал. К.).

Чорны стаіць на позыцыях Гольбахаўскага, так званага „фізыолёгічнага, матэрыялізму“. Ён стаіць на пункце погляду грубога мэханістычнага дамарксавага матэрыялізму. Асновы гэтага матэрыялізму мы знаходзім пад пакровам мастацкіх вобразаў у апошнім пэрыдозе творчасьці Кузьмы Чорнага.

II.

„Зьвераватую панурасьць Лявону Бушмару перадаў бацька—княжьцкі дробны арандатар“—так пачынаецца аповесьць К. Чорнага „Лявон Бушмар“. Ужо ў гэтым пачатку зразу адчуваецца, што „зьвераватую панурасьць“—гэта значыць тую кулацкую «зьвераватую панурасьць“ Лявона Бушмара, якая вырасла ў магутны вобраз кулака-прыгнятацеля, душыцеля ўсяго жывога—перадала яму спадчыннасьць ад бацькі, а не формавалі, акрамя спадчынасьці, тыя соцыяльныя ўмовы і адносіны, у якіх з самага свайго нараджэньня жыў Лявон Бушмар. Але, бязумоўна, гэтыя некалькі радкоў яшчэ абсолютна ні аб чым не гавораць. Прасочым за ходам, разьвіцьцём і дзейнасьцю кулака Лявона Бушмара далей.

Лявон Бушмар у спадчыну ад свайго бацькі, акрамя свае „зьвераватае панурасьці,“ атрымаў „добрую дзялянку хутарской зямлі“. Жывучы ў адзіноце на хутары, „малы ваўчок—Лявон“ так адзічэў, што ў большасьці цураўся зусім людзей, у бліжэйшую вёску амаль ніколі не паказваўся: „Людзі ня любілі Бушмара, і ён ня любіў людзей. Ён быў зьвераваты з натуры свае і, яшчэ з бацькам жывучы, прывык адмяжоўвацца заўсёды ад усіх“.

А вось—„Сярод лясоў і поля, Лявон Бушмар весялеў, рабіўся вайстрэй-

шым на слова". Адным словам, па волі адзіноты, ў якой жыў Лявон Бушмар, нарэшце, па волі „дзікага лесу і хмызьняку", якія валодалі Бушмарам і да якіх ён (Бушмар) ставіўся з надзвычайнай чуласьцю і любоўю,

„здавалася, што ён (Бушмар—Ал. К.) хоча гэта пазбавіцца ўсяго лішняга, каб як мага глыбей чуць вялікую музыку лясное адзіноты".

Вось па волі ўсіх гэтых прычын, дадаючы яшчэ прычыны фізыолёгічнай ненасытнасьці і незадаволенасьці жанчынамі, якія яму былі блізкімі, Бушмар канчаткова ператвараецца ў зьвера, „зьвера, навокал якога павінны быць пакрыўджаныя, зьвера, які топча, бязьлітасна топча ўсё жывое".

„Адзін кусьцік, малады, веснавы, бялявы папаў пад Бушмараў бот. Падкаваная набойка глыбока ўвагнала яго ў зямлю".

З яго вырас той зьвер, які спачатку бязьлітасна зьдзекуецца з яго наймічкі і адначасова жонкі Амілі, які да гэтага забіў польскага паручніка, прыбіў да сьмерці свайго, можна сказаць, „брата" Вінцэнтага, зьбіў раённага службоўца, які прыехаў спаганяць з яго штраф і падатак, зьдзекамі давёў да таго, што другая яго жонка Галена таксама пакінула яго, і, нарэшце, падпаліў колгас.

Здаецца, пералік толькі дзеяньняў, зробленых Бушмарам, можа прывесьці ў жах чытача і самую глыбокую нянавісьць да Бушмара, аднак менавіта дзякуючы, мабыць, гэтым дзеяньням у чытача, як ні дзіўна, застаецца пэўнае дадатнае ўражаньне ад вобразу Бушмара. Больш таго, знаходзяцца нават мотывы для апраўданьня яго паступкаў...

— Можа гэта толькі ўражаньне, павярхоўнае, ілюзія ад твору?—спытае чытач.

На вялікі жаль не. Гэта нясуб'ектыўнае ўражаньне і ня ілюзія, гэта мае глубокія карэньні ў самой аснове творчасьці К. Чорнага, жадае гэтага, ці не жадае пісьменьнік, гэта заложана і об'ектыўна бытуе ў творчым мэтодзе Чорнага.

Прыпомніўшы ранейшыя творы Чорнага, прыкладам, такія, як зборнік апавяданьняў „Верасьнёвыя ночы", раман „Зямля", мы адначасова прыпамінаем, што ў гэтых творах усе дзеі, паступкі, імкненьні і жаданьні людзей маюць пэўную прычынную абумоўленасьць. Яны не ўсялюцца ў гэтых людзей „боскай сілай", а прычынна абумоўлены фізыолёгічнымі патрэбамі ў гэтых дзеях і паступках. З гэтага пункту погляду Кузьма Чорны зьяўляецца матэрыялістым. Але з другога боку, менавіта таму, што гэтыя дзеі, жаданьні і імкненьні абумоўлены фізыолёгічнымі асаблівасьцямі чалавека, а не соцыяльнымі, так цяжка ў апавяданьні „Верасьнёвыя ночы" адрозьніць кулака ад селяніна-бедняка на вёсцы. Усе, і кулак і бядняк, аднолькава адчуваюць і дзейнічаюць, падпарадкуючыся фізыолёгічнай сваёй арганізацыі. З гэтае-ж прычыны цяжка адрозьніць у романе „Зямля" кулака Сабасьціяна ад яго брата бедняка. Розьніца ў іх толькі ў працаздольнасьці. І вось з гэтае-ж прычыны ў нас ня ўзьнікае жаднае нянавісьці і да кулака Бушмара, гэтага зьвера-душыцеля, зьвера-прыгнятацеля. Кожны чалавек, ці бядняк ён, ці кулак, на месцы Бушмара зрабіў-бы тое самае. „Такім ужо хмызьняк яго ўзгадаваў, і бацька такую спадчыннасьць перадаў"—вось які вывад напрошваецца пасьля прачытаньня аповесьці „Лявон Бушмар".

Такім чынам, становяцца зразумелымі творчыя асновы Кузьмы Чорнага апошняга пэрыоду.

Гэта мэтод так званага „естественно-научного" матэрыялізму, фізыолёгічнага, грубога, мэханістычнага прымітыўнага матэрыялізму. Больш таго, у гэты мэтод урываюцца і ідэалістычныя тэндэнцыі — гэта тэндэнцыі замкнутага псыхолёгізму, які асабліва выявіўся ў яго зборніку „Верасьнёвыя ночы", романах „Сястра" і „Зямля" і на першым пэрыодзе творчасьці Чорнага складае аснову творчага мэтоду пісьменьніка.

Надзвычайна складаныя імкненьні, жаданьні, псыхолёгічныя асоцыяцыі ўзьнікаюць у поўнай замкнутасьці ў глыбінях псыхікі. Пісьменьнік не дае нам таго соцыяльна-клясавага асяроддзя і ў канчальным ліку прычыннай абумоўленасьці гэтым соцыяльным быцьцём тых складаных імкненьняў і жаданьняў, якія ўзьнікаюць у глыбінях псыхікі, якія-б складаныя яны ні былі.

Зразумела, што гэтыя позыцыі паглыбленага, замкнутага псыхолёгізму—ёсьць простая сьцежка, якая вядзе да ідэалізму.

Апошняе, між іншым, паказальна і ў тых адносінах, што так званы фізыолёгічны матэрыялізм, грубы, мэханістычны, не так далёка адыйшоў ад ідэалізму

Што называецца „крайности сходятся".

Давайце-ж цяпер пусьцімся ў невялікі экскурс па творы „Лявон Бушмар" і прасочым за дзейнасьцю Бушмара і яе абумоўленасьцю ў паказе Чорнага.

Першую жыцьцёвую школу хутаранін Лявон Бушмар прайшоў у Чырвонай арміі. З прычыны сваёй няпісьменнасьці ён тут і зьявіўся першай ахвярай.

Адзін з таварышоў па службе пісаў яму лісты дадому. Лявон хацеў аддзякаваць. Гэтым часам яму якраз прыслалі з дому пасылку. Бушмар выняў вялікі сыр і падае таварышу. Той адмовіўся і прапанаваў усім разам зьесьці сыр. І вось Лявон ня ведае, што рабіць. Стаіць ён з сырам у руках, вялічэзны, буйны, язык заплятаецца, слова ня вымавіць. (Такая ўжо фізыолёгічная арганізацыя яго, пакутуе бедны праз яе!). І беднае, „бездапаможнае дзіця", як называе яго Чорны, адчувае сябе да крыўды зьняважаным.

У другі раз, калі яму пачалі надакучаць таварышы па службе, што ён не колектыўны чалавек, Бушмар, ня змогшы справіцца з імі „языком", „у адну руку згроб нешта з траіх і шпурнуў на блізкі ложак".

У Кузьмы Чорнага кулак Лявон Бушмар ня мае ні жаднай рыскі звычайнага, штампованага кулака. Бушмар—чалавек „жывы". Ён ня толькі зьвер, ён зьвер надзвычайна чулы да прыроды, нават да людзей.

„Бушмар стаяў. І от твар яго выцягнуўся, губы сьціснуліся. Ноздры разьдзьмуліся і заварушыліся. Так зьвер чуе магутны пах лесу, зя лі, вады, вясны, адзіноты. Так-жа зьвер чуе пах цёплай крыві".

Больш таго, кулак Бушмар—гэты надзвычайна просты, шчыры і адкрыты чалавек, нават ня пробуе супраціўляцца абрэзцы яго зямлі пад колгас. Наадварот, калі пасьля першай абрэзкі адбылася другая, гэта таксама дужа яго не непакоіла, бо яно не чапала асабіста яго, яго жонкі—не краталі ў яго тое, што належыць асабіста яму. Былі тут і іншыя прычыны:

„Бушмар выбіраўся з лагчыны паволі. Паўз дарогу бялелі каморніцкія тычкі і межавыя слупы - яшчэ без самога гаспадара Бушмара вёска адціснула яго да самага лесу і ўрэзалася ў яго паплавы".

„Ужо ў наступныя дні пасьля прыходу свайго, ён спрабаваў не паддавацца. Але гаварыў ён толькі з самымі суседзямі, мець да чыненьне да начальства, хоць і да самага малога, было для яго горш усялякае пакуты". (Падкрэсьлена мною—Ал. К.). Ён тады пачынаў заікацца ад жаданьня выказаць усё як ёсьць разам. Блытаў словы, нарэшце, змаўкаў і пачынаў спачатку".

Вось праз што пакутуе чалавек! Праз тое, што з начальствам гаварыць ня ўмее!

Гэтае-ж адчуваюць нават тыя, якія абразаюць зямлю Бушмара, нават заклятыя ворагі кулака Лявона Бушмара (арганізатар колгасу Андрэй і беднякі), адчуваюць бездапаможнасьць Бушмара як фізыолёгічнай істоты. Гэтую фізыолёгічную непрыстасаванасьць Лявона Бушмара да жыцьця і пакуту праз апошняе аўтар падкрэсьлівае некалькі разоў.

„Яму цяжка гаварыць з начальствам, нават і з сельсавецкім—гэта для яго вялікая пакута. А перад раённым начальствам ён хвалюецца, заікаецца.

Начальству яго лёгка зьбіць, ён блытаецца, усё выходзіць у яго ня гэтак, як было, хоць яму і няма ніякае патрэбы гаварыць няпраўду",

Да чаго гэта ўсё вядзе аўтар? Яму трэба давесьці, што Бушмар просты і шчыры чалавек. Ён ня зманіць, нічога не захопіць, наадварот, вельмі часта свайго перадасьць. У яго няма жаднае кулацкае хітрасьці, вываротлівасьці, аб якой мы гаворым, характарызуючы кулака. Фізыолёгічная прырода не прыстасавала яго да жыцьця, а яго скубуць, шчыплюць—вось ён і валіць на пралом. Бушмар сам на сябе наводзіць лішнія паклёпы:

„Пра Амілю, як пачаў гаварыць, дык каб траха, дагаварыўся-б да паручніка, сыпаў паўсловамі, чырваней і бялеў, гаварыў усё сюды, што ня было тут патрэбна і ўгаварыў сам сябе". (Падкрэсьлена мною Ал. К.).

Бушмар жыў з сваёй парабчанкай Аміляй. Фізыолёгічны інстынкт падштурхнуў яго сыйсьціся з ёй. Бушмарава зьвераватасьць і воўчая панурасьць, а не соцыяльныя інстынкты прымушаюць яго чыніць над Аміляй нечалавечыя зьдзекі.

Хаця гэтыя нечалавечыя зьдзекі, як нам зусім зразумела, маюць пад сабой соцыяльную глебу клясавай няроўнасьці Бушмара і Амілі і мімаволі прарываюцца ў творы:

„За лета Аміля напакутвалася ў полі, Бушмар прынаймаў на поле людзей. Яму было ўжо страшна, што Аміля тут сярод іх за гаспадыню". (Падкрэсьлена мною—Ал. К.).

Але гэта толькі выпадковасьць. Усюды Кузьма Чорны старанна тлумачыць гэтыя зьдзекі нейкай асаблівай фізыолёгічнай ненасытнасьцю Бушмара да жанчын ды надзвычайна складанымі псыхолёгічнымі праявамі, якія ўзьнікаюць у глыбінях псыхікі Бушмара. Зьдзекі гэтыя пераплятаюцца з складаным комплексам прасьвятленьняў, якія наступаюць пад узьдзейнічаньнем Амілі, як жанчыны.

Той Бушмар, якога Аміля ўпрошвае „Толькі ня будзь воўкам для мяне"... „самымі пачаткамі сваіх адчуваньняў узрадаваўся гэтаму голасу". І „жанчына робіць цуд: на Бушмаравым твары зьяўляецца ласкавая мякасьць". (Падкрэсьлена мною. Ал. К.).

Пасьля ўсіх зьдзекаў Бушмар прагнаў Амілю з хутару.

Цікава, што гэтага ён сам нават ня можа вытлумачыць.

„Ён сам можа жахнуўся-б, каб мог уразумець, што гэта-ж ён сапраўды страшна зьненавідзеў яе". (Падкрэсьлена мною—Ал. К.).

„Ён не здагадваўся, ня чуў, што Амілі цяжка з ім. Ён ня мог гэтае ведаць з самае натуры свае. Сам-жа ён несьвядома адчуў дзікую радасьць з усяго гэтага". (Падкрэсьлена мною—Ал. К.).

Тут, як бачым, выступае падсьвядомае, псыхолёгічна-замкнутае, і сапраўдную прычынную абумоўленасьць гэтых тонкіх псыхолёгічных адчуваньняў аўтар ад нас хавае...

Гэта і ёсьць тая сьцежка, якая вядзе Кузьму Чорнага ад грубога матэрыялізму да ідэалізму. Грубы фізыолёгізм Чорнага тут, як мы бачым, зусім няпрыкметна пераходзіць у замкнуты псыхолёгізм. Гэтыя тэндэнцыі надзвычайна часта трапляюцца ў творчасьці Чорнага і як мы ўжо казалі на першым этапе творчасьці складаюць творчыя асновы пісьменьніка.

Тое, што Кузьма Чорны стаіць на позыцыях сэнсуалістычнага матэрыялізму, тое, што ён тлумачэньне соцыяльным процэсам шукае ў патолёгіі, у фізыолёгіі—гэтае даводзіць увесь твор „Лявон Бушмар".

Аднак давайце разгледзім яшчэ адзін цікавы прыклад,

Калі Бушмар пасьля Амілі ажаніўся другі раз і надзвычайна рэўніва абараняў сваю новую жонку Галену нават ад людзкога вока, „яшчэ больш, здаецца, ён пачаў ненавідзець кожнага, хто заходзіў калі-небудзь на хутар".

Вось у гэтую пару „на Бушмара наклалі вялікі штраф. Бушмар яго ня выплаціў, так сама, як і не аддаваў падатку. Хтосьці прыехаў з раёну спагнаць з яго штраф. Бушмар

захваляваўся, пачаў заікацца, злаваць. А ў тыя дні штосьці не паладзілі яны з Галенаю, і ён тады хадзіў, як звер. Якраз здалося яму (ці можа гэта і сапраўды было), што раённы начальнік вельмі нешта прыглядацца пачаў на Галену, а тая не прагнала яго з хаты, што было патрэбна дзеля Бушмаравага спакою. І от на дварэ раённы службовец штосьці пачаў гаварыць Галене, сьмяючыся гэтак, як сьмяюцца прыгожым жанчынам. Бушмар, сьціснуўшы зубы, схапіў службоўца за пояс, пераімчаў упоперак цераз двор і кінуў на той бок плоту..."

„...А назаўтра Бушмара арыштавалі. Тут было ўсё—і нявыплата падатку, і лясныя высечкі, і калецтва раённага службоўца (той доўга ляжаў у больніцы і ледзьве ачуняў), і Бушмара засудзілі на 2 ці 3 гады адседкі..."

Мы гаворым аб тым, што кулак у сілу свайго соцыяльна-эканомічнага становішча, адчуваючы, як пад яго нагамі траціцца апошняя апора і глеба яго існаваньня, яго гаспадарка, адчуваючы надыход няўхільнага моманту ліквідацыі яго як клясы, адчуваючы разбурэньне тэй эканомічнай базы, на якой трымаецца кулацтва, у сілу вось гэтых прычын клясавая прырода кулака кідае яго на азьвярэлае супраціўленьне савецкай уладзе, на забойства вясковых актывістых, падпалы колгасаў і г. д.

А Бушмар, як кулак, бачыце, выключэньне з гэтага палажэньня. Ім зусім ня кіруюць клясавыя стымулы абароны свайго дабра, свае гаспадаркі. Не, зусім ня гэтае яго непакоіць. Біолёгічны інстынкт абароны жанчыны ад погляду „раённага службоўца". Галена важна Бушмару, а не яго гаспадарка і дабро. І можна быць упэўненым, што калі-б „раённы службовец" не паглядаў дужа ласкава на Галену, дык Бушмар-бы і пальцам не крануў яго (не супраціўляецца-ж ён абрэзаць зямлі!), хоць гэты „раённы службовец" вывеў-бы ў яго з хлява апошнюю карову.

Ці невыпадковасьць гэта ў творы? Зусім не. У аповесьці ёсьць цікавы эпізод забойства Бушмарам польскага паручніка.

У пачатку аповесьці, дзе прыводзіцца гэтае здарэньне, яно здаецца зусім лішнім у аповесьці. Бушмар забіў паручніка за тое, што той пасягаў на Бушмараву каханку Амілю.

„Ён чуў, як паляк дробна сыпаў кавалерыйскімі жартамі, а Аміля, як шамкамі, зьвінела вясёлым сьмехам і прабавала адказаць нешта, падрабляючыся пад польскую мову:

— Цяпер позна...

— Панна муві „цяпер"—хо-хо!

. . . . . .

Бушмар цярпеў і дачакаўся канца; было з палавіна ночы, калі ён убачыў паляка аднаго. Той ішоў дарогаю, мінаючы ў баку лес. Бушмар паўз лес абабег кругом і пайшоў насустрэч.

— Хто?—гукнуў паручнік.

— Чалавек! — гукнуў у адказ Бушмар.

Паручнік падыйшоў, трымаючыся за рэвольвэр.

— Сконт?

Бушмар, як стаяў, кінуўся наперад і грунуў кулакамі паручніку ў грудзі. Той адно зьвіўся Бушмару пад ногі і духу не ўказаў."

Калі чытаеш эпізод калецтва Бушмарам „раённага савецкага службоўца", мімаволі прыпамінаецца факт забойства польскага паручніка.

Як бачым, прычыны забойства польскага паручніка і калецтва „савецкага службоўца"—аднолькавыя. Прычыны, якія ляжаць у біолёгічных інстынктах Бушмара.

Зразумела, што эпізод забойства польскага паручніка толькі падкрэсьлівае тое, што Бушмару зусім ня важна, каму помсьціць за сваю крыўду. Ці гэта польская фашысцкая армія, якая бараніла і інтарэсы хутарскага кулацтва, ці савецкая ўлада, якая праводзіць політыку „ліквідацыі кулацкае клясы".

Бушмар у сваёй помсьце ня ведае ніякіх клясавых інтарэсаў... І такім чынам ён становіцца „по ту сторону

добра и зла". У яго помсьце гаворыць яго фізыолёгія, яго „плоць".

А гэтае ўсё разам пацьвярджае тое, што Кузьма Чорны стаіць на тым пункце погл ду, што:

„Медицина (точнее физиология) дол на дать ключ к человеческому сердцу и даже об'яснить историческое движение человечества .." (Падкрэсьлена мною Ал. К.).

...„В природе, где все связано, все действует и противодействует, движется и изменяется, соединяется и разлагается, образуется и погибает,— нет ни одного атома, не играющего важной и необходимой роли, ни одной незаметной частицы, которая не была бы способна, попав в надлежащую обстановку, произвести чудесное действие... Избыток едкости и желчи фанатика, слишком горячая кровь в сердце завоевателя, расстройство пищеварения у правителя, фантазия, промелькнувшая в душе женщины,—все это достаточные причины для войн, для бойни, поглощающей миллионы жизней, для разрушения городов, для причинения запустения и несчастий в течение многих веков". (Гольбах. Цытавана па Пляханаву т. VIII ст. 50). (Падкрэсьлена мною—Ал. К.).

Гэтак Г. В. Плеханаў характарызуе позыцыі „естественно-научного", сэнсуалістычнага матэрыялізму.

Творчасьць Кузьмы Чорнага і выходзіць з гэтых позыцый „естественно-научного" матэрыялізму.

Нязьменную, атрыманую ў спадчынасьць прыроду чалавека пісьменьнік ставіць замест соцыяльнай дзейнасьці чалавека. Фізыолёгічная організацыя чалавека, а не соцыяльная абумоўленасьць кіруе паводзінамі чалавека. Грамадзкія і клясавыя адносіны паміж людзьмі вытлумачваюцца выключна, чалавечай біолёгіяй Зразумела, што чалавек, як „купнасьць грамадзкіх адносін", чалавек клясавы, зьнікае, зьяўляецца агулам чалавек, але кожны з спэцыфічнай фізыолёгічнай організацыяй. Таму і ня дзіўна, што любы атом фізыолёгічнай організацыі чалавека, гарачая кроў або фантазія могуць стварыць цэлыя чалавечыя пераваротьі, цэ ыя зрухі ў грамадзкім жыцьці. І гэта ніякіх адносін ня будзе мець да чалавека, як соцыяльнай, клясавай істоты, да чалавека, які дзейнічае і „личный интерес которого исходит от интереса целого, т. е. социального интереса" і „следует шаг за шагом за экономической необходимостью" (Г. В. Пляханаў).

Карацей кажучы, Чорны, як мастацкі рэалізатар філёзофскіх асноў сэнсуалістычных матэрыялістых, мае справу з фізыолёгічным чалавекам, а не соцыяльным.

Цікава, што аўтар сваё разуменьне існасьці Буш ара ўклаў і ў вусны савецкага абвінавайцы, які на судзе пра Бушмара гаворыць наступнае:

„Бушмар - вынік, аканчальны лёгічны вынік ляснога спрадвечнага хутару. Гэта зьвер, навокал якога павінны быць пакрыўджаныя. Іначай нельга, пакуль жыве на сьвеце Бушмар. Навакольны лес і дзікі хмызьняк валодае Бушмарам, а праз яго і адвечная прыродная дзіч спрабуе аўладаць усімі тут людзьмі. Бушмар, каб і хацеў, ня можа даць рады ні лесу, ні хмызьняку...

...Бушмараў лад—гэта пастка і вечная вайна—бо-ж нават, з сваім, можна сказаць, жыцьцёвым братам -- Вінцэнтым, была ў яго сьмяртэльная спрэчка. У зьвяроў заўсёды ў адным нават логаве—вайна... Вось ён жыве на сьвеце, жыве спрадвеку, робіць нават гісторыю свайго часу, гісторыю крыўдаў слабейшых, ад якіх маюць крыўду яшчэ слабейшыя... Чалавечая гісторыя нялюдзкасьці. Дзе расплоджваюцца зьвяры і каля іх чэрві". (Падкрэсьлена мною—Ал. К.).

Як бачым, абвінавайца таксама тлумачыць Бушмара, як вынік адзіноты і лясное глушы, бо яны, а не экономічна клясавыя падставы, апрача прыродных умоў жыцьця, у разуменьні абвінавайцы, формавалі вобраз кулака Бушмара.

Бушмар у разуменьні абвінавайцы—зьвер, навокал якога павінны быць пакрыўджаныя і вайна нават у адным клясавым логаве.

Паспрабуем-жа разгледзець, як адбываецца вайна ў аповесьці „Лявон Бушмар" паміж процілеглымі „клясавымі логавамі".

III

Якія клясавыя сілы супроцьстаўляюцца ў аповесьці „Лявон Бушмар"? Як ўвасоблены ў мастацкія вобразы тыя процілеглыя клясавыя полюсы, якія мы маем на вёсцы?

З аднаго боку, кулак-хутаранін Лявон Бушмар. Выгадаваны лясным хмызьняком, ён ператвараецца ў зьвера, але ў зьвера надзвычайна чулага да прыроды, у некаторым сэнсе і да людзей.

„Часамі находзіла на яго нейкае прасьвятленьне. Аднак-жа гэта была толькі слабая праява чалавечага пачуцьця, якое і ў яго недзе драмала".

Бушмар—зьвер, але Бушмар зьвер просты і шчыры. У Бушмара няма і жаднае рысы хітрасьці. І Галена, жонка Бушмара... „сэрцам пазнала ўсю яго чалавечую ўрачыстасьць і прыгнечанасьць"...

Бушмар—гэта нешта бязьлітаснае, „што ўсё крышыць дашчэнту пад нагамі сваімі, сьцірае ўсё з твару зямлі і, не заўважваючы гэтага, у імя сваіх адчуваньняў сьвету для сябе аднаго...

„ — Я на чужое ня лезу,—закрычаў Бушмар, — каб адно ніхто мяне не чапаў! Не чапай мяне!"

І гэта ёсьць Бушмараў прынцып.

Ніякія клясавыя стымулы паводзінамі Бушмара ня кіруюць. Як мы ўжо высьветлілі, гэтыя паводзіны абумоўлены біолёгічнымі інстынктамі прывязанасьці да жанчыны, інстынктамі самаабароны.

Якая-ж клясавая сіла супроцьстаўляецца Бушмару?

Па-першае, зразумела, калі Бушмар ня ёсьць моцная клясавая сіла аднаго лягеру, правільней, калі ён не выступае ў якасьці змагара і абаронцы свайго эканомічнага становішча і добрабыту, які разбураецца няўхільным наступам колектывізацыі, калі ён у працягу ўсяе аповесьці не прабуе нават супраціўляцца абрэзцы яго зямлі пад колгас (апрача, праўда фіналу аповесьці, аб якім будзе гутарка ніжэй), калі ён у адчыненае змаганьне ўступае толькі пры пасяганьні на яго так званыя „біолёгічныя правы", зразумела, што пры такім становішчы процілегламу клясаваму лягеру, пры адсутнасьці моцнага ворага няма з кім змагацца.

Адсюль і агульная блёкласьць клясавага логава, якое супроцьстаўляецца Бушмару.

Клясавую сілу, якая супроцьстаўляецца Бушмару, можна а'бяднаць пад назвай „колектывізатары". Гэтая група „колектывізатараў" складаецца, па-першае, з главара і зачыншчыка колектывізацыі Андрэя. Чалавек з вялікімі жаданьнямі і імкненьнямі, але надзвычай далёкі ад сапраўднага організатара сялянства на колектывізацыю і змаганьне супроць кулацтва. У ім пэўная бязвольнасьць. Іншыя сяляне-беднякі, яго дапаможнікі, таксама працуюць з абыякасьцю, і ніхто з іх нават і ня думае Бушмара лічыць за свайго клясавага ворага.

Наадварот, у часе абрэзкі бушмаравай зямлі між собя ў іх завязваецца такая гутарка пра Бушмара:

„ — Што гэта за чалавек, чаму ён вачэй не пакажа; а пасьля сьмяртэльнае крыўды не абярэшся (Падкрэсьлена мною Ал. К.).—загаманілі некаторыя мужчыны

— Каб тут каморніка ня было, можа-б і прышоў,—засьмяяўся Амілін брат.—Што, невядома, як яму цяжка з начальствам гаварыць? (Падкрэсьлена мною—Ал. К.)

Гэта кіраўнік колектывізацыі Андрэй сам робіць „амністыю" кулаку Бушмару, а яго таварышы баяцца, што тады ад Бушмара „сьмяртэльнае крыўды не абярэшся".

У гэтую „капэлю" — бязвольных, слабых „колектывізатараў" (аб кіраўніцтве колектывізацыяй рабочых

гораду, партыйнай, або якой савецкай арганізацыі нідзе ў аповесьці і гутаркі няма) урываецца адзін надзвычайна актыўны і дзейны чалавек— гэта Вінцэнты. Ён надзвычайна дзейна і актыўна праводзіць абрэзку Бушмаравай зямлі.

Вось што гэта за тып:

„Багатым лішне Вінцэнты ніколі ня быў, але ганарыстым быў заўсёды. З Бушмаравага бацькі сьмяяўся, бывала, што той хоць і заможны, але страціў з выгляду ўсю сваю шляхотнасьць, забыўся мусіць на сваю радавітасьць і ня знаўся з выдатнымі арандатарамі і панамі Сам-жа Вінцэнты з панамі знаўся гэтак: чакаў, бывала ў нядзелю ля касьцёлу пры панскіх фаэтонах, пакуль ня выйдзе з касьцёлу знаёмы пан..“ „... Як выходзіў з касьцёлу знаёмы пан, Вінцэнты далікатна вітаўся. Пакуль лёкай зашпільваў пану дарожны пыльнік, Вінцэнты падтрымліваў панаў локаць і пасьля падсаджваў у фаэтон“.

Вось гэты ў дарэволюцыйны час прыхільнік старых панскіх нагавіц і сурдутаў цяпер, пасьля рэволюцыі, у пэўнай меры супроцьстаўляецца Лявону Бушмару.

З аповесьці мы бачым, што ўвесь час Вінцэнты здольны на самыя агідныя справы. Ён крывіць душою, ён здраджвае, провокуе і г. д. і г. д.

Яшчэ праводзячы абрэзку зямлі Бушмара, ён адначасова ідзе прасіцца да Бушмара, каб той яго прыняў да сябе ў „падсуседзічы“, і раіць самому, як ратавацца, „каб з торбаю па сьвеце не пайсьці“.

„ — Я табе скажу, што рабіць— яны сваё, а мы сваё. Няхай сабе іх там дзьвесьце сядзе каля аднаго катла (Гэта гутарка ідзе пра колгас. Ал. К.), а мы тут у дзесяцярох сядзем...“

І Бушмар аказаўся больш сумленным за Вінцэнта, ён ня прыняў яго прапановы наконт арганізацыі ілжэколгасу. Далей Вінцэнты разам з сваімі сынамі, якія пасьля нават уступаюць у колгас, намагаецца ажаніць аднаго з сыноў з Галенаю (жонка Бушмара. Бушмар сядзеў у вастрозе) і заўладаць Бушмаравай зямлёй. Пазьней гэты Вінцэнты падпальвае Бушмарава гумно. Ды і наогул няма, здаецца, на сьвеце такое подласьці, на якую ня здатны быў-бы Вінцэнты.

Але паказальна ў аповесьці „Лявон Бушмар“ тое, што гэты подлы крывадушны чалавек амаль ніякага дачыненьня ня мае да кулацкага лягеру і, у прыватнасьці, да Лявона Бушмара.

Наадварот Вінцэнты і Лявон Бушмар—самыя лютыя ворагі. Лявон Бушмар прыбіў-жа Вінцэнтага да сьмерці, калі даведаўся, што стары памыкаўся да яго жонкі. Больш таго, у аповесьці Вінцэнты больш зьвязаны з лягерам „колектывізатараў“, ніж з Бушмарам.

Гэтым таксама падкрэсьліваецца тое, што кулак Лявон Бушмар нават не прабуе выкарыстоўваць што-кольвечы для свайго змаганьня супроць колгасу, а наадварот, з прычыны тае, што ім кіруюць ня клясавыя стымулы, а фізыолёгічныя, ён у аднолькавай ступені помсьціць „раённаму савецкаму службоўцу“, які зьяўляецца яго клясавым ворагам і Вінцэнтаму, які па сваёй дзейнасьці зьяўляецца яго клясавым братам, або „зьверам у адным логаве“. Вось да чаго вядзе і ў чым сутнасьць так званай „тэорыі“ „вайны ў адным логаве“, аб якой гаварыў на судзе абвінавайца.

З другога боку, зьвярыны, але просты, адкрыты, шчыры і чулы вобраз Лявона Бушмара ў процілегласьць агіднейшаму тыпу Вінцэнтаму пры блёкласьці „колектывізатараў“ набывае пэўную дадатную афарбоўку і сымпатычныя, нават романтычна-прывабныя рысы.

Вось што новага дадае складаная сыстэма ўзаемаадносін пэрсонажаў да агульнага вобліку хутараніна Лявона Бушмара.

Раней чым перайсьці да характарыстыкі разьвязькі аповесьці „Лявон Бушмар“, я хачу яшчэ паказаць на адну цікавую і тыповую рысу ў твор-

часьці Кузьмы Чорнага, якая вынікае з позыцый „естественно-научного" матэрыялізму, на якім грунтуецца творчы мэтад пісьменьніка.

З таго пункту погляду, што чалавечая прырода нязьменная, і што дзейнасьць чалавека залежыць ад яго фізыолёгічнай організацыі, у „естественно-научных" матэрыялістых вынікае, што людзі заўжды былі няроўны паміж сабой у фізычных, моральных і інтэлектуальных адносінах. „Человек, слабый телом и духом, постоянно был вынужден признавать превосходство сильнейшего, более одаренного, более трудолюбивый должен был обрабатывать более обширный участок земли и делал его более плодородным, чем получивший от природы более слабое тело. Таким образом с самого начала существовало неравенство собственности и влияния (Гольбах, цытавана па VIII т. Сочинений Г. В. Пляханава.)

Вось у разабранай намі аповесьці „Лявон Бушмар" і ёсьць той чалавек, які дзякуючы сваёй фізычнай няроўнасьці і надзвычайнай працавітасьці і выдзеліўся, як экономічна заможны паміж іншымісялянамі. А любіць ён працу бязьмежна. Нават служачы ў Чырвонай арміі, ён,

„калі льга было ад службы, вельмі ахвотна ішоў у гумно малаціць і тады ажыўляўся:

„Чалавек без работы ня можа доўга быць, хіба толькі спрадвечны лайдак, або каторы змалку ня прывык..." (падкр. мною—Ал. К.)

Але гэтае ў творчасьці Кузьмы Чорнага невыпадковасьць.

У романе „Зямля" кулак Юлік Барановіч выстаўляе гэтыя-ж матывы працавітасьці ў апраўданьне свае кулацкае гаспадаркі:

„Мне ўсёроўна. Няхай мяне хоць чортам лічаць,—дамяне нічога ня прыстане (Гэта пра тое, што яго кулаком лічаць—Ал. К.) Я нікога не забіў і не аграбіў. Іншы ня мае, бо рабіць лянуецца. Абібока або дурня ніколі кулаком не назавуць..."(падкрэсьлена мною—Ал. К.)

Як ні дзіўна, а ізноў-жа мы бачым, што і ў даным выпадку позыцыі „естественно-научного" матэрыялізму служаць подбіўкай складанай тканіны вобразаў творчасьці Кузьмы Чорнага.

Аднак, нельга разумець справу гэтак, што ў рэакцыйнасьці аповесьці „Лявон Бушмар" вінаваты выключна позыцыі таго матэрыялізму, на якім грунтуецца творчасьць Чорнага, і нібыта „естественно-научный" матэрыялізм ёсьць і заўсёды быў сам па сабе рэакцыйным. Зусім не. У час, калі французская буржуазія ішла да свайго панаваньня, гэта была найбольш рэволюцыйная і прогрэсыўная філёзофія таго часу. Мы-ж хочам толькі давесьці тое, што той, хто імкнецца ў наш час утрымацца на гэтых позыцыях, адыгрывае об'ектыўна-рэакцыйную ролю.

Зьмяняюцца часы, зьмяняюцца ацэнкі...

IV

Апошняя трэцяя частка аповесьці „Лявон Бушмар" носіць сваясаблівы характар. На працягу усяе аповесьці ішло разгортваньне вобразу кулака Лявона Бушмара. Нарэшце, гэты вобраз разросься ў такі вялічэзны, магутны воблік зьвера, што пры ўсім сваім жаданьні сам аўтар ня змог задушыць яго, аўладаць ім.

Гэта азначае, што аўтар ня змог паказаць, як уся кулацкая кляса разам з Лявонам Бушмарам ідзе да свайго заняпаду, да свае зусім заканамернае пагібелі, ня змог паказаць, як яна, адчуваючы сваю пагібель, кідаецца ў шалёнае супраціўленьне буйнаму росквіту новых соцыялістычных форм сельскай гаспадаркі.

У гэтых адносінах апошняя частка Лявона Бушмара нібыта імкнецца запоўніць буйныя правалы ўсяе аповесьці.

Больш рэльефна выдзяляецца група „колектывізатараў". Да іх з моладзі далучаецца малады дзейны хлопец батрак Уладзя.

Колгас з адбіткам клясавага змаганьня ўнутры яго ўжо зьяўляецца рэальным фактам.

Нарэшце, кулак Бушмар кідаецца ў адчыненае супраціўленьне колгасу, ідзе на падпал яго.

Але ня гледзячы на ўсе гэтыя нібыта адзнакі паказу сапраўднага клясавага змаганьня, ад апошняе часткі ўся аповесьць у ідэолёгічных адносінах нічога ня выйгрывае, а ў мастацкіх шмат траціць.

Мы ўжо гаварылі пра тое, што на працягу ўсяе аповесьці вобраз Лявона Бушмара вырастае ў такі магутны вобраз, што сам аўтар аказаўся падпарадкаваным яму, а ня ён аўтару. Гэтага кулака Чорны задушыць ня змог.

Блёклая на працягу ўсёй аповесьці групоўка „колектывізатараў" папаўняецца батраком Уладзем. Але ізноў жа паўстае пытаньне, як, у якіх умовах сам праз сябе мог выгадавацца такі сьвядомы комсамолец, як Уладзя, які зьяўляецца кіраўніком усяго колгасу і бязьлітасна кпіць з „уласьніцкае мышы ў сваёй нары".

Зразумела, што адсутнасьць партыйнае, комсамольскае організацыі, адсутнасьць кіраўніцтва рабочых гораду колгасным рухам на працягу ўсяе аповесьці дае значны перабой ня толькі ў ідэолёгічным сэнсе, а і ў мастацкай праўдзівасьці. (Дарэчы, Уладзя зьявіўся ў аповесьці раптоўна. Да трэцяе часткі мы аб ім нічога ня ведалі).

Нарэшце аб самім Бушмару. З мастацкага боку абсолютна не апраўданым зьяўляецца падпал ім колгасу і сяброўства з Вінцэнцюкамі (Вінцэнтавымі сынамі).

Мы ведаем Бушмара на працягу ўсяе аповесьці як простага, адкрытага чалавека, а тут аўтар ніяк ня змог давесьці справу да канца, каб ня ўкласьці ў Бушмара рысы Вінцэнтага. А гэта, на вялікі жаль, супярэчыць усяму вобліку кулака Бушмара.

„Нейкая рыса зьявілася ў ім новая як-бы ўкрадзеная ад нябожчыка Вінцэнтага: Гэта было штосьці падобнае да хітрасьці, хоць і ня хітрасьць. Ён усё бліжэй трымацца пачаў Вінцэнтавага сына..." (падкр. Ал. К.)

Калі мы нават даруем аўтару гэтую мастацкую нацягнутасьць, позыцыі творчасьці Кузьмы Чорнага застаюцца і тут нязьменнымі.

Лявон Бушмар пры дапамозе Вінцэнтавых сыноў падпаліў колгас.

Прасочым-жа, што зьявілася непасрэднай прычынай падпалу колгасу.

„Як-жа жыў цяпер Бушмар? Каб ня зьбегла тады была адяго жонка, ён можа-б і яшчэ сяк-так трымаў-бы добрага таго каня свайго, можа па-воўчы-б гаспадарыў на сваім куце, які яму пакінулі. Але застаўшыся адзін, ён, як ні стараўся, ня мог даць рады" (падкр.—Ал. К.)

„Тады, адразу пасьля таго, як уцякла Галена, (жонка Бушмара пашла ў колгас. Ал. К.) ён быў дадумаўся засьцігнуць дзе ды прыбіць яе. Пасьля думка гэтая перайшла на Андрэя і на гэтым закаранела" (падкр.—Ал. К.)

Як бачым, непасрэднай прычынай падпалу колгасу і зусім непраўдападобнага сяброўства з Вінцэнтавым сынам (той раней хацеў адбіць у Бушмара Галену) зьявілася тое, што Галена пакінула Бушмара,—ізноў фізыолёгічны, а ня клясавы стымул. І менавіта пасьля апошняе гутаркі з Галенай, калі яна рашуча адмовілася вярнуцца да Бушмара на хутар, Бушмар падпаліў колгас.

На гэтым і канчаецца Бушмарава гісторыя, „гісторыя крыўды слабейшых"...

Мы падкрэсьліваем, што аповесьць „Лявон Бушмар" зьяўляецца адным з самых таленавітых твораў у творчасьці Чорнага. Больш таго, у аповесьці ёсьць асобныя малюнкі, якія зусім адпавядаюць нашым запатрабаваньням да рэволюцыйнага пісьменьніка (магутны па мастацкай сіле малюнак, калі маленькая яшчэ дзяўчынка Аміля ў панскім маёнтку ўпрошвае бацьку набіць эконома за тое, што эконом пакрыўдзіў бацьку), але

агулам твор, або інакш тыя позыцыі з якіх выходзіць творчасьць Чорнага, ня нашы.

Яны прыводзяць да адмаўленьня клясавага змаганьня, да апраўданьня і абароны кулака перад тварам наступу соцыялізму на вёску.

Сэнсуалістычны матэрыялізм, стрыгучы людзей пад грэбень фізыолёгіі, прыводзіць да сьціраньня клясавых меж паміж людзьмі, клясавай антаганістычнасьці. І такім чынам ясна, што для таго, хто падмяняе клясавыя адносіны фізыолёгічнымі, становіцца зусім чужым і дзікім клясавае змаганьне.

У гэтым шкоднасьць тых „філёзофскіх" позыцый, з якіх зыходзіць у наш час К. Чорны.

Тым больш, што Чорнаўскія позыцыі прывабны тым, што яны нібыта разьвязваюць проблему паказу жывога, а не штампаванага, трафарэтнага чалавека. І нават на некаторую частку левага крыла сялянскай літаратуры гэтыя позыцыі аказваюць свой уплыў (С. Баранавых).

Пролетарская літаратура таксама за паказ жывога чалавека, яна таксама супроць штампаванага, цыркулярнага чалавека. Больш таго, яна не ігноруе і фізыолёгічнымі момантамі пры паказе людзей. Але гэтыя фізыолёгічныя інстынкты атрымліваюць зусім іншую афарбоўку.

У працягу ўсяго нашага разгляду аповесьці „Лявон Бушмар" магло скласьціся пэўнае ўражаньне, што мы выступаем нібыта супроць таго, што Бушмар ня носіць звычайных штампованных адзнак кулацкай хітрасьці, што ў Бушмара пануюць фізыолёгічныя інстынкты ўласьніцкіх праў на жанчыну, што Бушмар у пэўнай ступені зьяўляецца бездапаможным і г. д. і г. д.

Ці так гэта? Ці выступаем мы супроць гэтага? Не. Мы выступаем толькі супроць падмены клясавых адносін паміж людзьмі біолёгічнымі, фізыолёгічнымі ў паказе Чорнага сучаснае вёскі. Мы выступаем супроць гіпэртрофіі фізыолёгізму, якая засланяе клясавыя супярэчнасьці і клясавае змаганьне ў сучаснай вёсцы.

Фізыолёгічнымі момантамі мы не ігноруем датуль, пакуль яны зьяўляюцца момантамі зьнятымі і падначаленымі клясавасьці чалавека.

Вобраз кулака Бушмара пры ўмове неігнараваньня момантамі фізыолёгіі павінен быў-бы паўстаць зусім у іншым выглядзе ў паказе рэволюцыйнага пісьменьніка.

Бушмар-чалавек замкнуты, адзічэлы, але трэба падкрэсьліць і паказаць, што гэтая адзічэласьць і замкнутасьць — гэта ёсьць яго клясавая сутнасьць, паказаць што соцыяльна-экономічнае становішча прымушае яго быць ізоляваным ад рэшты масы сялянства.

Для Бушмара вялікая пакута—мець дачыненьне да савецкага начальства, але трэба паказаць, што гэты страх перад „савецкім начальствам" тлумачыцца не фізыолёгічнай організацыяй яго, а страхам перад сваім клясавым ворагам, які зьяўляецца мацнейшым за яго.

Непасрэднай прычынай забойства Бушмарам раённага савецкага службоўца зьявілася тое, што гэты службовец дужа ласкава паглядаў на Бушмараву жонку Галену,—трэба паказаць, што гэта забойства мае клясавыя прычыны, і што Галена зьявілася толькі штуршком, толькі лішняй кропляй у поўнай пасудзіне, што гэтае забойства ніяк нельга зьмешваць з забойствам польскага паручніка і з калецтвам „свайго клясавага брата" Вінцэнтага.

У Бушмара сваясаблівая фізыолёгічная ненасытнасьць жанчынамі і ўласьніцкія прэтэнзыі на іх. І тут трэба паказаць, што гэтыя грубаўласьніцкія прэтэнзыі маюць свае карэньні ў клясавай прыродзе кулака Лявона Бушмара і г. д. і г. д.

Карацей кажучы, гэта азначае, што ад пункту погляду фізыолёгізму пісьменьніку трэба ўзьняцца да ступені шырокага соцыяльнага, клясавага паказу.

Але тады-б, зусім зразумела, увесь воблік аповесьці „Лявон Бушмар“ цалкам зьмяніўся-б. І мы-б мелі справу з новай аповесьцю...

А пакуль што мы маем справу з рэальна існуючай аповесьцю „Лявон Бушмар“ і вернемся да яе.

Мы дастаткова высьветлілі, што чорнаўскі „жывізм“ нічога агульнага ня мае з патрабаваньнямі, якія выстаўляюцца пролетарскім пісьменьнікам, паказу жывога, дзейнага, клясавага чалавека, чалавека, як „купнасьці грамадзкіх адносін“, чалавека, які выхоўвае і ператварае сябе ў процэсе клясавай практыкі свае клясы.

У гэтых адносінах чорнаўскі „фізыолёгічны жывізм“ ня толькі нічога агульнага ня мае са змаганьнем пролетарскай літаратуры за жывога, клясавага чалавека, а, наадварот, пролетарская літаратура павінна ўзброіцца на змаганьне супроць творчых асноў К. Чорнага. У час, калі пролетарская літаратура змагаецца за сапраўднае, найбольш поўнае разуменьне і адбіцьцё рачаіснасьці, яна павінна сказаць, што яе жывыя людзі, за паказ якіх яна змагаецца, проста процілеглыя штампаваным, лякіраваным людзям з творчага мэтоду „левых“ — ура-рэволюцыйных прадстаўнікоў літаратуры. З другога боку, яна проста процілегла і варожа ідэалістычна замкнутаму псыхолёгізму і груба-матэрыялістычнаму фізыолёгізму. Менавіта, апошняе зьяўляецца правай небясьпекай у нашай літаратуры і на яе павінен быць накіраваны самы моцны агонь нашага змаганьня.

У канцы аповесьці „Лявон Бушмар“ Кузьма Чорны, як мы бачылі, суб'ектыўна імкнецца разгарнуць сапраўдны малюнак клясавага змаганьня. Аднак, у межах сваіх творчых позыцый з гэтага нічога не атрымліваецца.

Менск, лістапад-снежань
1930 г.

Для таго, каб Чорнаму адчынілася таямніца клясавых узаемаадносін і клясавага змаганьня, трэба рашуча пераглядзець першапачатковыя асновы свае творчасьці. Кузьму Чорнаму трэба пераўзброіцца.

Суб'ектыўныя імкненьні да гэтага пераўзброеньня і пераключэньня на іншыя рэйкі працы мы ўжо бачым у канцы аповесьці „Лявон Бушмар“ (ды яшчэ ў куды большай ступені ў романе „Ідзі. Ідзі“), але аднаго суб'ектыўнага жаданьня малэ, трэба перамагчы самога сябе і пачаць „рэконструкцыю“ свае творчасьці з асноў, з так званых „філёзофскіх“ падстаў гэтай творчасьці, каб надалей не хадзіць па чужых дарогах, а „усяму ўзыйсьці на дарогі іншыя“...

Для гэтага трэба, як кажа Г. В. Пляханаў,

„ ... притти к необходимому убеждению, что природа человека ровно ничего не об'ясняет в историческом развитии человечества. Следовало сделать шаг дальше, подняться выше естественно-исторической точки зрения, а именно стать на почву социальной науки. Следовало понять, что социальная среда имела свои собственные законы развития, нисколько не зависящие от человека, рассматриваемаго как чувствующее, понимающее и разумное существо“ (Г. В. Плеханов, Собрание сочинений т. VIII, ст. 73).

Толькі гэтае можа дапамагчы Чорнаму значна наблізіцца да пролетарскай літаратуры. А шлях да пролетарскае літаратуры ляжыць толькі праз аўладаньне асновамі адзінае рэволюцыйнае, адзінае прогрэсыўнае, адзінае навуковае тэорыі пролетарыяту — дыялектычнага матэрыялізму.

ТЭАТР

Іл. Гурскі

Клясавая барацьба ў мастацтве

(*Аб беларускім тэатры*)

Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя, вызваліўшая народы СССР ад соцыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня, дала ім поўную магчывасьць стварацъ нацыянальную культуру, толькі не „наогул" нацыянальную, бо ў кожнай нацыі ёсьць дзьве культуры: пролетарская і буржуазная, але, як падкрэсьліў тав. Сталін у сваім дакладзе на XVI партзьезьдзе, у разьдзеле, прысьвячаным нацыянальнаму пытаньню, „культура нацыянальная па форме і соцыялістычная па сваім зьмесце", ці, як часамі мы ўжываем другую формулу, паміж якімі няма ніякае супярэчнасьці, гэта „нацыянальная па форме і пролетарская па зьмесьце". Але часамі знаходзяцца людзі, дарэчы кажучы, узгадаваныя і ўскормленыя на савецкім чорназеме, як А. Бабарэка, гэты так званы „самабытны" гора-тэорэтык у літаратуры, які, праўда, у завуаляванай форме, робячы „папраўчкі", спрабуе супярэчыць, падмяняючы выразную Сталінскую формулёўку такой: „нацыянальная па форме і пролетарская па мэтаімкненасьці". Практыка паказала, што клясавы вораг, маскуючыся, пад выглядам чыстае ўзвышанае культуры, пад заслонай „пролетарскае па мэтаімкненасьці" выкарыстоўвае літаратуру ў сваіх мэтах, накіраваных супроць дыктатуры пролетарыяту. Аб гэтым з усёй яскравасьцю сьведчыць творчасьць такіх прадстаўнікоў у літаратуры, як Ул. Дубоўка „І пурпуровых ветразей ўзьвівы", Яз. Пушча „Асеньнія песьні", якія, даючы багатую па форме літаратурную продукцыю, насычаюць яе буржуазным зьместам.

Пролетарыят БССР, кіруемы ленінскай комуністычнай партыяй, пасьпяхова вязде соцыялістычную будоўлю краіны. Там, дзе раней была спрадвечная дрыгва, чутны былі сумныя мэлёдыі прыгнечанага абяздоленага беларускага селяніна, там цяпер разгортваюцца колгасы, пускаюцца стальныя коні—трактары, выводзяцца фабрычныя трубы, працуюць магутныя турбіны, складаюцца новыя, бадзёрыя песьні працы, песьні барацьбы і перамогі.

У выніку правільнага вырашэньня компартыяй нацпытаньня мы ствараем беларускую пролетарскую культуру. На фронце мастацтва, у прыватнасьці тэатру, які налічвае толькі адно дзесяцігодзьдзе, у БССР увесь час вялася і вядзецца барацьба за пролетарскі тэатр. Клясавы вораг, у асобе нацыянал-дэмократаў, праз нацыянал-опортуністаў пробаваў аўладаць тэатрам, што яму ў значнай меры ўдалося зьдзейсьніць, выкарыстоўваючы мастацтва ў сваіх варожых пролетарыяту мэтах.

Першы пэрыод у разьвіцьці беларускага тэатру (1920—27 г.)—гэта так званы зьбіральны пэрыод, калі тэатр знаходзіцца ў пачатковым стане

свайго разьвіцьця, мала чым адрозьніваецца ад провінцыяльнага тэатру даваеннага часу, выпускаючы прадукцыю вельмі нізкае як мастацкае, так і ідэолёгічнае якасьці. Гэта „залаты век“ нацыянал-дэмократаў пад прыкрыцьцём нацыянал-опортуністаў. Кіраўніцтва тэатрамі знаходзіцца амаль цалкам у руках махровых нацдэмократаў, якіх падтрымоўваюць нацыянал-опортуністыя.

Другі пэрыод (1928-29 г.), пэрыод жорсткай барацьбы на тэафронце, шуканьня шляхоў разьвіцьця беларускага тэатру, консолідацыі пролетарскіх сіл. У гэты час разгортваецца другая тэадыскусія. Выступіўшы тады з артыкулам супроць пастаноўкі на беларускай сцэне „Бронецягніка“ Іванова, называючы гэту п'есу „аб'едкамі Масквы“ і падтрыманы З. Жылуновічам (Ц. Гартны), Тодар Глыбоцкі (А. Дудар) орыентаваў разьвіцьцё беларускага тэатру на буржуазны Захад. Пролетарская грамадзкасьць дала рашучы і зьнішчальны ўдар па гэтых нацдэмаўскіх вылазках.

І, урэшце,—трэці пэрыод (1930 г.), калі беларускі тэатр зрабіў рашучы паварот у бок выкананьня конкрэтных задач соцыялістычнага будаўніцтва. У гэты час мацнее і разьвіваецца новы тып будучага соцыялістычнага тэатру, які вырас на падставе самадзейнага мастацтва,—беларускі ТРАМ, гэтым замацоўваюцца позыцыі Беларускага пролетарскага тэатру.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-І) організаваны ў 1920 годзе, калі Чырвоная армія адкінула белапалякаў ад Менску. Тэатр гэты ня меў ніякае школы. Акторскі склад гэтага тэатру, гэта ў сваёй большасьці аматары. Тэатр гэты ў першы пэрыод свае работы ня меў цалкам выражанага свайго аблічча. Побач з пастаноўкамі цалкам прыемлемых намі п'ес, тэатр ставіў такія пастаноўкі, як: „Тутэйшыя“ Янкі Купалы, „Скарынін сын з Полацку“ М. Грамыкі, „Вір“ Рамановіча, „Кастусь Каліноўскі“ Міровіча, „Змрок“ Шашалевіча. п'есы, і асабліва першая (гэта політычны пасквіль), вытрыманы ў махрова нацыяналістычных тонах, накіраваны сваім гастрыём супроць нас. П'есы гэтыя пад націскам пролетарскай грамадзкасьці зьняты з рэпэртуару.

Адначасна з гэтым у рэпэртуары тэатру ёсьць спэктаклі, разьлічаныя на абслугоўваньне рознай аўдыторыі: „У ліпнёвую ноч“, „Машэка“, „Каваль ваявода“, опэра „Русалка“, балет „Вальпургіева ноч“ і іншыя.

Другі пэрыод (1927—29 г.) працы БДТ-І характэрны тым, што тэатр робіць стаўку на організаванага рабочага гледача. Тэатр ставіць наступныя п'есы: „Міжбур'е“ Д. Курдзіна, „Запяюць верацёны“ Міровіча, „Мост“ Рамановіча, перакладзеныя: „Бронецягнік“, „Ярасьць“, „Інга“ і інш. Нацыянал-дэмократычна настроеная інтэлігенцыя бяре ў штыхі тэатр, але апошні, пры падтрымцы пролетарскае грамадзкасьці, цьвёрда трымае сьцяг барацьбы за пролетарскую культуру і не здае заваяваных позыцый.

Трэці пэрыод—нашы дні (1930 г.); кіраўніцтва тэатрам, хоць і неахвотна, пры некаторым супраціўленьні пасобных кіруючых працаўнікоў на фронце мастацтва, але пры падтрымцы пролетарскай грамадзкасьці прымае п'есу рабочага Р. Кобеца „Гута“. Пастаноўкай гэтай п'есы тэатр становіцца на шлях рэволюцыйнага тэатру, які выконвае конкрэтныя задачы соцыялістычнага будаўніцтва. Пролетарская грамадзкасьць БССР вельмі цёпла прыняла гэтую пастаноўку. На І олімпіядзе мастацтваў народаў СССР БДТ-І выступае з пастаноўкамі „Гута“ Г. Кобеца і „Міжбур'е“ Д. Курдзіна. Журы олімпіяды зусім правільна ацэньвае пастаноўку гэтых п'ес: „такі выбар рэпэртуару і яго сцэнічнае ажыцьцяўленьне склалі тэатру пэўны ідэолёгічны твар“.

Пастаноўкай п'есы „Гута“ Р. Кобеца тэатр уступае ў трэці пэрыод, калі ён рашуча перамагае нацыянал-дэмократычныя тэндэнцыі і становіц-

ца на службу соцыялістычнага будаўніцтва, што родніць тэатр з усёй рабочай клясай.

На чале мастацкага кіраўніцтва БДТ-I стаіць заслужаны артыст БССР Е. Міровіч. З актораў за гэты час асабліва выдзеліліся: Крыловіч, а таксама Ўладамірскі, Ржэцкая, Міронава, Платонаў, Зораў, Грыгоніс і інш., з мастакоў: Марыкс, Крэйн. Тэатр таксама вылучыў з свайго асяродзьдзя здольнага драматурга Е. Рамановіча, аўтара п'есы „Мост", якая добра вядома беларускаму рабочаму гледачу.

Другі Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-II) організаваны Наркомасьветы БССР у 1926 годзе з беларускай тэатральнай студыі ў Маскве, якая пачала сваю працу, як студыя з 1922 году. Студыя гэта, будучы ў Маскве, была прадастаўлена былым праваопортуністычным кіраўніцтвам НКАсьваты поўнасьцю ў рукі першай часткі рэакцыйна настроеных працаўнікоў МХАТ'у. Да таго-ж поўнае адсутнічаньне політычнага выхаваньня студыйцаў, няўдалы соцыяльны падбор іх, нацыянал-дэмократычнае кіраўніцтва студыяй, а потым тэатрам, прывяло да таго, што малады беларускі другі тэатр, які прайшоў добрую тэатральную школу, разам з тым перанёс на беларускую сцэну горшыя традыцыі МХАТ'у.

Сваімі студыйнымі пастаноўкамі: „Сон у летнюю ноч" Шэксьпіра, „Бакханкі" Эўрыпіда, народная драма „Цар Максімільян" і цэлы рад іншых, тэатр гэты паказаў, што ён высока стаіць у сэнсе формальных дасягненьняў. Аднак высокая якасьць гэтых пастановак магла задаволіць толькі нязначную частку рэакцыйна настроенай інтэлігенцыі, якая ў захапленьні была ад гэтых, сапраўды, высока мастацкіх спэктакляў.

Такая пастаноўка, як „Апраметная" Шашалевіча была даньню беларускім нацыянал-дэмократам. Гэта п'еса была пастаўлена ў 1927-28 гады, што выклікала поўны адрыў тэатру ад рабочага гледача, які дэманстраваў сваё абурэньне нагамі, дзякуючы чаму тэатр апусьцеў (на другім паказе „Апраметная" было 30-40 чал.). Такім чынам малады, здольны колектыў апынуўся цалкам у руках клясавага ворага—нацыянал-дэмократаў, якія выкарыстоўвалі мастацтва як сродак для правядзеньня буржуазнага і дробнабуржуазнага, нацыянал-дэмократычнага і шовіністычнага ўплыву на шырокія масы працоўных.

Ставячы орыгінальную беларускую п'есу „Апраметная", тэатр падмяніў формулу: „нацыянальная па форме, пролетарская па зьмесце", даўшы багаты, нацыянальны па форме спэктакль і насыціўшы яго буржуазным зьместам і ўсё пад лёзунгам „чыстага, узвышанага, сьвятога мастацтва, мастацтва—для мастацтва".

Пад ударам пролетарскай грамадзкасьці былое праваопортуністычнае кіраўніцтва НКАсьветы было прымушана зьмяніць рэакцыйнае кіраўніцтва БДТ-II, пасьля чаго тэатрам у 1928 годзе быў зроблены пералом у бок набліжэньня яго да сучаснасьці. Пастаноўкай „Разлом" тэатр уступае ў другі пэрыод свае працы. У гэты час (1928-30 г.) тэатрам ставяцца наступныя п'есы: „Рэйкі гудуць" В. Кіршона, „Калі сьпяваюць пеўні" Ю. Юр'іна, „Горад вятроў" В. Кіршона, орыгінальныя беларускія „На прадвесьні" М. Ільлінскага, „Простыя сэрцы" (музкомэдыя) М. Розанова, М. Міцкевіча, Заяіцкага і інш.

Адначасова з распрацоўкай ідэолёгічна цалкам прыемлемых нам п'ес тэатр уключае ў свой рэпэртуар п'есу „Каля тэрасы" М. Грамыкі, „Астап" Глобы. Абедзьве гэтыя п'есы зьняты з рэпэртуару. П'еса „Астап" па настойваньні ўжо новага кіраўніцтва тэатрам некалькі разоў перарабляецца з тым, каб яе паставіць, але-ж з гэтага нічога ня выходзіць. Пастаноўка „Каля тэрасы" М. Грамыкі выклікала здаровую крытыку з боку пролетарскае грамадзкасьці, тады-ж і разгарнулася першая тэадыскусія ў 1927 годзе. Беларускія нацыянал-дэмократы і нацыянал-опор-

туністыя расцэньвалі цалкам здаровую крытыку гэтае п'есы, як паход супроць беларускага тэатру, беларускай культуры. Усё-ж гэта п'еса пад націскам грамадзкасьці была значна перароблена, пасьля чаго, хоць і з цэлым шэрагам недахопаў ставілася на сцэне яшчэ каля двух год.

Пастаноўкай „Першай коннай" Ус. Вішнеўскага БДТ-II робіць рашучы паварот у бок набліжэньня тэатру да сучаснасьці. Калі „Горад вятроў" В. Кіршона прыняты тэатрам чыста павярхоўна, калі тэатр яшчэ не адышоў ад тае лініі, якую ён праводзіць на працягу некалькі год (гэта калупаньне ў псыхолёгічных перажываньнях паасобных гэрояў), калі тэатр не зразумеў сутнасьці соцыяльнае трагедыі гэтае п'есы, дык тады ў „Першай коннай" Ус. Вішнеўскага тэатр, ідучы за аўтарам, робіць націск на масу, як галоўнага гэроя рухаючых сіл рэволюцыі—гэтым самым пастаноўка набывае соцыяльную значымасьць, як і дапамагае рабочай клясе і яго парты ў справе выхаваньня моладзі пакаленьня, здольнага ўступіць у рашучы бой за Сусьветны Кастрычнік.

Крывая палепшаньня соцыяльнага складу актораў, а таксама павялічэньне парт'ядра працаўнікоў гэтага тэатру увесь час паднімаецца ўверх за лік, галоўным чынам, праявіўшых сябе ў самадзейных рабочых гурткох. З актораў вылучаецца цэлы шэраг маладых таленавітых працаўнікоў, як, напрыклад: Ільлінскі, Шышкевіч, Міцкевіч, Соньнікаў і інш. На чале мастацкага кіраўніцтва стаіць В. Тэзаўроўскі, які здолеў зьдзейсьніць задачы, высунутыя новым кіраўніцтвам, што наблізіла тэатр да сучаснасьці.

Дзякуючы ўмацаваньню політычнага кіраўніцтва тэатрам, бязьлітаснай крытыкі памылак, дапушчаных у працы тэатру, некаторая частка сэктароў вырвана з-пад уплыву нацыянал-дэмократаў і нацыянал-опортуністых, выкарыстоўвавшых у свой час малады, здольны колектыў актораў у сваіх мэтах.

Актыўнасьць актораў асабліва была праяўлена ў часе пастаноўкі „Першай коннай". Уся работа над пастаноўкаю гэтае п'есы праводзілася ва ўдарным парадку, паасобныя цэхі спаборнічалі паміж сабою. Значная частка актораў цалкам аддае свае сілы на службу соцыялістычнага будаўніцтва, вядучы за сабою ўвесь колектыў, перабудоўваючы ўсю работу на выверапыя рабочаю клясаю мэтоды соцспаборніцтва і ўдарніцтва, што дае магчывасьць тэатру стаць на перадавыя позыцыі стварэньня новае, маладое, беларускае пролетарскае культуры і праз мастацтва, гэту гастрэйшую зброю пролетарскай рэволюцыі, выступіць у рашучых схватках з клясавымі ворагамі пролетарыяту.

Організацыя Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатру адносіцца да пачатку 1921 году. Гэта першы ў БССР вандроўны тэатр. Тэатр гэты організаваны Ул. Галубком. У сучасны момант Ул. Галубку прысвоена званьне народнага артыста БССР. У першае пяцігодзьдзе (1921—25 г.) у колектыве тэатру прымала удзел амаль уся сям'я Галубка. Тэатр у той час быў на гаспадарчым разрахунку, што адбівалася на якасьці працы тэатру. З канца 1925 году БДВТ атрымоўвае невялічкую дзяржаўную падтрымку і такім чынам становіцца на ногі. БДВТ зьяўляецца масавым народным тэатрам і карыстаецца вялікай популярнасьцю, асабліва сярод сялянства. Тэатр гэты абслугоўвае самыя цёмныя аддаленыя мясцовасьці БССР, гарадзкія акраіны, мястэчкі, саўгасы, колгасы і сельскія паселішчы. Раз'яжджаючы амаль увесь час па раёнах, тэатр ня лічыцца ні з якімі цяжкасьцямі, якія сустракаюцца на яго шляху, іншы раз амаль немажлівымі ўмовамі работы. Дабраўшыся (вельмі часта пехатою) да якой-небудзь мясцовасьці, мядзьведжага кутку, на адлегласьці сотні кілёмэтраў ад чыгункі, тэатр гатоў даваць пастаноўку, дзе хочаш і калі хочаш: у хаце, пуні, а то і на вольным паветры.

У першы пэрыод разьвіцьця беларускага тэатру, у прыватнасьці БДВТ (1921-27 г.), у рэпэртуары гэтага тэатру былі выключна п'есы, напісаныя кіраўніком гэтага тэатру Ўл. Галубком. Ён-жа сам іх і афармляў. Соцыяльная значнасьць, а таксама мастацкая каштоўнасьць гэтых пастановак невялікая. Гэта ў большасьці кароткія водэвілі, комэдыйнага характару, ці мэлёдрамы з ненатуральна напружанай інтрыгай і падкрэсьлена трагічным канцом. У рэпэртуары тэатру наступныя пастаноўкі: „Ганка", „Плытагоны", „Бязродны", „Апошняе спатканьне", „Пінская Мадонна", „Васіль хмель", „Пан-Сурынта" і цэлы шэраг іншых.

Другі пэрыод (1928-29 г.) тэатр ставіць „Провокатары", „Таміла" па роману Дзюшэна, гэта зьяўляецца некаторым зрухам тэатру наперад, аднак побач з гэтымі больш-менш прыемлемымі п'есамі ідуць і старыя пастаноўкі. Ня гледзячы на жорсткую крытыку з боку пролетарскай грамадзкасьці, права-опортуністычнае кіраўніцтва НК асьветы зусім нічога не рабіла па палепшаньню работы гэтага тэатру. І толькі пасьля таго, калі Галоўрэпэрткомам былі прыняты самыя рашучыя меры, аж да зьняцьця некаторых пастановак, Наркамасьветы заварушыўся.

Трэці пэрыод (1930 г.), калі тэатр рашуча адкідвае ўсё старое і распрацоўвае перакладныя творы, сугучныя для нашай эпохі,—гэта „Гальштук" А. Глебавай, „Дыктатура" Мікітэнкі, „Ярасьць" Яноўскага, арыгінальную беларускую п'есу „Віхор" В. Сташэўскага. Ставіў „Дыктатуру" і „Гальштук" актор БДТ 2 М. Міцкевіч, які, асабліва па пастаноўцы „Гальштук", паказаў сябе як здольны савецкі рэжысэр.

Беларускі ТРАМ пачаў сваю работу ў канцы 1929 году. За гэты час ім распрацаваны дзьве інсцэніроўкі: „Як Мікіта і Панас працаваць ішлі ў колгас" і „Плеткафон", а таксама пастаўлена п'еса „Першы штандар", апошнія дзьве напісаны і афармлены самім колектывам.

Організацыя ТРАМ, а таксама ўся яго работа да апошняга часу ішла пры поўнай пасыўнасьці з боку НКасьветы. І зусім невыпадкова тое, што ТРАМ яшчэ і на сёньняшні дзень далёка не заняў свайго месца, як вядучага перадавога атраду ў справе стварэньня пролетарскага тэатру.

Беларускім ТРАМ'ам, па лініі масавай работы, зроблена вельмі многае, аднак гэта пакуль яшчэ ня выходзіць з рамкі комсамолу. Існуе некаторая боязкасьць „открытия Америки" ці ўсё тое, што яны прарабілі, гэта „семечки" ў параўнаньні з дасягненьнямі беларускага тэатру. Адным словам, вельмі часта чутны ноткі некаторага нявер'я ў свае сілы. Аб чым, напрыклад, гаворыць такі факт, што створаная ТРАМ'ам інсцэніроўка „Плеткафон" і п'еса „Першы Штандар", апошняя ацэнка друкам, як „новы ўклад у пролетарскае мастацтва", а таксамы цэлы шэраг комсамольскіх сьпеваў яшчэ да гэтага часу ня выданы. Кіраўніцтву ТРАМ'ам трэба прыняць усе меры для таго, каб створаныя колектывам ТРАМ'у п'есы былі надрукаваны і маглі быць выкарыстаны другімі тэатрамі, а таксама самадзейнымі рабочымі гуркамі.

Кажучы аб разьвіцьці ТРАМ'аўскага руху ў БССР, што зьяўляецца вышэйшай формай самадзейнага мастацтва, трэба падкрэсьліць, што тут існуе некаторая недаацэнка з боку адпаведных організацый і ўстаноў ролі ТРАМ'у, як „падважніка соцыялістычнай рэконструкцыі мастацтва". Наркомфінам БССР безапэляцыйна выкрэсьлена з бюджэту па Наркомасьветы субсыдыя беларускаму і організованаму ў асобным кварталe яўрэйскаму ТРАМ'ам на 1931 год, а гэта з усёй яскравасьцю паказвае на нежаданьне разабрацца ў тым, якую вялізарную ролю павінны адыграць ТРАМ'ы ў справе стварэньня новага беларускага пролетарскага тэатру.

Існуючы ў БССР беларускі вандроўны рабочы тэатр-студыя ЦСПСБ

паставіў дзьве п'есы „Стрэл" Бязыменскага і „Вецер з мора" Чырыкава і цяпер працуе над пастаноўкай „Чынгільбуд" Федзіна. Тэатр гэты прызначаны для абслугоўваньня невялікіх прамысловых раёнаў, куды ня можа прабрацца вялікі тэатр, рабочых клюбаў, вузлавых чыгуначных станцый. Акторскі склад гэтага тэатру—гэта ў сваёй большасьці рабочы маладняк, які праявіў сябе ў самадзейных гурткох.

Мяркуючы па гэтых дзьвёх студыйных пастаноўках, малады рабочы колектыў мае ўсе мажлівасьці ў бліжэйшы час заняць належнае яму месца сярод старэйшых беларускіх тэатраў. Адно, з чым дрэнна ў гэтым тэатры, хоць гэта адносіцца абсолютна да ўсіх беларускіх тэатраў, гэта вылучэньне маладых драматургаў і рэжысэраў. Тут неабходна будзе цалкам выкарыстаць прыклад беларускага ТРАМ'у, гэта арганізацыю пры ўсіх тэатрах драматургічных і рэжысэрскіх груп.

У БССР, апроч беларускага тэатру, расьце і разьвіваецца яўрэйскі тэатр, што зьяўляеецца фактам вялізарнага політычнага і культурнага значэньня. а таксама бліскучым паказальнікам правільнага вырашэньня нацпытаньня.

Яўрэйскі дзяржаўны тэатр БССР адзін з першых беларускіх тэатраў узяў правільную ўстаноўку на абслугоўваньне арганізаванага рабочага гледача, тэатр першым узяўся за распрацоўку соцыяльна значнага рэпэртуару, як, напрыклад: „Ботвін" А. Вілігорыка, „Гірш Лекерт" А. Кушнярова, „Джым Куперкоп" Годзінэра і інш. п'есы, добра вядомыя яўрэйскім рабочым ня толькі Беларусі, але і ўсяго Саюзу.

Беларускім дзяржаўным яўрэйскім тэатрам пастаўлены п'есы: „Гоп-ля" Эрнэста Толера, „Сьвята ў Касрылаўцы" па Шолам Алэйхэму, „На пакаяннай цэпі" Пэраца, „Глухой" Д. Бэргімсона, „Барацьба машын" Даўгапольскага, „Стрэл" Бязыменскага і „Авечая і крыніцы" Лопэ-дэ-Вэга. Першыя тры п'есы ў свой час выклікалі здаровую крытыку з боку пролетарскай грамадзкасьці, што тэатр улічыў і сваячасова перабудаваў сваю працу, такім чынам паказаў сябе найбольш чулым да запатрабаваньняў сучаснасьці.

Тэатр за час свае працы вылучыў з свайго асяродзьдзя цэлы шэраг здольных рэжысэраў: Літвінава, Норда, Айзэнбэрга, якія павядуць тэатр да далейшага яго росквіту. На чале мастацкага кіраўніцтва стаіць заслужаны актор БССР Рафальскі.

Акрамя гэтага, у БССР два гады таму назад арганізаваны яўрэйскі і польскі дзяржаўныя вандроўныя тэатры; як першы, так і другі, за гэты час правялі вялікую работу па абслугоўваньні працоўных нацменшасьцяй, мястэчак, гарадзкіх акраін, яўрэйскіх і польскіх колгасаў.

Беларускі тэатр у сучасны момант уступіў у трэці пэрыод свайго разьвіцьця, калі значная частка актораў цалкам аддае свае сілы на службу соцыялістычнага будаўніцтва, калі тэатр разьвязвае проблему нацыянальнага мастацтва, рашуча адкінуўшы наскрозь прагніўшую тэорыю „самабытнасьці", гэта значыць абмежаванасьці, падкрэсьліваньня экзотыкі, а вывучаючы жыцьцё рабочае клясы сёньняшняга дню, стварае новую пролетарскую культуру, якая дапамагае рабочай клясе і яе партыі ў справе выкананьня чарговых конкрэтных задач соцыялістычнага будаўніцтва. Тэатр наш браў і будзе браць лепшыя ўзоры пролетарскай драматургіі народаў СССР. Аднак неабходна ў гэтым напрамку ўжыць шэраг захадаў для стварэньня новых кадраў драматургаў, а для гэтага неабходна прыцягненьне пісьменьнікаў, знаёмых з бытам і ўмовамі рабочае клясы Беларусі з тым, каб даць тэатру арыгінальную драматургічную літаратуру; распрацоўваючы яе, беларускі тэатр будзе садзейнічаць стварэньню адзінай соцыялістычнай культуры.

Пытаньне падрыхтоўкі пролетарскіх тэакадраў у БССР стаіць вельмі востра. Папаўненьне тэатраў ідзе галоў-

ным чынам за лік праявіўшых сябе ў самадзейных гурткох, што дае станоўчыя вынікі ў сэнсе ачышчэньня тэатраў адрэакцыйнай, нацыянал-дэмократычнай і шовіністычнай настроенай часткі актораў, аднак адсутнасьць ведаў у галіне тэатру да некаторай ступені затрымоўвае рух тэатру наперад, як тэатру высокай культуры. Выходзячы з усяго гэтага, уся наша работа ў галіне мастацтва павінна быць накіравана на падрыхтоўку пролетарскіх кадраў. З гэтай мэтай у пачатку 1931 году адчыняюцца аднагадовыя драмкурсы, што дасьць магчывась папоўніць тыя тэатры, якія ёсьць, а так сама арганізаваць чатыры раённыя тэатры для абслугоўваньня соцыялістычнага сэктару вёскі і падрыхтаваць інструктароў для самадзейных гурткоў.

У кастрычніку - лістападзе м-цы 1931 году мяркуецца разгарнуць трэці беларускі дзяржаўны тэатр з тым, каб у індустрыяльных цэнтрах БССР, у Менску, Віцебску і Гомелі мець стацыянарныя беларускія тэатры. Яўрэйскаму тэатру БССР фактычна прыдзецца абслугоўваць усе гарады Беларусі, з пастаяннай базай у Менску.

Пабудова ў Менску вялікага тэатру на 2.500—3000 месц, а да гэтага мяркуецца прыступіць у жніўні 1931 году, дасьць магчывасьць разгарнуць работу беларускага і яўрэйскага акадэмічных тэатраў.

З кастрычніка 1931 году ў Менску адчыняецца тэхнікум сцэнічнага мастацтва, з яўрэйскім і польскім аддзяленьнямі, які ў бліжэйшыя гады дасьць новыя, сьвежыя сілы працаўнікоў мастацтваў як для профэсійнага тэатру, так і для самадзейных гурткоў.

Па часьці разьвіцьця самадзейнага мастацтва БССР стаіць на апошнім месцы. Мінулае права-опортуністычнае кіраўніцтва НКАсьветаю на працягу раду год абсолютна нічога не зрабіла ў гэтым напрамку. Работа па самадзейным мастацтве і да гэтага часу яшчэ не разгорнута. Усё ідзе самацёкам. У той час, як у РСФСР, УССР і другіх братніх рэспубліках існуюць цэлыя інстытуты па самадзейным мастацтве, выдаюцца на працягу некалькіх год часопісі, у БССР у штатах НКАсьветы нават няма аніводнага платнага работніка.

Меркавалася ў гэтым годзе прыступіць да выданьня часопісі „Самадзейнае мастацтва", аднак гэтае пытаньне правалена, і ўсё з прычыны недаацэнкі ролі самадзейнага мастацтва. Для таго, каб падняць гэту работу, у студзені м-цы 1931 году, пакуль у парадку грамадзкай работы, будзе створаны габінэт па самадзейным мастацтве. Усё-ж, ня гледзячы на некаторую недаацэнку ролі самадзейнага мастацтва, самадзейныя гурткі растуць і разьвіваюцца.

Такім чынам праводзячы ленінскую нацыянальную політыку, вядучы бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоунай небясьпекай на даным этапе, з актывізуючымісяконтррэволюцыйным беларускім нацыянал-дэмократызмам і шовінізмам розных колераў, пролетарыят БССР, пад неаслабным кіраўніцтвам КП(б)Б, разьбіваючы правых і „левых", перамагаючы на гаспадарчым фронце, вядзе краіну да эканомічнага і культурнага росквіту, стварае нацыяльную культуру, стварае беларускі пролетарскі тэатр.

БІБЛІОГРАФІЯ

„А заўтра народ увесь паўстане“

I

Як і першая кніжка Міколы Хведаровіча «Настроі», як і маленькі зборнічак у «бібліотэцы чырвонаармейца» «Баявыя песьні, так і «Рытмы» (Белдзяржвыдавецтва, 1930) выразна сьведчаць аб тым, што Мікола Хведаровіч творча расьце, што тэматычная еднасьць яго поэзіі аднолькава моцна і выразна выпукляецца ў кожным з памянёных мною зборнікаў. Гэтым самым я зусім ня хочу сказаць, што Мікола Хведаровіч м о н о л і т н ы ў сваім поэтычным credo, што яго пісьменьніцкая постаць заўсёды рушыць па аднатаваным загадзя шляху, што настроі і рытмы яго вершаў ня маюць збочаньня з гэтага шляху. Я хочу падкрэсьліць, што тэма, сужэт, канва яго поэзіі выразна прадуманы, досыць абгрунтаваны, і ўся справа толькі ў множстве і колёрытнасьці асобных варыяцый аднэй і тэй-жа тэмы.

Якая-ж т э м а зьяўляецца а с н о ў н а й у поэзіі Хведаровіча, якія пэрспэктывы ставіць гэтая тэма ў разьвіцьці пісьменьніцкіх магчымасьцяй аўтара «Рытмаў», якія недахопы, на нашу думку, ёсьць у разьвязваньні гэтай тэмы? А галоўнае—які крытэры гэтай тэмы, якія клясавыя і грамадзкія прадпасылкі мае яна?

На ўсе гэтыя пытаньні паспрабуем знайсьці адказ у «Рытмах».

2

Першае, што асабліва выразна відаць пры разглядзе творчасьці Міколы Хведаровіча, гэта выкарыстаньне ў сваёй поэзіі двух асноўных мотываў: 1) сучаснае социялістычнае будаўніцтва і 2) рамантыка грамадзянскай вайны.

Ілюструем. У кніжцы «Рытмы» з чатырох разьдзелаў («Рытмы дзён», «Поэтычная запіска», «На сваім парозе» і «Змаганьне») толькі адзін разьдзел «На сваім парозе» так ці інакш выходзіць з рамак вызначаных намі дзьвюх тэм. У гэтым разьдзеле ёсьць вершы з мотывамі асабістай лірыкі. Але аб іх гаворка будзе ніжэй.

Як поэта ўспрыймае барвовасьць, рытм і пэнт нашых дзён?

Якое шчасьце
Будаваць і верыць
Якою радасьцю
Здабыты новы крок.
Як добра напаткаць
Прыкметы новай эры,
Як добра пазнаваць
Што з намі йдзе народ [1])
(стар. 12)

І вось гэтыя «прыкметы новай эры» прагна шукае поэта, намагаецца, знайшоўшы ў іх— «прыкметах новай эры»—настроі і матэрыял для сваіх вершаў, уліць поступ социялістычнага будаўніцтва ў сваю поэзію і гэтым самым зрабіць яе выпрабаваным сродкам у клясавай барацьбе, у клясавым выхаваньні чытацкіх колаў. Вершы «Пабудова», «Нашы дні», «Торф» ды іншыя падмацоўваюць гэтую думку. І ўспрыманьне социялістычнага будаўніцтва ў вершах Хведаровіча не п а с ы ў н а е, ня вонкавае, а з гэтай прычыны—не павярхоўнае. Наадварот, ён крочыць разам з эпохай, ён адчувае кіпкасьць эпохі. У вершы «Голас дзён» так дэклируе Хведаровіч:

Хай голаву злажу
Упарта ў цяжкай працы,
Ні кроку ад жыцьця!
Сягоньня лёзунг мой.
Я не хачу
Двудушных дэкляцый
Падпісваць
Дрыжачаю рукой...
(стар. 21)

Захоплены і запалонены социялістычным будаўніцтвам тут, у Савецкай Беларусі, поэта «успрымае таемныя гукі» з «Заходніх палёў Беларускай зямлі» і ў гэтых гуках чуе ён ракатаньне рэволюцыйных хваль у Заходняй Беларусі. Калі сёньня на «крэсах» —

Сыноў павялі
На ганьбу,
На зьдзекі,
На мукі,—

[1]) На жаль, поэта ня здолеў унікнуць слова «народ». Але яго ні ў якім разе нельга глумачыць у сьвятле «нашаніўскага» разуменьня.

Дык прыйдзе заўтрашні дзень, калі «народ увесь паўстане», бо:

Паслухайце слова
Паўстанскага ўзмах,
Запал агнявога пісаньня:
Што воля ніколі
Ня прыйдзе сама,
Што воля даецца
Ў змаганьні.
(стар. 10).

Тут паўстае выразнае б а л ь ш а в і ц к а е разуменьне клясавай барацьбы, менавіта тое разуменьне, што вызваленьне працоўных ад капіталістычнага прыгнёту можа прыйсьці толькі праз змаганьне, праз узброенае змаганьне.

Гэтых прыкладаў досыць, каб станоўча адказаць на пытаньне: як дні социялістычнай будоўлі ўспрымае Хведаровіч. Як на дадатны бок поэзіі Хведаровіча, мы павінны паказаць менавіта на тое, што поэта ўсьведамляе цяжкасьці нашага будаўніцтва, ён не заплюшчвае вочы і на тое, што ў нашы шэрагі барацьбітоў за социялізм трапляюць часам ваўкі ў авечай скуры.

У поэзіі Хведаровіча ёсьць—я падкрэсьліваю—разуменьне цяжкасьцяй нашага будаўніцтва, але і ён часта забываецца на гэта, і яго поэзія часта падпадае пад уплыў «ажалезваньня», барабаншчыны. Вось чаму неабходна паставіць перад Хведаровічам проблему няўхільнага паглыбленьня зьместу сваёй поэзіі.

3

Пяройдзем да разгляду другой тэмы кнігі «Рытмы», тэмы аб грамадзянскай вайне. Мотывы грамадзянскай вайны—гэта зьбег поэтычных магчымасьцяй Міколы Хведаровіча. Як і ў «Настроях», так цяпер і ў «Рытмах» гэтыя вершы аб грамадзянскай вайне вызначаюцца з шэрагу іншых асаблівай насычанасьцю, асаблівым пачуцьцёвым уздымам.

Дзе, у чым прычына гэтага? Чаму вершы пра социялістычнае будаўніцтва—вершы бадзёрыя, дынамічныя, але ўс-ж не ахінуты «цяплынёй» мастака? Чаму на фоне іх так выразна адцяняюцца «Балядa», «Творчая ноч», «Прыход музы», вершы з «Поэтычнай запіскі»?

Хведаровіч—рамантык. І калі ў вершах пра социялістычнае будаўніцтва сама сучаснасьць настолькі грандыёзна, што здольна даць «спажыўны» матэрыял і для рамантыка, дык усё-ж і ў іх мы бачым постаць рамантычнага «поэта і змагара», якога яшчэ няма, але які прыдзе абавязкова, які патрэбен «на новых сьветлых пожнях».

У вершах аб грамадзянскай вайне Хведаровічава творчасьць скрыжоўвае ўплывы такіх моцных мастакоў гэтага «жанру», як Сьвятлоў і Ціханаў. Як і ў іх, гэтак і ў Хведаровіча ўлюбёны гэрой—менавіта гэрой грамадзянскай вайны. У «дзьвёх балядах» гэты гэрой увасабляецца ў Рафаіле, у «Балядзе» ў вобразе капітана, у «Творчай ночы» гэта забітыя пад Перакопам, пад Бухарай. І калі да Міхала Сьвятлова прыходзіць ноччу Гэйнэ, дык Хведаровіч сустракае сваіх блізкіх і знаёмых, што сканалі ў завірусе тых дзён, якія гэтак любы поэту:

Ах, дальні паход, нязьлічоныя
мілі,
Магілы, магілы, магілы, магілы...
(стар. 56).

Бязумоўна, у гэтых вершах Хведаровіча лёгка адшукаць хібы. Але раней чым гэта рабіць, трэба заўважыць на правамоцнасьць у нашай поэзіі аналёгічных мотываў. Мы жывем ва ўмовах капіталістычнага сьвету, які ўсімі сіламі і сродкамі намагаецца нанесьці ўдар краіне Саветаў. Нядаўні процэс «Промпартыі», арышт контрэволюцыйнай групы нацыянал-дэмократаў з настойлівай пераканальнасьцю кажуць аб тым, што Пуанкарэ-Вайна ня можа супакоіцца ад думкі, што рана ці позна краічай Саветаў зробіцца ўвесь сьвет. Старому Рэймонду Пуанкарэ ня сьпіцца, як ня спалася Скупому Рыцару Пушкіна. Рыцар меў золата, а Раймонд Пуанкарэ у дадатак мае нешта больш магутнейшае за золата—танк, аэроплян і газ. Бадай ці знойдзецца ў нас чалавек, які яшчэ ставіць пад пытальнік магчымасьць вайны. Вось чаму, падыходзячы да вершаў Міколы Хведаровіча з пункту гледжаньня сёньняшняга політычнага жыцьця, у той частцы гэтых вершаў, дзе аўтар расказвае аб жахах вайны, дзе ён сваімі вершамі дбае аб ваеннай небясьпецы, яны каштоўны, патрэбны і сваячасовы.

Але ў іх ёсьць і багата адмоўнага, куды больш адмоўнага, чым у вершах першай тэмы.

Так, у вершы «Уяўленьне» ёсьць гэткія радкі:

Дзе мая шабля?
Дзе мой наган?
І перабітая зьвісла нага...
Чую паходную песьню,
Д у ш н а м н е,
Цесна мне, цесна...[1])
(стар. 41).

Гэта якраз тое, што дужа часта сустракаем у ўкраінскага Хведаровічава брата па поэзіі Усэнкі: яму таксама душна ў абыймах будняў, а ўспаміны аб прашоўшых днёх яшчэ больш раняць

[1]) Падкрэсьлена мною—Б. М.

сэрца. Апроч таго, кожны лiонэр скажа, што дрэнны той вайсковы, які ня будзе мець пад рукамі сваёй зброі. Бадай, ці патрэбна каму гэткая «дбайнасьць»?

Так і ў «Творчай ночы», апроч зданяў гэрояў грамадзянскай вайны, прыходзяць да яго і... дзяўчаты. Арыгінальна пачаты верш зьбіваецца на шаблённую «філёзофію» аб каханьні. Мы амаль што не краналі разьдзелу «На сваім парозе». Вось у ім таксама можна знайсьці багата поэтычных і ідэолёгічных прарываў. Калі раней ён адчувае сябе змагаром і ўдзельнікам будаўніцтва, гаспадаром сваіх дзён, дык тутака—у гэтым разьдзеле—абставіны і раней вызначаныя догматы крыху зьменьваюцца:

Няхай асудзяць—перасудзяць
Бяздомны мой брадзячы лёс,

—кажа поэта.

Калі ў адным месцы ён зусім слушна запэўняе, што яго поступ—поступ працоўных, што ён, з гэтай прычыны, нікалі ня спыніцца ў дарозе, дык на старонцы 85 ён робіць двусэнсавую заўвагу:

Мы заўжды йдзем да сьветлай
мэты,
Пакуль у дарозе ня прыстанем.
Ёсьць неабдымнасьць ў сьвеце
гэтым,
Ёсьць недасяжнасьць у парыванньях.

Выходзіць так, што на «сваім парозе» поэта спатыкнуўся.

Нельга абмінуць і верш «Быццам хтось жартуе»... (стар. 49). Трэба толькі пашкадаваць, што ў «поэтычных запісках» Хведаровіча знайшлі месца такія вершы, дзе неакрэсьленае ўяў прэвалюе над розумам поэты. Нічога няма дзіўнага, што:

Сам я вінаваты, нечага злаваць
І баліць з бяссоньня
моцна галава.

Сам поэта вінен у тым, што такія вершы зьмяшчаюцца побач з творамі аб размаху соцыялістычнага будаўніцтва Вось чаму, разумеючы памылкі, трэба іх выпраўляць.

Канчаючы абеглы разгляд новай кніжкі Хведаровіча, мы павінны параіць яму асабліва ўважліва аднесьціся да мастацкага боку сваёй творчасьці. На некаторыя хібы мы паказалі. Мікола Хведаровіч павінен памятаць, што толькі клясавая выразнасьць і—з другога боку—найвышэйшая мастацкасьць могуць стварыць у спалучанасьці сапраўды патрэбны нашаму грамадзтву, якое будуе соцыялізм, твор для пасьпяховага будаўніцтва гэтага соцыялізму.

Барыс Мікуліч.

Менск. 15/XII—30 г.

Пра „Вяршыні жаданьняў“ Вал. Маракова

Вышаў з друку трэці зборнік поэзіі «Вяршыні жаданьняў» поэты Валерыя Маракова. Першым зборнікам яго творчасьці быў зборнічак вершаў «Пялёсткі» (1926 г.), выхад якога нашаю крытыкаю быў узяты ў штыхі за поўную адсутнасьць грамадзкіх мотываў, за адрыў ад грамадзкага жыцьця нашае эпохі і, як вынік гэтага адрыву, насычанасьць мотывамі пэсымістычнага, упадніцкага сьветаўспрыняцьця, беспрасьветнага ныцьця.

Мала чаго новага ў прасьвятленьне ад туманнага засьцілу гэтых мотываў упёс і другі, які вышаў неўзабаве пасьля «Пялёстак», зборнік «На залатым пакосе» (1927 г.), але які ўсё-ж такі да некаторай ступені сьведчыў аб станоўчых момантах у творчым поступе поэты (прысутнасьць элемэнтаў грамадзка-палітычных мотываў). І далей разьвіцьцё творчасьці поэты пайшло па шляху поўным супярэчліва-процілеглых тэндэнцый. То поэта спрабуе вызваліцца з-пад палону таго зачараванага кола, якое моцна трымае яго ў сваіх абоймах і афарбоўвае пялёсткі маладое юнацка-ружовае радасьці ва ўпадніцка-пэсымістычныя колеры, разбаўляе зусім станоўчыя парыванньні поэты-юнака да радасьці новага жыцьця атрутай індывідуалістычна-суб'ектывіцкіх настрояў, мяшчанска-абывацельскага быцьця, што знайшло найбольш поўнакроўнае мастацкае ўцелясьненьне ў глыбока-пэсымістычнай «Маёй поэме» («Полымя №№ 1, 3, 4—1929 г.). У гэтай поэме хісганьні поэты паміж тэндэнцыямі завалодваньня поэтаю магутным размахам будаўніцтва новага і падупаданьня пад уплыў і ўладу тэндэнцый па сваёй накіраванасьці супроцьлеглых першым—мотывам мяшчанска-абывацельскім, губляньне жыцьцёвых сьцежак і пуцін, адрыў ад здаровага творчага жыцьця і ўцяканьне ў нетры богемы, упадніцтва, разлаганьне і г. д. дасягнулі таго пункту разьвіцьця, калі пытаньне, якое павінна стаяць перад кожным папутнікам пролетарыяту, папутнікам пролетарскае рэволюцыі—ці разам з пролетарыятам, ці супроць яго (сярэдзіны не павінна быць)—у сваім вырашэньні давала больш стымулаў на карысьць ня першага адказу, а другога («супроць»).

Але поэта паступова пачынае ўсьвядомліваць соцыяльную «обреченность»

ня выміраньне тае богэмы, упадніцтва, чым паланіла яго творчасьць дробнабуржуазнае быцьцё:

«...Тут туман,
Тут пыл сталецьцяў душыць,
Тут сум забытых,
Дальніх
І чужых...
Тут
Па-асьлінаму, падняўшы горда вушы,
Гавораць так,
Шго ім абрыдла жыць!
Я знаю іх... Я ім калісьці верыў...
Я іх балота славіць пачынаў,
Пакуль мне
Ў лепшы сьвет
Не адчынілі дзьверы,
Пакуль іх дум,
Іх пачуцьця ня знаў...»
(«Вяршыні жаданьняў» ст. 5-6).

(Дарэчы поэта кажа аб тым, што падуплыў быў несьвядомы, не азмысьлены—«іх дум, іх пачуцьця ня знаў»,—што становіць сабою пры ўсьведамленьні больш магчымасьці і даных для канчатковага адыходу і скіданьня з сябе бярэмя гэтага падупаданьня).

Але поэта ўбачыў новае жыцьцё без усьведамленьня ягонага месца («дзесьці»), канечных мэт і ідэй яго. Яно яго захапляе, але не азмысьліваецца ў яго конкрэтнасьці, рэчавасьці:

«Ёсьць лепшы сьвет
Напружнай творчай працы,
Ёсьць сонца, песьні, ёсьць вясна...
Ёсьць шчасьце йсьці
І верыць,
І змагацца,
І вольнай думкай ў творчасьці
Лунаць.
Там дзесьці [1]), там у ячэйках
І ў школах
Жывуць другім напружаным жыцьцём.
Ня хіляць голаў
Нізка долу
І не згараюць
Ў мёртвых пачуцьцёх».
(«В. Ж.» ст. 5).

Якое гэта жыцьцё і з якімі яно мэтамі—гэткага пакуль няма ўсьведамленьня. Даецца толькі тое, што гэты новы сьвет—«лепшы» і адзнака адменнасьці гэтага новага жыцьця («другое») ад свайго ранейшага, адзнака яго «напружанасьці», ды яшчэ тое, што ў ім «ня хіляць голаў нізка долу і не згараюць у мёртвых пачуцьцёх». Тое-ж, што «ёсьць шчасьце йсьці і верыць, і змагацца, і вольнай думкай ў творчасьці лунаць (!!?), яшчэ зусім не вызначае канечнае мэты і ідэі гэтага жыцьця ў дачыненьні да яго, як да об'екту, існуючага па-за суб'ектыўнымі жаданьнямі поэты. У адносінах-жа да гэтага жыцьця поэты (тыпа-вобраз якога компануе асоцыяцыя ўсіх мотываў творчасьці), як суб'екту ў дачыненьні да гэтага жыцьця, можна сказаць, што ён якраз у гэтым жыцьці і бачыць мэтаю (ці, кажучы ягонай тэрмінолёгіяй—«шчасьцем»), а ня сродкам, гэта—«йсьці і верыць, і змагацца»—і наіўнае—«вольнай думкай ў творчасьці лунаць».

І тое, што для сьвядомага будаўніка соцыялістычнага сёньня зьяўляецца толькі сродкам для ажыцьцяўленьня ідэі пабудовы соцыялістычнага ладу,—тут набывае мэту, ідэю:

«Ў напружнай творчай працы
Знаходжу ўсё:
І радасьць,
І любоў.
Я знаю шчасьце—верыць і змагацца,
Ісьці, гарэць, ўпівацца барацьбой...»
(«В. Ж.» ст. 6).

Да некаторай ступені правільную характарыстыку свае творчасьці, дапамагаючай разуменьню соцыяльнай законамернасьці, дае сам поэта, кажучы, што ён:

«З балота бруду і мяшчанства
Ўсё-ж бачыў полымя зарніц.
Я гадаваў у сабе
Паўстанца
І новым дням схіляўся ніц»...
(«В. Ж.» ст. 75).

Поступ новага жыцьця прасьвятляе перад поэтам жыцьцёвыя далягляды, расчыняе шырокае поле дзейнасьці тэй часткі грамадзтва, для якое ўваход на гэта поле дзейнасьці быў надзвычайна звужаным альбо зусім закрытым, і погляды якое поэта выказвае:

«Ўстае вясна
Ў разгары сьветлых гімнаў,
І чэзьне дым з жыцьцёвых берагоў...»
«Жыцьцё па-новаму красуе маладых...
Вакол так многа веры, парыванняў,
Так многа песьняў сонечнай вясны».
(«В. Ж.» ст. 21).

І пад напорам уздымнага пачуцьця поэта зварочваецца да комсамолу:

«О, я таксама з новаю культурай
Іду аднэю з вамі паласой,
Каб несьці сьцяг змаганьня,
Перамогі,
Гарэць імкненьнем юных і жывых»...
(«В. Ж.» ст. 21-22).

Але адсутнасьць моцных соцыяльных карэньняў у творчасьці Валерыя Маракова дае надзвычайна адчуваць сябе. Поэта і тут яшчэ соцыяльна зусім не аформіўся, канчаткова ня вызначыўся.

[1]) Тут і далей падкрэсьлена мною—У. С.

Тэндэнцыі эруху ў бок новага ў В. Маракова носяць характар неазмысьлены, стыхійны, характар выбуху пачуццяў, ня маючы і каліва адзнакі пранікненьня гэтымі зрухамі ўсяго яго сьветапогляду ў конкрэтным дачыненьні да гэтага новага. Поўнае панаваньне над усім псыхо-ідэолёгічным складам стыхійнага, выбухі якога выліваюцца ў гэткія, зусім неакрэсьленыя, неконкрэтныя агульныя слова-вобразы, як «вясна», «песьні», «сонца», «шчасьце», «уздым», «мяцежныя пачуцьці», «радасьць», «сьмех», «вясельле», «навалы», «разгар», «перамога», «барацьба», «змаганьне», «верыць», «жыць», «бунтоўныя», «бурныя», «юныя», «сьветлыя», «харошыя», «залатыя», «буйныя», «ласкавыя», «жывыя», «душа», «прасторы», «стыхія», «раньне», «новыя», «любыя» і г. д. Конкрэтнага, рэчавага, а ня слоўнага азмысьленьня новага жыцьця няма, няма і сьвядомага, глыбокага падыходу да яго. Вобразны, мастацкі наказ новага, а не расказ аб ім, у Маракова зьмяняе схэматычны, гола-фразёрскі, павярхоўны падыход да нашае творчае сучаснасьці:

«Новае сёньня красуе
Новыя песьні
І час...
Гляньце, навакол будуюць
Ўраз за колгасам
Колгас.
Нетры сталёвых багацьцяў
Мы пераплавім
Ў плугі—
З цемрай і брудам
Змагацца,
Біць па магілах тугі...
Кожная кропля
Жалеза
Пойдзе для гарту зямлі.
Што залатыя нам
Крэзы,—
Ў нас залатыя палі!
Ўзрыем мы горы
І нетры,
Пусьцім экспрэсы ў разьбег».
(«В. Ж.» ст. 39-40).

Сказаць словы—«новае сёньня красуе», «новыя песьні і час», што «будуюць колгас за колгасам», і «нетры сталёвых багацьцяў мы пераплавім ў плугі», і што трэба змагацца, «змагацца з цемрай» і г. д., ня ўклаўшы ў гэтыя паняцьці конкрэтны зьмест,—значыць, што мастак нічога не сказаў, бо «поэт мыслит образами; он не доказывает истины, а показывает ее» (Бялінскі). (Падкрэсьлена мною—У. С.) і «там нет и следа художественного творчества, где эта идея так и является в своем «отвлеченном виде»... (Пляханаў). У В. Маракова не хапае творчых сіл для мастацкага вобразнага паказу нашае творчае рачаіснасьці ва ўсёй яе глыбіні, супярэчнасьцях і тэндэнцыях разьвіцьця.

Гэтыя катэгорыі ў творчасьці В. Маракова замяняе бунтоўная стыхійнасьць, пачуцьцёвая інтуіцыя, якія, не знаходзячыся пад сталым контролем сьвядомасьці і падначальваючыся якім, далей сьлепаты да жыцьцёвых процэсаў не вядуць. Ня маючы моцнага соцыяльнага пункту апоры, ён часам сьлепа падпадае пад уплыў розных тэндэнцый у процэсах руху об'ектыўнае рачаіснасьці.

Часам дае аб сабе знаць пэўны псыхічны разлад поэты з рачаіснасьцю, пэўная раздвоенасьць, налёт пэсымізму, апоэтызаваньне суму:

«Цені бягуць другія,
Сьніцца сэрцу другі экран...
Дзе-ж вы, мае дарагія,
Дзе ваш раскінуўся стан?
Песьні сьпяваюць навокал.
Вецер зьвініць і зьвініць.
Мабыць, яшчэ далёка,
Мабыць аб іх мне ня сьніць.
У казках і ў песьнях і ў думах,
У шуме і звоне дарог
Сэрца сагрэтае сумам,
Родняму краю зьбярог»...
(«В. Ж.» ст. 34).

Гэты душэўны разлад і соцыяльныя ўплывы падкрэсьліваюць тое, што ўлюбёным вобразам поэты зьяўляецца вобраз жанчыны з «сэрцам прыстаўшым», «рассыпанымі юнымі днямі», ня вобраз жанчыны-работніцы і сялянкі—актыўных барацьбітоў за соцыялістычнае заўтра, што ідуць у ногу з мужчынамі, рушаць усё старое і будуюць новае, а вобраз жанчыны-мяшчанкі, сумуючай па ўтрачанай юнацкасьці ў абстрагаваных ад усяго грамадзкага жыцьця прыгодах каханьня, якая жыве толькі мінулым, тым, што яна «ўсё-ж калісьці кахала і захапляўся ёю не адзін («Ты гаворыш»...—«В. Ж.» ст. 12 і інш.). З боку адсутнасьці моцных соцыяльных карэньняў, соцыяльнай невызначальнасьці і разладу поэты з сёньняшняю рачаіснасьцю цікава прасачыць тое, што як з вёскаю. гэтак, галоўным чынам, з горадам поэта ня мае контакту, органічнага адзінства, цэльнасьці. Падуладнасьць стыхійнасьці кідае яго ад аднаго да другога і нідзе не становіць яго ў сталае дачыненьне да пэўнага месца (гораду ці вёскі). Прыродзе поэта адводзіць галоўнае месца ў псыхолёгічным контэксьце свае творчасьці.

Амаль усе мотывы гэтае творчасьці поэта выносіць на лона прыроды і, яскрава падкрэсьліваючы, становіць яе фонам, на якім дае пэўнае выражэньне сваім настроям. На фоп апоэтызаванай і ідэалізаванай поэтаю прыроды ім выносяцца ўсе соцыяльныя, грамадзкія і чыста лірычныя асобныя мотывы:

«Руйнуй мінулых дзён галгофу,
Дзе сэрца краю Мураўёў
На жах,
На крыўду ўсёй Эўропы
Мячом Расіі пракалоў.
Праклянце, кат, табе і злодзей.
Цябе праклянў
Мой родны край.
Такім, як ты, сказаў ён:
— Годзе,
Даволі сэрца надрываць!..
Так я стаяў,
Так марыў ў нівах
Маіх прастораў залатых,
І ў глыбіні душы шчасьлівай
Зьнікаў туман, праходзіў дым»...
(«В. Ж.» ст. 47-48).

Тут прырода поэтаю гэтак ідэалізавана, што яна зьяўляецца і сродкам «исцеления» душы поэты ад туману і дыму жыцьцёвага шляху («і ў глыбіні душы шчасьлівай зьнікаў туман, праходзіў дым»). Прырода «мэту абуджае быць вечна чыстым, маладым!» («В. Ж.» ст. 63). Прырода зьяўляецца об'ектам лепшых імкненьняў поэты:

«І я пайшоў—палёў бяскрайніх,
Вясны бяскрайняй
Ўзяць агонь»...
(«В. Ж.» ст. 64).

Лепшымі мастацкімі мясьцінамі ў творчасьці В. Маракова зьяўляюцца малюнкі прыроды:

«Ліпнёвы вечар дагараў
Ў абдымках ласкавых і кволых.
І тонкагубы вецер граў
Над дальлю ніў,
Палёў і сёлаў
Такою дзіўнаю гаворкай,
Такою ласкавай красой,
Як гэта даль,
Як гэта зорка,
Над гэтай буйнай паласой...
Хтось кінуў ружы на закаце
Жывой і сонечнай рукой,
І, нібы казачная маці,
Ноч навявала ім спакой.
Ў адзеньне змроку, забыцьця
І сну,
Бяссоньня і трывог
Сюды прыходзіў з нябыцьця,
Хто пакахаць, хто верыць мог»...
(«В. Ж.» ст. 67—68).

Тут прырода зьяўляецца месцам лепшых жыцьцёвых імкненьняў поэты. Лепшыя мастацкія вобразы ў творчасьці В. Маракова належаць вобразам прыроды (праўда, у значнай меры вобразам сантымэнтальным):

«Закат крывавымі і тонкімі рукамі
Матаў істужку сонечнай зары».
(«В. Ж.» ст. 49)

Гэрої поэмы «Таварыш Нюрын»—муляры—

«Гукалі зорных вечароў,
Дзе стан бярозкі белацелай (!)
Падпаясаны быў зарой».
(«В. Ж.» ст. 69)

Горад-жа выклікае разлад поэты з ім, «раніць» яго:

«І параніў я ногі
Аб крэмні,
Аб граніт і цамэнт маставых».
(«В. Ж.» ст. 74).

У сучасным савецкім горадзе поэта адчувае сябе непрыстасаваным, як-бы не на сваім месцы. «Кветкі дарагія» яго і там вабяць сваёй чароўнасьцю, і поэта «адлятае душой у дым»:

Гудзеў трывожна шумны горад,
І гул узрастаў, як акіян.
Я да яго ішоў прастораў
Бяз болю,
Крыўды і бяз ран.
Я успрымаў яго стыхію
Стыхіяй юных сіл сваіх...
...І сьніў аб кветках дарагіх я
На пыльных плітах гарадзкіх.
Я кідаў працу, кідаў дружбу...
Я адлятаў душой у дым».
(«В. Ж.» ст. 69-70).

І толькі на лоне прастораў, абстрагаваным часта ад усяго грамадзка-чыннага прыроды, поэта знаходзіць спакой:

«Тут так хораша, праміяў так многа...
Срэбны месяц прылёг на кусты.
Я іду сваёй роднай дарогай,
Зноў вясёлы і зноў малады.
Сёньня ўсё—
Гэта хвойнік і Сьвіслач,
Да сябе заклікаюць пажыць.
Колькі стройных бяроз панавісла
Над вадой і на грудзі мяжы.
Срэбны месяц каханьнем гарыць,
Годзе песень, разгулу, трывогі,
Хоць хвіліну адну так пажыць!»
(«В. Ж.» ст. 33)

Але поэта ня спыняецца на гэтым, далей ён пяе гімны наступленьню новае эпохі, ратуе за магутны поступ сонечнага, новага, праўда, бяз клясавага чоткага вызначэньня суб'екта—носьбіта гэтага новага—пролетарыяту:

«Мы пабудуем сьветлы дзень.
Дзе новы творца
Чалавек
Дарогай простаю ідзе
Без надламаных
І калек.
Мы ўзьнясем сьвятла палац.
Мы ў вокны кінем
Промні сонца.
Каб нашым будучым пацаць
І сьніць аб будучай
Старонцы.
Там, пад праменьнямі вясны
Да сьвету пройдуць
Міліёны,
І аб мінулым успамін
Сатрэцца трактарнай коленай.

І ў новых
Чыстых гарадох
Быць можа
Успомняць на хвіліну
Аб нашых ранішніх
Шляхох —
Ў прасторы будучай краіны»..
(«В. Ж.» ст. 85)

Праўда, мала яшчэ абстрактна, схэматычна марыць аб будучым, не азмысьліваючы конкрэтнага, поўнакроўнага, рэчавага твару нашай штодзённай, поўнай ценявых і сьветавых бакоў рачаіснасьці. Задачай мастака зьяўляецца паказ супярэчлівых тэндэнцый разьвіцьця гэтага сёньняшняга і паказ гэткі, каб у тэндэнцыях разьвіцьця сёньняшняга ва ўсёй плоці быў бачны дзень заўтрашні, пэрспэктывы будучага. Толькі выходзячы з сёньняшняга, можна правільна паказаць будучае.

Каб дасягнуць гэтага, каб стаць пісьменьнікам рабочае клясы, пролетарскай рэволюцыі, ці хоць саюзьнікам пролетарыяту, Валеры Маракоў, як поэта, адбіваючы ў сваёй творчасьці зрухі прамежных соцыяльных пластоў пад узьдзеяньнем пролетарскае рэволюцыі, павінен усьвядоміць неабходнасьць карэннага перавыхаваньня сябе шляхам сталай і бязупыннай працы над пераробкай свае соцыяльнае прыроды, над пераробкай усяго строю свае псыхоідэолёгіі ў напрамку адпаведнасьці задачам рабочае клясы ў соцыялістычным будаўніцтве.

Маракову неабходна ўключыцца ў штодзённую практыку рабочае клясы, крытычна і глыбока пераацэньваючы ранейшыя каштоўнасьці. Неабходна помніць, што бяз гэтае працы лепшыя намеры і імкненьні набліжэньня да пролетарскае літаратуры пісьменьніка з псыхо-ідэолёгіяй прамежных соцыяльных груп ні да чаго не прывядуць.

А Валеры Маракоў сваёю апошняю творчасьцю паказвае сымптомы набліжэньня да нашае творчае рачаіснасьці і яе адлюстроўваньня, аб чым сьведчаць надрукаваныя ўвясну 1930 г. у газэце «Савецкая Беларусь» урыўкі з новай поэмы «Зямля бунтуе». Праўда, надрукаваныя ўрыўкі поэмы «Зямля бунтуе», ня гледзячы на вельмі дадатную і заслугоўваючую ўвагі спробу адлюстраваньня соцыялістычнага будаўніцтва і клясавае барацьбы (у даным выпадку, на вёсцы), паказалі і слабасьць поэты, падкрэсьліўшы неабходнасьць пераробкі ягонай псыхолёгіі.

Толькі ў карэннай, органічнай пераробцы свайго нутра, сваёй соцыяльнае прыроды ў адпаведнасьці з задачамі рабочае клясы ляжаць пуціны да далейшага росту і творчага росквіту поэты.

8/XI-1930 г. У. Л. Сядура.

В. Сташэўскі. „Гаворыць Асінстан імя Сталіна".

Нарыс. БДзВ Менск. 1930 г. Стар. 80. Тыр. 5000 экз., *цана 50 к.*

У апошні час сярод пролетарскае літаратуры, як жанр, пачаў практыкавацца нарыс. Нарыс зараз заняў шырокае месца як сярод расійскай пролетарскай літаратуры, так і беларускай. І гэта зусім зразумела. Наша жыцьцё так шпаркa крочыць уперад, так шпаркa расьце соцыялізм у краіне Саветаў, што мастацкая літаратура яшчэ ня ў змозе сёньня ахапіць увесь размах працоўных-будаўнікоў соцыялізму і мастацкімі вобразамі прадэмонстраваць яго.

Энтузыязм рабочае клясы штогод выкідае з нетраў зямлі на паверхню земнае кулі волаты-фабрыкі, заводы, электрастанцыі. Штогод дзесяткі магутных заводаў, фабрык, электрастанцый, колгасаў, саўгасаў стальлю ўмацоўваюцца на тэрыторыі пролетарскае дзяржавы.

Аб усім гэтым вялізным дасягненьні масаваму чытачу (рабочаму, працоўнаму селяніну) хочацца ведаць, хочацца адчуць, хочацца ўявіць у сваім выабражэньні хоць малюнак гэтага дасягненьня свайго колектыву.

На гэты сур'ёзны попыт масавага чытача дае часта адказ мастацкі нарыс. Ён, бязумоўна, робіць вялікую справу ў сэнсе азнямленьня працоўных з іх дасягненьнямі ў будаўніцтве соцыялізму. З нарысу працоўны чытач без асаблівай цяжкасьці можа атрымаць адпаведны малюнак, адпаведную ідэю, якую праз яго праводзіць пісьменьнік.

Рэцэнзуемы нарыс В. Сташэўскага «Гаворыць Асінстан імя Сталіна», у сэнсе здавальненьня масавага чытача, у сэнсе пер дачы малюнку рачаіснасьці, у сэнсе самой яркасьці перадачы заслугоўвае асаблівай увагі.

Не патрэбна быць на Асінстане, не патрэбна бачыць у пяць тысяч гэктараў плошчу Асінаўскіх балот, не патрэбна бачыць агромністых корпусоў электрастанцыі, карпусоў рабочых пасёлкаў—усё гэта можна ўявіць сабе, прачытаўшы нарыс «Гаворыць Асінстан імя Сталіна».

Нарыс напісаны па-майстэрску. Аўтар схапіў з свайго об'екту ўсе характэрныя рысы, характэрныя кусочкі, з якіх атрымоўваецца цэлы выпуклы малюнак.

Аўтар спачатку знаёміць чытача, як «пад бальшавіцкі марш пролетарскія атрады вышлі на будаўніцтва першае Беларускае электрастанцыі». Адчуваецца, як гэтыя «пролетарскія атрады», аддаваныя савецкай уладзе спэцыялісты з бальшавіцкай энэргіяй бяруць у палон адвечную пустэчу-балота. Адчуваецца шум машын, стук малатоў, звон лапат, нібы відаць узмах тысячы рабочых рук.

Аўтар паказвае, як, з каго арганізоўваўся той рабочы колектыў, кім ён кіраваўся, што за кароткі час узьняў магутны Асінбуд, што ператварыў пустэчу-балота ў асяродак энэргіі прамысловасьці.

«З кожным днём прыбывае народ: землякопы, жалезабэтоншчыкі, каменшчыкі, маляры, вадаправодчыкі, ацяпленцы, тынкоўшчыкі, абмуроўшчыкі, кацельшчыкі, арматуршчыкі, электраманцёры і шэраг іншых кваліфікаваных рабочых. Інжынэры—кіраўнікі работамі».

«Усё гэта зьліваецца ў адзіную творчую сям'ю, з рук якой вырастае магутны Асінбуд. Цэмэнтам у гэтай сям'і зьяўляецца колектыў партыйцаў-комуністаў».

Аўтар добра ведае, што рост такіх Асінбудаў ёсьць вынік правільнага кіраўніцтва нашае партыі, ёсьць вынік адданай, энэргічнай працы тысяч рабочых. Гэта нам кажа самы характар апісаньня, гэта дае адчуваць нарыс цалкам.

Нарыс зьяўляецца цікавым і з боку пабудовы. Чытаючы яго, атрымліваеш уяўленьне ня толькі самой пабудовы Асінбуду, але ўяўляеш поўнасьцю і ўсе тыя крыніцы, усе тыя рэчанькі, дарожкі, сьцежачкі, якія ідуць з нутра ўсяе пролетарскай дзяржавы, па якіх рухаецца тая сіла, што складае вось такія Асінбуды. Адчуваеш, якая сіла ўліваецца ў нутро пролетарскае дзяржавы праз пабудову падобных Асінбудаў.

Адчуваеш, які агромністы ўплыў робяць Асінбуды на шпарчэйшы рост нашае прамысловасьці, на шпарчэйшы рост колгасаў, на навакольнае насельніцтва.

Пісьменьнік паказвае, як працоўнае сялянства з вялікай радасьцю сустракае пабудовы Асінбудаў, з радасьцю і адвагай ідзе на яго выклік, на выклік комуністычнае партыі, якая кіруе ўсім будаўніцтвам краіны, якая шпаркім тэмпам вядзе працоўны народ па шляху да лепшай будучыны.

«Слухай, Асінстан!
І ты, таварыш Сталін,
Працоўнае сялянства
чуе голас твой,
Магутны голас
правадыра,
Яно пойдзе і далей за
табой,
не адстане!»

Побач з гэтым аўтар адзначае, што электрыфікацыя ў нашай краіне паляпшае жыцьцё ўсіх працоўных, тым часам як у капіталістычных краінах яна служыць для невялікай кучкі буржуа сродкам для прыгнечаньня працоўных, для большай эксплёатацыі іх.

Нарыс напісаны з пэўным узьнятым настроем, з пэўным патосам, з пэўнай эмоцыянальнай зарадкай, што перадаецца пры чытаньні і на чытача.

Патрэбна адзначыць, што шмат ажыўляе нарыс, робіць яго ярчэйшым, у сэнсе ўспрыняцьця—гэта мастацкае афармленьне, ілюстрацыі.

Ужо вокладка, якая сымболізуе сабой нешта магутнае, і ўступная старонка, з якой нібы прарываецца голас нашага будаўніцтва, прыкоўвае чытача, дае яму адпаведную зарадку, выклікае зацікаўленасьць. Таксама і ўсе здымкі. якімі досыць густа перасыпан нарыс, дапаўняюць чытачу агульнае ўражаньне.

Нарыс, бязумоўна, зацікавіць нашага масавага чытача. Ён будзе выклікаць творчае імкненьне да нашага будаўніцтва, ён будзе шырока знаёміць працоўных з нашым магутным дасягненьнем на фронце прамысловасьці краіны.

С. Куніцкі.

ХРОНІКА

БССР

У БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

● **Андрэй Александровіч** падрыхтаваў да друку І том твораў. У гэтым годзе споўніцца дзесяцігодзьдзе літаратурнай дзейнасьці. У ГІХЛ выходзіць кніга вершаў **Александровіча** ў расійскім перакладзе. У БДВ другім выданьнем выходзіць поэма „Цені на сонцы" і трэцім выданьнем зборнік вершаў „Угрунь".

● **Мікола Хведаровіч** працуе над поэмай „Ілжэколгас". У поэме паказваецца хваля колектывізацыі 1930 г.

● **Міхась Лынькоў** працуе над аповесьцю „Бацькаўшчына". У выданьні ГІХЛ выходзіць зборнік апавяданьняў **Лынькова** ў расійскім перакладзе.

● **Янка Ліманоўскі** піша вялікі роман „Стапнее сьнег".

● **Алесь Звонак** выдае ў выдавецтве „Маладая Гвардыя" зборнік вершаў у расійскім перакладзе.

● Вышла асобнай кніжкай аповесьць **Янкі Скрыгана** „Затока ў бурах". Таксама вышаў яго зборнік нарысаў „Шугае сонца".

● **Сьцяпан Ліхадзіеўскі** здаў у БДВ кніжку колгаснай поэзіі „Крывавыя зьнічкі на сьнезе" (сэрыя „Мастацкае слова—масам").

● **Сяргей Знаёмы** працуе над другой часткай вялікага нарысу „Каця Астаповіч".

● У выданьні БДВ вышла пьеса **Уладзімера Стэльмаха** „Шляхі".

● **Уладзімер Сядура** працуе над вялікім артыкулам „Пытаньні сучаснай поэзіі". Адначасна піша артыкул пра творчасьць **Платона Галавача**.

„УДАРНЫ ПОСТ"

● У БелАПП'е арганізавалася творчая брыгада „Ударны пост". У брыгаду ўвайшлі—Зьмітрок Астапенка, Платон Галавач, Аркадзь Куляшоў, Валеры Маракоў, Барыс Мікуліч, Юлі Таўбін, Станіслаў Шушкевіч.

Брыгадаю праведзены шэраг заняткаў, на якіх былі заслуханы творчыя справаздачы В. Маракова, Ю. Таўбіна, З. Астапенкі, А. Куляшова. У бліжэйшыя дні будуць заслуханы творчыя справаздачы іншых членаў „Ударнага посту".

Брыгада прымацавана да трох менскіх прадпрыемстваў („Комунар", „Эльвод" і Фармзавод).

Члены брыгады працуюць над наступнымі буйнымі рэчамі:

В. Маракоў здаў у друк аповесьць у прозе, працуе над поэмаю і здае ў БДВ зборнік выбраных вершаў.

П. Галавач—„Ён" (у романе падаецца тып падхаліма).

Б. Мікуліч—„Чорная Вірня" (аповесьць пра колектывізацыю і ўдзел у ёй 25-тысячнікаў).

Ю. Таўбін—„Таўрыда" (поэма пра перасяленьне яўрэяў на зямлю ў Крым).

А. Куляшоў—„Крыўда" (поэма пра імпэрыялістычную вайну).

С. Шушкевіч—здае ў друк кнігу вершаў „Паходні".

З. Астапенка і Ю. Таўбін пішуць аповесьць „Тры кругі".

● Да Дню Чырвонай арміі БелЛАЧАФ выдае літаратурна-мастацкі зборнік „13 год Чырвонай арміі" пад рэдакцыяй Бэндэ і Каленты. У зборніку ўдзельнічаюць М. Чарот, В. Сташэўскі, П. Броўка, Я. Бобрык, С. Ліхадзіеўскі, П. Галавач, С. Шушкевіч і шэраг маладых пачынаючых чырвонаармейскіх пісьменьнікаў.

● **Ізі Харык** (яўрэйская сэкцыя БелАПП) канчае вялікую поэму „Бесьперапынка". Працуе над п'есай для яўрэйскага дзяржаўнага тэатру Беларусі. ГІХЛ выдае зборнік вершаў і поэм **Ізі Харыка** ў расійскім перакладзе.

● **Юдэльсон** канчае поэму „Комбінат". Падрыхтаваў да друку зборнік вершаў.

● Пры Менскай філіі БелАПП створана сэкцыя нарысу. У яе ўвайшлі нарысысты—белаппаўцы і газэтныя работнікі. Сэкцыя налічвае каля 34 чалавек.

● Пры Менскай філіі БелАПП арганізоўваецца сэкцыя крытыкі і сэкцыя драматургічная.

● У БелАПП па Менскай філіі залічаны т.т. Стэльмах (малады драматург), Сядура (малады крытык) і Вольскі (публіцысты).

● Сэкратарыятам БелАПП за нацыянал-дэмократычную дзейнасьць выключан з БелАПП Юрка Гаўрук.

● За адрыў ад работы БелАПП, за сыстэматычныя п'янкі выключаны з БелАПП'у Хадыка і Шалай.

● Вылучаны рабочы сэкратарыят БелАПП ў які ўвайшлі: Ліманоўскі, Галавач, Барашка, Місьлінскі і Дунец.

● 1 сакавіка г.г. распачнецца пленум сэкратарыяту БелАПП. На парадку дню стаяць наступныя пытаньні: 1) палітычны даклад (прадстаўнік ЦК КП(б)Б), 2) справаздача праўленьня БелАПП (Ліманоўскі), 3) аб творчай дыскусіі (Бронштэйн, Гальпэрына), 4) творчы твар БелАПП (Бэндэ, Аляхновіч, Дунец).

● На сэкратарыяце БелАПП 21-I—31 г. заслухана справаздача Менскай філіі (т. Барашка). У філіі налічваецца 69 чалавек. У беларускай сэкцыі 40 чалавек; з іх поэтаў 19, прозаікаў 11, крытыкаў 8, драматургаў 2. Членаў КП(б)—12, членаў КСМ—6 і беспартыйных 22. Па яўрэйскай сэкцыі налічваецца 24 чалавекі; з іх поэтаў 7, прозаікаў 7, драматургаў 2 і крытыкаў 8. Членаў КП(б)Б—12, членаў КСМ—5 і беспартыйных 7. Па польскай сэкцыі налічваецца 3 поэты; з іх адзін член КП(б)Б, 1 член КСМ і 1 беспарт.

● Пры МАПП арганізована беларуская сэкцыя у якую ўвайшлі таварышы: Бандарына, М. Гольдбэрг, Прыбыткоўскі, Губарэвіч і Шукайла.

У ІНШЫХ АБ'ЯДНАННЯХ

● **Міхась Чарот** піша поэму пра соцыялістычнае будаўніцтва БССР. ГІХЛ выдала зборнік ягоных вершаў у расійскім перакладзе.

● **Васіль Сташэўскі** канчае аповесьць „Шуміць бярозка" з жыцьця дзяцей Заходняй Беларусі. Сташэўскім сабраны матэрыял для роману „Сымфонія Прыпяці", над якім будзе ён працаваць у 1932 г.

● Выдавецтвам „Фэдэрацыя" прыняты да друку новы роман **Паўлюка Шукайлы** „Сын павешанай" на тэму апошніх падзей у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Роман пабудован на дакумэнтальных дадзеных пра зьдзекі ў польскіх турмах і дае малюнак „нацыянальнай" політыкі Пілсудзкага.

● Створан мясцком пісьменьнікаў. На агульным сходзе пісьменьнікаў г. Менску 31-1—31 г. у мясцком абраны т.т. Барашка (старшыня), Даўгапольскі (сэкратар), Сташэўскі і кандыдатамі—Глебка і Ліхадзіеўскі

РСФСР

У РАСІЙСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

● Сэкратарыят РАПП сумесна з прадстаўнікамі УсеЦСПС заслухаў даклад т. Ільянкова аб становішчы і выніках першага этапу закліку рабочых ударнікаў у літаратуру. Адзначыўшы дадатныя бакі практыкі закліку, т. Ільянкоў паказаў і на шэраг недахопаў. Калі парторганізацыі аддалі патрэбную ўвагу закліку, то другія організацыі, ў тым ліку і УсеЦСПС, ігнаравалі яго. УсеЦСПС адмовіўся ад пасылкі сваіх прадстаўнікоў з брыгадамі РАПП і ГІХЛ, камандыраванымі для садзейнічаньня правядзеньню літаратурнага закліку на мясцох. РАПП яшчэ слаба кіруе работай па закліку ву ўдарнікаў у літаратуру. Неабходна паскорыць пытаньне пра чыстку шэрагаў РАПП, цравёўшы яго перад пленумам.

● 20 студзеня ў клюбе ФАСП адбылася філёзофская нарада РАПП. У спрэчках выступалі Гросман-Рошчын, Стаўскі, Сякерская і інш. Спрэчкі разгортваліся пад знакам рэзкай самакрытыкі. Выступаючы ў спрэчках, таварышы падкрэсьлівалі адставаньне тэоры ад практыкі ня толькі на філёзофскім фронце, але і на літаратурным. Як на вялікі недахоп філёзофскага крыла, некаторыя прамоўцы паказваюць на адсутнасьць масавасьці ў яго рабоце.

● У яўрэйскім клюбе „Комуніст" адбыўся вечар яўрэйскага пролетпоэта Беларусі т. Ізі Харыка. З дакладам пра творчасьць Харыка выступіў рэдактар яўрэйскай газэты „Дэр Эмэс" г. Літвакоў. Пасьля дакладу з вершамі выступіў т. Харык, якога аўдыторыя прыняла надзвычайна горача.

● На апошнім літаратурным вечары маладое „Кузьніцы" т. Кажэўнікаў чытаў урыўкі з новага роману „Магістраль", які малюе барацьбу за будаўніцтва Турксібу на апошнім вучастку. Таварышы, якія выказаліся ў спрэчках, адзначылі, што роман па-сапраўднаму ліквідуе адставаньне літаратуры ад жыцьця, адзначае шырыню і значэньне матэрыялу.

● У клюбе заводу „Красный Путиловец" адчыніўся пленум ЛАПП. Пленум аднагалосна пастанавіў хадайнічаць перад урадам аб узнагародзе тав. Фадзеева, як перадавога пролетпісьменьніка, былога чырвонага партызана і актыўнага ўдзельніка грамадзянскай вайны, ордэнам Чырвонага сьцягу.

● Літаратурная газэта" і выдавецтва „Фэдэрацыя" перад ад'ездам беларускіх пісьменьнікаў організавалі таварыскую стрэчу, у якой прынялі ўдзел расійскія, беларускія, украінскія пісьменьнікі і выдавецкія работнікі. У гутарцы былі падведзены вынікі беларускага тыдню і вынесен шэраг практычных прапаноў у справе наладжваньня сталай сувязі між літаратурамі народаў СССР.

● У час беларускага тыдню расійскія і беларускія пісьменьнікі-нарысысты дамовіліся аб выданьні сумеснага зборніку нарысаў ў 10 друкаваных аркушах на расійскай і беларускай мове. Пролетпісьменьнікі ставяць пытаньне аб дастасаваньні гэтага вопыту і ў другіх жанрах пролетлітаратуры.

● У сьнежні м-цы 1930 г. сэкратарыят ВОАПП прыняў пастанову аб выпуску часопісі ВОАПП — „Літаратура народаў Савецкага Саюзу". Між тым, праўленьне ГІХЛ, спасылаючыся на адсутнасьць паперы, паказала, што гэты часопіс, будзе выдавацца толькі з другой палавіны 1931 г. Аб'яднанае пасяджэньне сэкратарыятаў ВОАПП, РАПП і БелАПП прызнала неабходным выпуск гэтай часопісі з сакавіка г. г., зрабіўшы яго штомесячным. Адначасна сэкратарыят адзначыў немагчымасьць у справе затрымкі ГІХЛ выпуску часопісі ВОАПП.

● Заслухаўшы інформацыю т. т. Ліманоўскага, Галавача і Барашкі пра ход закліку рабочых ударнікаў у літаратуру на Беларусі, сэкратарыят ВОАПП прызнаў неабходным правесьці агляд закліку рабочых ударнікаў

у пролетлітаратуру. Сэкратарыят канстатаваў, што Беларускі цэнтральны савет профсаюзаў ігнаруе літаратурны заклік.

● З 1 студзеня 1931 г., апрача часопісі „На литературном посту" будзе выдавацца новая часопісь „РАПП". Часопіс „РАПП" зьявіцца новай часопісьсю марксысцка-ленінскай літаратурнай крытыкі і тэорыі і будзе выходзіць кожныя два месяцы. Яна будзе кіруючым тэорытычным органам масавага пролетарскага літаратурнага руху. У рэдколегію часопісі „РАПП" уваходзяць т. т.: Авэрбах, Афінагенаў, Гельфанд, Дынамаў, Ярмілаў, Серабранскі, Трошчанка і Фадзееў.

У рэдколегію-ж часопісу „На литературном посту" будуць уваходзіць т.т. Авэрбах, Ермілаў, Кіршон, Лібедзінскі, Панфераў, Селіванаўскі, Сутырын, Фадзееў і Шушканаў.

● Адбыўся вялікі творчы вечар вэнгерскага пролетарскага поэты Анатоля Гідаша. З дакладам пра творчасьць Гідаша выступіў тав. Анісімаў.

У поэта вэнгерскай рэволюцыі—Гідаша—многа агульнага з пролетарскімі поэтамі Захаду, асабліва з поэтамі Нямеччыны. Ягоная поэзія носіць характар політычны і масавы па форме: песьні і маршы, якія складаюць музыку пролетарскіх колён. Поэта імкнецца ахапіць гісторычны вопыт вэнгерскай рэволюцыі, і гэта ўсугубляе дзеяльнасьць ягоных маршаў. Зварочваючыся да шырокіх абагульненьняў, Гідаш захоўвае аголеную, бурную актыўнасьць свайго стылю. У такіх рэчах, як „Пад сьцягам Інтэрнацыяналу", Гідаш імкнецца даць малюнак клясавай барацьбы ў вялікім гісторычным маштабе. Прастата, яснасьць, дынамічнасьць—вось характэрныя рысы лірыкі Гідаша, рысы, якія робяць яго творы агітзнарадам вялічэзнай сілы. Ад песьні і маршу, захоўваючы масавы актыўны характар цоэзіі, творчасьць Гідаша разьвіваецца ў вялікія гісторычныя палотны.

● А. Гідаш—інтэрнацыянален. Ён зьвязвае вэнгерскую рэволюцыю з расійскай і з усім рухам пролетарыяту. Вэнгерская рэволюцыя затоплена ў крыві. Пролетарыят прыціснут дыктатурай фашызму. Але Гідаш наскрозь оптымістычны. Ён гаворыць пра страшныя рэчы, ня страшачыся іх. Ён з колёсальнай энэргіяй змагаецца за новы рэволыцыйны ўздым.

Мы бачым,—гаворыць т. Анісімаў, — што поэт, які жыве ў СССР ужо 6 гадоў, цалкам захвачан барацьбой вэнгерскага пролетарыяту. „Там галава мая", формулюе ён сам. Дадзены пэрыод яго работы характарызуецца пільнай увагай поэты да нашай рачаіснасьці. Ён езьдзіў у Надзеждзінск і Донбас і рыхтуе пра іх творы,

● Маскоўская група „Кузницы", на чале якой стаяць Бахмецьцеў, Гладкоў і інш., заключыла з сэкратарыятам РАПП згоду пра ўваход гэтай групы „Кузницы" у РАПП. Група прымае назву „Московская творческая группа РАПП" „Кузница" і існуе ўнутры РАПП, як творчае аб'яднаньне, правадзячы чыстку сваіх шэрагаў пад кіраўніцтвам комісіі МАПП.

● На Электразаводзе адбылося пашыранае пасяджэньне сэкратарыяту МАПП з удзелам прадстаўнікоў райбюро МАПП і літгурткоўцаў пад старшынствам т. Кіршона. Заслуханы даклады пра работу літкружкоў Электразаводу і 1-й узорнай друкарні. Сэкратарыят МАПП адзначыў, што абодва гуркі яшчэ ня зусім адказваюць сучасным політычным задачам і не знайшлі правільных мэтодаў работы.

● А. Герман (Кузница) організаваў пры МАПП сэкцыю цыганскіх пісьменьнікаў, у сувязі з чым у МАПП перайшлі члены „Кузницы" цыганскія пісьменьнікі:Лебедзеў, Панкоў і Ром-Лебедзеў.

● Наркамасьветы склікае 2 лютага усерасійскую конфэрэнцыю па дзіцячай кнізе. Перад конфэрэнцыяй РАПП склікаў нараду маскоўскіх і ленінградзкіх дзіцячых пісьменьнікаў. Сэкратарыят РАПП вылучыў комісію для падрыхтоўкі і правядзеньня нарады ў складзе таварышоў: Караваевай, Грудзкай і Кажэўнікава.

ЛОКАФ

● Комуна поэтаў МАПП выпускае зборнік вершаў пра Чырвоную армію, які будзе выдадзен да гадавіны Чырвонай арміі.

● На 1 сакавіка склікаецца пашыраны пленум савету ЛОКАФ з наступным парадкам дня: 1) міжнароднае становішча і задачы абароны краіны (т. Гамарнік), 2) аб становішчы на літаратурным фронце (т. Авэрбах), 3) пра работу і задачы ЛОКАФ (Дзегцяроў і Матэ Залка), 4) пра літаратурную продукцыю ЛОКАФ (т. Сьвірын), садаклад—пра чырвонаармейскую творчасьць і заклік чырвонаармейцаў-ударнікаў у літаратуру (т. Мірын) і выбары ў кіраўнічыя органы ЛОКАФ.

● Ленінградзкае аддзяленьне ЛОКАФ наведалі генэральны сэкратар ЛОКАФ т. Матэ Залка і начальнік Аддзелу друку ПУР т. Рэйзін. Кіраўнікі аддзяленьня ЛОКАФ т. т. Сьвірын, Дзьмітрыева і Лібэрман, якія раней змыкаліся з „літфронтам", на апошнім пленуме ЛАПП адмежаваліся ад Гарбачова, Родава і інш. і далі цьвёрдае абяцаньне падтрымліваць лінію РАПП.

Ленаддзяленьне ЛОКАФ зьяўляецца моцнай організацыяй. Яно яднае літгрупы „Красная звезда" і „Балтфлот" 36 чырвонаармейскіх літгурткоў. Асноўным недахопам у яго дзейнасьці зьяўляецца слабое ўцягваньне ў работу ЛОКАФ.

У ІНШЫХ АБ'ЯДНАНЬНЯХ

● Пленум ЦС ВОКП пастанавіў перайменаваць ВОКП ва Ўсерасійскую організацыю пролетарска-колгасных пісьменьнікаў (ВОПКіІ).

● На заключным пасяджэньні пленуму абран новы сэкратарыят, у які ўвайшлі таварышы: Карпінскі, Канатчыкаў, Батрак, Кораней, Аляксееў, Ялісееў, Ізакаў, Жыга, Ягорашвілі, Дарагойчанка, Замойскі, Карпаў, Субоцін, Завалічаў, Корней, Гаргонаў, Врыкін, Мядзьведзеў, Міхайлаў, Равякін, Астрагорскі, прадстаўнікі РАПП і рабочых ударнікаў.

● Генэральным сэкратаром ВОПКП зацьверджан т. Батрак.

● У комітэт па стварэньню Ўсесаюзнага аб'яднаньня організацый пролетарска-колгасных пісьменьнікаў вылучаны: ад украінскіх пролетарска-сялянскіх пісьменьнікаў „Плуг" Піліпенка, Паніў, Фіхнер, ад ВОКП—Батрак, Багданаў, Ягорашвілі; ад беларускіх пісьменьнікаў — Галавач, Барашка, Баранавых. Адказным сэкратаром організацыйнай комісіі абраны т. Піліпенка.

● 23 студзеня ў Ленінградзе памёр гісторык, публіцыст і драматург І. Е. Шчогалеў.

● Агульны сход членаў ВСПС, які адбываецца раз у год, заслухаў політычную справаздачу праўленьня, зробленую тав. Паўленка, і даклады комісіі сэкцыі ВСПП пра іх работу за 1930 г. У праўленьне ВСПП выбраны т. т. Ляонаў, Огнеў, Лідзін, Паўленка, Скосыраў, Гольцаў, Інбер, Фадзееў, Мсьціслаўскі, Малышкін, Сьлётаў, Кірылаў, Селіванаўскі і Буданцаў. Кандыдаты — Астравер і Бальшакоў.

● На пасяджэньні новага праўленьняВСПП старшынёю праўленьня абраны Леанід Ляонаў. Намесьнікамі старшыні—Лідзін, Агнеў, Паўленка; сэкратаром—Скосыраў.

● І ІХл выпусьціла да дню прыняцьця ІХ зьездам комсамолу шэфства над чырвоным паветраным флётам зборнік „Большой восточный перелет" пад рэдакцыяй Алксніса, Кальцова і Сямашка з артыкуламі Алксніса, Унгаўніса, Сьпірына, Кальцова, Генгера і інш.

● Выходзіць з друку кніга выбраных пародый А. Архангельскага з шаржамі Кукрыніксаў і з прамовай Авэрбаха.

● ВОПКП выдае ўдарны літаратурна-мастацкі зборнік „Бальшавіцкая вясна" прысьвячаны вясновай сяўбовай кампаніі. У зборніку прымуць удзел Замойскі, Дарагойчанка Батрак, Карпаў і інш. У ім будуць зьмешчаны апавяданьні, вершы, частушкі, прысьвечаныя веснавой сяўбе.

УССР

● 28 студзеня споўнілася 4-х годзьдзе Ўсеўкраінскага саюзу пролетарскіх пісьменьнікаў („ВУСПП").

● Пры Ўсеўкраінскім саюзе пісьменьнікаў „Плуг" організавана літаратурная майстэрня для пачынаючых пісьменьнікаў. Год назад нямецкія пісьменьнікі Ўкраіны заснавалі сэкцыю пры „Плузе". Для правядзеньня літ. закліку ў нямецкія раёны Ўкраіны камандыраваны шэраг нямецкіх пісьменьнікаў.

● Культпроп ЦК КП(б)У прапанаваў усім гарадзкім і раённым партыйным комітэтам прамысловых цэнтраў УССР узмацніць кіраўніцтва заклікам ударнікаў у літаратуру і дапамагаць брыгадам ВУСПП—асноўнай організацыі, якая праводзіць заклік ударнікаў на Ўкраіне.

● Агульны сход членаў Украінскага літаратурнага аб'яднаньня „Нова генэрацыя" (Новае пакаленьне") пастанавіла лічыць організацыю распушчанай.

Вясною мінулага году Лефаўскай організацыяй „Нова Генэрацыя" была зроблена спроба ўліцца ў ВУСПП, але „Нова генэрацыя", жадаючы ўступіць у ВУСПП, адначасова крытыкавала літаратурна-політычную лінію саюзу пролетарскіх пісьменьнікаў і не адмаўлялася ад сваіх лефаўскіх установак. Падоўная двурушніцкая позыцыя „Новай генэрацыі" яшчэ больш адмежавала яе ад ВУСПП і сьведчыць аб тым, што „Нова генэрацыя" пачынае станавіцца рупарам дробнага буржуа. Апошнія нумары часопісі „Нова генэрацыя" зьявіліся антыпартыйнымі документамі.

У апублікаванай у друку дэкларацыі пра роспуск „Новай генэрацыі" чоткага прызнаньня памылак няма. Роспуск мотывуецца тым, што, не атрымліваючы пролетарскага папаўненьня, організацыя павінна была-б ператварыцца ў замкнутую інтэлігенцкую групоўку, стаць рупарам клясава-варожых сіл.

● У Харкаве адбылася нарада рэдакцый органаў ФАСП УССР і РСФСР—украінскай і маскоўскай „Літаратурных газэт". У нарадзе ўдзельнічалі прадстаўнікі ўкраінскай „Літгазэты" т.т. **Рачыцкі, Мікітэнка** і **Лысовы** і прадстаўнікі расійскай „Літгазэты" таварышы Селіванаўскі і Рэст.

Нарада вызначыла шэраг мерапрыемстваў па замацаваньню сувязі „Літаратурных газэт", у прыватнасьці—сыстэматычны памен вопытам масавай работы, матэрыялам, сумеснае правядзеньне шэрагу кампаній і інш.

● На апошнім пасяджэньні црэзыдыуму ЛОКАФ быў заслухан даклад Дзегцярова пра работу пашыранага пленуму Ўсеукраінскага ЛОКАФ. Усеукраінскі ЛОКАФ прыступіў да выданьня часопісі „Чырвоны баец" і шэрагу альманахаў. У рабоце Ўсеукраінскага ЛОКАФ ня ўдзельнічаюць грамадзянскія пісьменьнікі Украіны. Ні ВУСП, ні „Молодняк", ні „Пролітфронт" ня прыцягнуты да работы ў ЛОКАФ.

● Сэктар творчасьці народаў СССР ГІХЛ выпускае з друку кнігу апавяданьняў **М. Хвілёвага** „Жыцьцё".

● Здадзены ў друк пераклады твораў украінскіх пісьменьнікаў: Мікітэнка „Вуркаганы"—зборнік апавяданьняў з быту бяспрытульных, Рачыцкі—„Шаўчэнка ў сьвятле эпохі"—крытычны нарыс, і на тэму пра хлебазагатоўчую кампанію і колектывізацыю

на Украіне ў 1928-29 г. роман Якавенка „Тры элемэнты", Іван Лероман „Міжгор'е" — пра соцбудаўніцтва ў Туркестане.

● Рыхтуецца да друку зборнік выбраных вершаў **П. Тычыны** ў расійскім перакладзе.

ЗА МЕЖАМІ СССР

● Рабочы клюб імя **Джона Рыда** ў Нью-Ёрку зьвярнуўся да амэрыканскіх пісьменьнікаў, заклікаючы іх уступіць у шэрагі комуністычнай партыі. Адным з першых адгукнуўся вядомы раманіст **Тэодор Драйзэр**. Комуністычная партыя, па словах Драйзэра, зьяўляецца адзінай партыяй у сьвеце, якая сапраўды імкнецца да зьнішчэньня капіталізму.

● У Амэрыцы ў бліжэйшыя дні выходзіць новы роман **Эптона Сінкляра** „Рымскае сьвята", пабудованы на супастаўленьні сучаснага амэрыканскага і рымскага грамадзкага ладу эпохі заняпаду.

● **Гуго Геэллерт**, амэрыканскі мастак, рыхтуе да друку зборнік ілюстрацый да „Капіталу" Карла Маркса. У зборнік увойдзе 100 літографій.

● „Фабрыка Рабле" **М. Чумандрына** і „Лесазавод" **А. Караваевай** перакладзены на нямецкую мову. Роман „Братья" **К. Федина** перакладзены на ангельскую мову.

● Вэнгерскі ўрад забараніў кнігу „1902 год", вядомы вайсковы роман нямецкага пісьменьніка **Эрнста Глезера**. Супроць **Глезера** распачата судовае праслэдваньне. Рэволюцыйныя пісьменьнікі Францыі, Нямеччыны і Злучаных Штатаў протэстуюць супроць гэтага праслэдваньня на **Эрнста Глезера**, выкліканага галоўным чынам стараньнем вэнгерскіх царкоўных колаў.

● Пасьля забароны гаміданаўскай уладай таварыства „Чуан-зоо" і самавольнага роспуску таварыства „Сонца", таварыства „Мы" і іншых левых літаратурных організацый „Блёк левых пісьменьнікаў", скончыўшы сваю падрыхтоўчую работу вясной 1930 г., абвясьціў аб сваім існаваньні. Гэта адзіная левая літаратурная організацыя сучасных рэволюцыйна-настроеных пісьменьнікаў Кітаю.

Выдаюцца часопісі „Та-Джун-вен-и", „Чжэфан-чжэ", „Нань-Го-Юэ" і інш., якія носяць выразна левы кірунак.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

АДДЗЕЛ ПАДПІСНЫХ І ПЭРЫОДЫЧНЫХ ВЫДАНЬНЯЎ

Менск, Савецкая, 79. *Тэлефон № 17-12*

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1931

НА ПЭРЫОДЫЧНЫЯ ВЫДАНЬНІ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ, ЧЫТАЙЦЕ, РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ

„КОМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ“

12 КНІГ ВЫХОДЗЯЦЬ У ГОД

часопісь пэдагогічнай, мэтодычнай і палітычнай асьветы

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год		На 6 м.		На 3 м.		КОШТ АСОБН. НУМАРУ
Руб	Кап.	Руб	Кап.	Руб	Кап.	
8	—	4	50	2	30	80 К.

„МАЛАДНЯК“

12 КНІГ ВЫХОДЗЯЦЬ У ГОД

літаратурна-мастацкая і грамадзка-палітычная часопісь. Орган Беларускай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год		На 6 м.		На 3 м.		КОШТ АСОБН. НУМАРУ
Руб.	Кап.	Руб.	Кап	Руб.	Кап	
5	—	3	—	1	50	50 К.

„ПОЛЫМЯ“

12 КНІГ ВЫХОДЗЯЦЬ У ГОД

часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год		На 6 м.		На 3 м.		КОШТ АСОБН. НУМАРУ
Руб.	Кап.	Руб.	Кап.	Руб.	Кап.	
10	—	5	50	3	—	1 р.

„УЗВЫШША“

12 КНІГ ВЫХОДЗЯЦЬ У ГОД

часопісь літаратуры, мастацтва, крытыкі. Орган літаратурна-мастацкага згуртаваньня „Узвышша“.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год		На 6 м.		На 3 м.		КОШТ АСОБН. НУМАРУ
Руб	Кап.	Руб.	Кап	Руб.	Кап.	
6	—	3	50	2	30	80 К.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ“

24 НУМАРЫ ВЫХОДЗЯЦЬ У ГОД

ілюстраваная двухтыднёвая часопісь. Часопісь „Чырвоная Беларусь“ высьвятляе праз мастацкае слова і ілюстрацыі рост і разьвіцьцё соцыялістычнага будаўніцтва БССР і ўсяго СССР.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год		На 6 м.		На 3 м.		КОШТ АСОБН. НУМАРУ
Руб.	Кап	Руб.	Кап.	Руб.	Кап.	
3	—	1	50	—	75	15 К.

ПАДПІСАЦЦА МОЖНА: у аддзеле падпісных і пэрыодычных выданьняў БДВ (Менск, Савецкая, 79, тэл. 17-12); у Цэнтральнай кнігарні БДВ (Менск, рог Ленінскай і Савецкай); ва ўсіх гарадзкіх аддзяленьнях БДВ; у аддзеле падпіскі пэрыодсэктару ГІЗ'у РСФСР (Менск, Савецкая, 54); ва ўсіх паштова-тэл. канторах і ва ўсіх кніжных крамах спажывецкіх таварыстваў Белкоопсаюзу.